Беларуская газэта
Naša Niva

НАША НІВА

№7
1992

Чацьвертая нацыя...
Гутарка з Л.Луцкевічам. с.14

Не пакідайце ж мовы нашай, францускай!.. с. 10

А.СЫС
Вершы с.5

Ш.АНДЭРСАН
амэрыканская навэля с.13

Асабістыя рэчы К.Каліноўскага
Ня толькі ідэалы застаюцца пасьля герояў... с. 2

ГАРАСКОП БЕЛАРУСІ с.12

Усё добра. Усё занадта добра, каб не прыходзілі думкі пра сьмерць. Настаў час, калі зусім не адчуваецца будучыня, калі мінуўшчына гатовая шчыра адказаць на любое самае таемнае пытаньне, калі цяпершчына аж ільсьніцца ад таго, што ўсё так добра. Чым заслужаны гэты посьпех? Адчуваньне таго, што ён незаслужаны, — гэта апошні ўсхліп інстынкту самазахаваньня. Усё настолькі добра, што гэты інстынкт гатовы канчаткова заглохнуць. Так добра можа быць толькі перад канцом сьвету.



Здымак Алены Адамчык.

ДРАБНІЦЫ

КАРОТКІ КУРС ГІСТОРЫІ ГЛУПСТВА

Алег Аблажэй



* Што больш зьмяняе навакольны сьвет — розум ці глупства?
* Дзяржаўнасьць беларускай мовы — я крылы ў куры: нібыта й ёсьць, ды не ўзьляціш высока...
* Брунатны... пушка... варункі... стасункі... пігулкі... мажліва... філіжанка... бракуе... Пся крэў! Выстарчыць!
* "Польскасьць" віленскіх палякаў — як месца, памазанае зялёнкай: яна ўелася ў скуру й ня змыеш; але, калі не аднаўляць, сыхдзіць сама па сабе...
* Каб быць немцам ці французам, дастаткова ім нарадзіцца, каб быць беларусам, трэба ім стаць.
* Горад адрозьніваецца ад мурашніка тым, што там — усе свае, а ў горадзе — усе чужыя...
* Ці можа быць добры чалавек, які ўпэўнены, што ён — добры?
* Каханьне — самы гуманны від эгаізму.
* Узрост: яшчэ не разумны, але ўжо не малады.
* У размовах са знакамітасьцямі ня трэба баяцца, што выдасі сьціпласьць свайго інтэлекту — яны слухаюць толькі сябе!
* Для спартоўцаў характэрны мускульна-кішэчны выраз твару.
* У барацьбе за вызваленьне чалавецтва найбольш цяжка змагацца з самімі вызваляльнікамі.
* Калі больш баліць — калі пра цябе кажуць балючую няпраўду, ці калі — балючую праўду?
* Цынізм — гэта рамантызм на пэньсіі.
* Страшны суд не паперадзе нас. Ён ужо адбыўся. І кожны асуджаны на свой лёс.
* Ці ёсьць хоць што-небудзь там, дзе нічога няма?!.
* У цягніках часам здаецца, што правадніцам тоўстыя жываты выдаюцца разам з уніформай...
* Сьціпласьць урыгожвае чалавека. Асабліва сьціплая адзежына з валютнае крамы.
* Малюнак каштоўны ня тым часам, што затрачаны на ягонае выкананьне, а тым, на працягу якога хочацца яго разглядаць.
* Талент — як чупрына; або яна ёсьць, або яе няма — а парык ужо зусім іншая справа...
* Самапрыніжэньне — срытая патрэбнасьць у пахвальбе.
* Важна ня тое, колькі ты ўкладваў у свой твор, а колькі зьмясьцілася.
* У наш час немагчыма стварыць такое мастацтва, якое б не садабалася нікому. Нават, калі ня будзеш рабіць нічога, знойдуцца тыя, хто скажа: А ў гэтым нешта ёсьць!
* Пачатак кар'еры мастака ці паэта — калі ў галаве больш, чым у кашальку.
* Настае пара, калі модна быць нямодным.
* Што можа быць больш гідкае за афіцыйны рамантызм!
* Эпігонскія працы выклікаюць такі эфэкт — як бы йдзеш па вуліцы й раптам бачыш дарагога табе сябра, цешысься ад сустрэчы, падбягаеш... а гэта зусім іншы чалавек, хоць і падобны... І чым большае падабенства — тым большае расчараваньне.
* Мастак у такім жа даўгу перад народам, як і народ — перад мастаком.
* Нішто так ня скоўвае фантазію, як поўная свабода!
* Авангард — гэта дыктатура мастацкага пралетарыяту.
* Маркс падобны да амялы — і зьнешне, і па сутнасьці.
* Рэалізм — досыць цьмянае паняцьце; бо нават Грунвальд Матэйкі мае ня большыя адносіны да рэальнасьці, чым працы Каньдзінскага...
* Дзьве вяршыні авангарду і камунізму — экскрэмэнты мастака, выстаўленыя аўтарам у галерэі Тэйт, і труп у шкляной скрыні, выстаўлены ў маўзалеі.
* Які цікавы й багаты быў бы Музэй Глупства!
* Я — гэта я! Усяго толькі я...
* Чытаць кнігі афарызмаў — усё роўна што есьці дрожджы лыжкаю...
* Я ўчарашне-заўтрашні чалавек!

Ня толькі ідэалы застаюцца пасьля герояў...

Асабістыя рэчы К.Каліноўскага

Язэп Янушкевіч

Яго схапілі ў ноч на 29 студзеня 1864 г. ў гімназічным будынку пры Замкавай вуліцы, у кватэры чыноўніка Віленскай казённай палаты Канстантына Жаброўскага.

Роўна чатыры месяцы перад тым, 29 верасьня 1863 году, цёзка Каліноўскага атрымаў гэтую кватэру ў якасьці платы «за прыватныя заняткі пры канцылярыі Віленскай дырэкцыі вучэльняў». У бюджэце апошняй залатоўкі, пэўна, перавяліся, і яна расплочвалася гімназічнымі кватэрамі; шмат іх запуставала ад пачатку паўстаньня.

Жаброўскаму кватэра ня рупіла (у вадрозьненьне ад чыноўнікаў нашае эпохі). З жонкай ды чатырохгадовай дачушкай Канстантын выгодна жыў у тым самым гімназічным будынку разам зь цесьцем Фэліксам Вейсам, настаўнікам маляваньня тамтэйшай навучальнай установы. А можа, і ня так выгодна. Вядома толькі, што ў сваю чаргу Жаброўскі, атрымаўшы жыльлё, расклеіў на віленскіх платох абвестку пра здачу гэтай кватэры.

Не мінула й двух тыдняў, гэта значыць, у сярэдзіне кастрычніка да яго заявіўся на агледзіны русявы, моцнага складу дзяцюк. Патаргаваўшыся крыху, яны сыйшліся ў цане. Як і належыць, будучы кватарант адразу заплаціў наперад. Толькі штосьці шмат: 30 рублёў. Гэтага хапала на паўгодзьдзе.

Хто мог ведаць, што кватарант дабудзе тут усяго палову аплочанага тэрміну?

Дзе ён жыў дагэтуль, Жаброўскі ня ведаў, а навасёлец трапіўся скупы на слова. Назваўся Вітажэнцам. Характар заняткаў — распрацоўка матэрыялаў гістарычнага характару славянскіх народнасьцяў.

Кватэра ў Жаброўскага была невялікая: два пакойчыкі й цесная вітальня. Але як на аднаго халасьцяка, дык нямала. На трэці дзень пасьля агледзінаў Вітажэнец засяліўся; прыйшоў зь невялікім партфэлем у вадной руцэ. Голыя сьцены трэба было нечым мэбляваць. І ці ня ўсьлед за Вітажэнцам зьявілася маладая паненка. Яна зараз жа накіравалася да пані Длускай, што жыла ў тым самым будынку, нібы да блізкай прыяцелькі й дамовілася пра мэблю. Выйшаўшы, маладзіца зьвярнулася да гімназічнага дворніка Ігната Шоціка, каб той дапамог ёй перанесьці прыдбаныя рэчы. Для каго? Вітажэнец — яе брат.

Раніцою Вітажэнец некуды пайшоў, пакінуўшы ключ дворніку й наказаўшы, каб пусьціў да яго ў кватэру, калі хтось прыйдзе. Сапраўды, неўзабаве зьявілася сястра, аднак заходзіць ня стала; пакінула Шоціку цёплую коўдру, каб перадаў брату. У наступную раніцу зноў прыйшла й аддала Шоціку дзьве шклянкі й два сподачкі.

Праз паўмесяца дворнік, які стаў прыслугоўваць Вітажэнцу за два срэбныя ў месяц, меў новыя турботы з мэбляю кватаранта. Давялося вяртаць яе спадарыні Длускай, якая, пэўна, запатрабавала яе назад, а Вітажэнцу жыды прынесьлі іншую.

Больш пярэбараў не было. Таму можна канстатаваць: рэчы, выстаўленыя на адзін зь віленскіх аўкцыёнаў 16 ліпеня 1864 г., пасьля страты іх апошняга гаспадара — рэчы Каліноўскага. З новых іх гаспадароў, пералічаных у аўкцыйным лістку, найбольш не пашанцавала Іцку Слабодкіну. Набыты ім васьмікутны ясеневы стол на адной ножцы так і не дастаўся яму. Паліцыя забрала каштоўную рэч у сьледчае аддзяленьне, высьветліўшы, што адзіная стальная нага выдлубаная і што ў ёй Вітажэнец захоўваў дакумэнты. Шпікі, на вялікі іх сорам, унюхалі пра гэта запозьнена. Іх і тут апярэдзіла Вітажэнцава "сястра" — Караліна Яцына. Рызыкуючы, яна (пасьля начнога вобыску!) вынесла паперы з тайніка. Жандарам даруецца: у тую ноч ім трапілася штось найважнейшае: сам дыктатар Літвы й Беларусі. А пэндзная маёмасьць (іншае слова ім было не падабраць) палітычнага злачынцы Каліноўскага папоўніла царскую казну ўсяго на 20 рублёў.

Аукционный лист.
Конфискованных вещей, принадлежавших политическому преступнику Калиновскому,
проданных с Публичного торга 16 июля 1864 г.

№	Название вещей	Колич.	Оценка вещей руб.	коп.	Продажа р.с.	к.с.	За кем осталось на Аукционе
1.	Комод ольховый темною краскою выкрашенный о 4-х ящиках с 4-мя замками и одним ключем.	1	2	50	2	60	Еврей Абрам Фергимер
2.	Кровать простого дерева высланная досками.	1	-	50	-	75	Еврей Ицко Слободский
3.	Диван ясеновый соломою набит покрывало вовсе испорченное.	1	1	-	1	25	Еврей Абрам Фергимер
4.	Стол ясеновый 8-и угольный на одном столбу но вовсе испорчен.	1	1	-	2	-	Еврей Ицко Слободский
5.	Столик ольховый с одним ящиком крашенный желтою краской	1	-	70	1	-	Еврей Мовша Сер.
6.	Столик об одной ноге с круглой шашечной доской под Красное дерево.	1	-	30	1	2	Дворянин Романовский
7.	Графин хрустального стекла.	1	-	15	-	50	Еврей Ицко Слободский
8.	Стульев ольховых плетеных.	6	3	-	4	51	Еврей Берка Хацкилес
9.	Кресло под орех покрашенное с подушкою покрытой ситцем старым.	1	-	60	1	51	Дворянин Романовский
10.	Стульев под Красное дерево сделанных с подушками покрытыми ситцем пестрым старым.	4	4	-	6	20	Еврей Шлома Крмик.
11.	Стаканов к чаю.	2	-	15	-	39	Подноруч. Шишков
12.	Блюдечек фарфорных небольших	2	-	3	-	7	Подноруч. Шишков
13.	Ложечка чайная Варшавского серебра.	1	-	3	-	7	Унтер-офицер Вильжинский
14.	Зеркало складное в деревянной рамке.	1	-	15	-	42	Подноруч. Шишков
15.	Кувшин фаянса белого.	1	-	5	-	20	Подноруч. Шишков
16.	Печать Гербовая.	1	-	5			Представлена в Палату
17.	Бумажный ящик с деревянными шахматами которых 32 штуки.	1	-	15	-	30	Еврей Мовша Сер.
18.	Стеклянный пузырок с чернилом	1	-	3	-	5	Дворянин Кошановский
	итого	-	14	39	22	84	

ЦДГА Летувы ф. 525. воп. 15 Адз. зах. 744

Виленской палаты государственных имуществ
дело о принятии в ведение казны конфискованного
движимого имущества Калиновского.

Началось 11 июня 1864 года Кончилось 14 мая 1869 года На 19 листах.

В виленскую Палату Государственных Имуществ.
Чиновника Особых Поручений Аноева
Рапорт.

Представляя при сем опись конфискованного имущества, принадлежавшего казненному политическому преступнику Калиновскому, честь имею донести, что по принятии мною имущества в казенное ведомство, все означенные в описи вещи оставлены на сохранение Комиссару зданий Виленской гимназии г. Станкевичу; но как другого помещения для сохранения имущества не имеется, то предписать мне произвести продажу всего означенного имущества с аукционного торга.

Чиновник Особых Поручений Аноев.

№ 62 Июня 9 дня 1864 г. [Исполн. 25 июня 1864 года. № 13071]

При продаже находился полицейский пристав Вто.
Свидетелем был Подноручик Шишков.
Свидетелем был Комиссар Зданий Гимназии Станкевич.
Аукцион производил чиновник особых поручений Аноев.

В Виленскую Палату Государственных имуществ.
Чиновника особых поручений Аноева.
Рапорт.

Согласно предписания Палаты от 25 июня за № 13071, конфискованные вещи принадлежащия преступнику Калиновскому, проданы мною с аукционного торга; из числа тех вещей, осьми угольный стол ясеневого дерева, купленный евреем Ицкою Слободским за 2 р.с., взят у него в следственную Доминиканскую коммиссию, в следствие чего еврею Слободскому, выдано мною из собственных моих денег 2 р. Представляя при сем росписку еврея Слободского, имею честь покорнейше просить Палату государственных имуществ

СЕМ ДЗЁН АДНАГО СТАГОДЗЬДЗЯ

Алесь Чобат

1. Калядная гутарка 1860 году

— Шляхта бунтуецца, сон адымае
ўладам, бацькам і каханаму краю,
цяжка ёй, бачыце, жыць —
пэўна, ня хоча рабіць!
Мала ім, сукам,
маёнткаў з фальваркамі,
польскімі хочуць зрабіць нас
падшпаркамі,
досыць ужо гэтых спраў —
цар нам зямлю абяцаў!

— Добра ты кажаш!
От, панскія гадзіны,
каб яны войска сюды не ўправадзілі,
сумна ім, бачыце, жыць —
рэзаць іх, рваць іх, паліць!
Так, браце, гэта ня цар нас абдзельвае,
а распладзілася паньства суцэльнае —
хопіць людзей рабаваць,
так іх сабачую маць!

— Праўда, брат Грышка! Ад ласкі ад царскае,
можа, адломіцца й нам дабро панскае,
будзем па-брацку дзяліць —
кожнага трэба любіць!
А на пісулькі іх з ласымі смакамі
ёсьць у начальства жандары з казакамі —
зьведаюць, як бунтаваць,
так іх сабачую маць!

— Эх, браце Саўка! У сьмерці ўсе роўныя,
ды пры жыцьці адны людзі працоўныя,
а вось другія паны,
гіцлі, сабачы сыны!
Наша мужыцкая доля, сялянская,
а ўся Айчына іх — польская, панская...
Што нам тут, век прападаць,
так іх сабачую маць?!

2. 1863 год. Разьвітаньне з Радзімай...

Тут шлях адзін у выдуманы рай
дае сваім жаўнерам гэты край —
на сьнезе запяклася кроў, як хустка,

і мрояцца ў прабітай галаве
ўсе маскі мёртвыя і тыя, хто жыве,
а холад, сьлёзы, цемра, час і пустка,

як павукі, снуюць паволі ніць;
бяздушшам, страхам, здрадаю сьмярдзіць,
і ўсё, чым жыў, дарэмна прападае —

і толькі ў небе ёсьць дачка і ты,
спакойны хутар, бераг залаты,
Айчына вечная, свабода маладая...

3. Выбраныя сцэны 1866 году з губэрнскага места Горадні

Сумны пануры дзень
пад Фарным Касьцёлам.
Пяхотныя ахвіцэры, жыды, урадоўцы.
Поп Мікалай трасе пальцам
на пана Малахоўскага:
ска-азана ў Пісаньні!
павязуць усіх палячышак на Сібір
пры цары Іосіфе,
начыста вытрухнуць каталіцкае семя...

А пад жыдоўскаю крамай
пані Малахоўская
сон апавядае пані Дэмбіцкай:
конец сьвята юж бэньдзе,
прыйдзе немец плюгавы,
прозьвішчам Гітцэль,
але ўратуе Пан Бог людзей пабожных,
адных жыдоў вымяце жах
зь места сэймовэго...

А Леон Ройзман бядуе ў краме:
сын ужо не габрэй,
змарнаваў грошы на пашпарт —
стаўся Аляксандар Львовіч Раманаў,
манархісты расейскі...
А чуў, Шмуцусь, што кажа рабін?
У прышлым стагодзьдзі
на габрэйскіх могілках
ляжа роўнае поле, званае стадыёнам,
дзе голыя прывіды
бычы пузыр будуць біць нагамі,
разам зь Леона тлёнам...

Тым часам на далоні паручніка Іванова
цыганка лёсы чытае:
сто гадоў царква прастаіць,
дзе паручнік браў шлюб
з Надзін, маладой і прыгожай,
а якую царкву
мужыкі ды паны-недабіткі
Фарай Вітаўта клічуць упарта,
узьнясецца на неба...
і пылам каменным асядзе;
а на мейсцы тым новых сьвятых
на сьцяне-шэрадранцы павесяць —
а нядоўга й яны правісяць!!!
Сам зьбялелы, як сьмерць,
цягне шаблю паручнік...

Мужыкі ж па дарозе на Скідзель
плётку бабскую цягнуць,
як малітву да Бога:
кажуць, дзесьці ў Амэрыцы
шмат зямлі, а паноў не бывае,
чынш ня трэба плаціць...
Пасьміхаецца сумна пан Малахоўскі:
сам Касьцюшка прынес ёй свабоду,
Амэрыцы,
хам-мскае быдла,
а вярнуўся хоць генэралам,
ды шчэ горшай галотай.
Не кахаеце Польскі...

Сумна, страшна, панура.
Канца не відаць.

Неяк проста з гулянкі
стане дрэнна папу Мікалаю,



сделать зависящее распоряжение о возврате мне означенных 2 р. и представленной мною от продажи суммы рублей копеек.

Чиновник особых поручений Аноев.

№121 Августа 4 дня 1864 г.
[*Паметка:* Исполн. 3 октября № 20196, 20197]

1864 г. Августа 3 дня. Я нижеподписавшийся еврей Ицко Слободский, дал сию расписку в том, что заплоченные мною на аукционе два рубля, за осьмиугольный стол ясеневого дерева, мне возвращены, г. Чиновником Аноевым.

Ицко Слободкер.

Его Превосходительству Господину Виленскому коменданту Генерал-лейтенанту и разных орденов кавалеру Вяткину Виленского мещанина Ицко Шевеліовича Слободкера.
Прошение

17 [*трэба 16*] числа сего июля месяца производилась в Гимназическом здании аукционная продажа секвестрованных по политическим делам имуществ где и я купил круглый одноножный стол, у коего не было означенной ноги и на требования мое о возврате оной присудствующий тамо Чиновник Виленской палаты Государственных имуществ г. Аноев велел мне отправиться в Доминиканское здание для получения такового и по прибытии моем в оное здание г. тамошний смотритель задержав означенный стол мне не возвращает по неизвестной мне причине. Вчерашняго же числа я обратился с прошением к Г-ну управляющему Виленской палаты государственных имуществ прося о возврате мне означенного стола или 2 рубли мною заплоченные за него то г. Управляющий не принимая означенное мое прошение по причине неподачи таковое на установленной гербовой бумаге 70 коп. достоинства. А потому прибегая к защите и покровительство Вашего Превосходительства осмеливаюсь всепокорнейше просить обратить внимания на бедное мое положения предписать кому следует о возврате мне означенного стола или 2 руб. мною заплоченные ибо я человек бедный и те деньги составляют целого моего капитала. За таковое благодеяния я не промину молить Всевышняго Бога за здравия и долголетия Вашего Превосходительства. По личной просьбе неграмотного Еврея Ицки Слободкера росписую Дворанин Казимир Муравский.

Ицко Слободкер.

Июля дня 1864 года.

[На деле на сем же истребовать по жалобе сей надлежащее объяснение от смотрителя здания Доминиканов с изложением всего объяснения.]

Дзёньнік прыватнага чалавека

Ад Рэдакцыі

* * *

Кожны нумар *НН* мусіць адкрывацца прозай. Але прозы на Беларусі цяпер няма. Нешта дапісваюць заднім розумам раманісты, але гэта творы, задуманыя ў лепшы для прозы час. Былыя камсамольскія выданьні традыцыйна друкуюць масу апавядаў і вершаў, але ўсё гэта напісанае быццам адной (ці дзьвюма) рукамі, і таму колькасьць ніяк не перарастае ў якасьць. Прозы няма. Фармальна Беларусь сёньня — як ніколі незалежная краіна. І нацыянальнае адраджэньне ўжо пачынае расслайвацца, гатовае ператварыцца ў нацыянальную культуру. Мяняецца самы грунт культуры, зямля плыве пад нагамі. А прозе патрэбны трывалы грунт, каб нараджацца ці над ім, ці пад ім, ці ў ім, але заўсёды — адносна яго... За год існаваньня *НН* мы неяк абыходзіліся, друкуючы фрагмэнты — яшчэ ня прозы, але ўжо не бяз густу. Рэдакцыйныя тэчкі разбухлі ад тэкстаў, г.зн., у нас ёсьць з чаго выбіраць. Няма — што. Прозы на Беларусі цяпер няма...

* * *

Вільня. Без малога 200 км ад Менску. Бліжэй за самы блізкі абласны цэнтар — Магілёў. Яшчэ бліжэй духоўна. Першае слова паміж тапонімаў нацыянальнай культуры. Ніколі ў гісторыі Беларусі Вільня не была за мяжой. Сёньня на нашых вачох набіраюцца сілы два процілеглыя працэсы: страта Вільні (новыя бэтонныя КПП, візы, аплаты) і зразуменьне вартасьці гэтае страты (нацыянальнае адраджэньне). Інакш кажучы, калі да кожнага беларускага райцэнтра дойдзе сэнс слова «Вільня», сюды ўжо нельга будзе прыехаць проста так. Чым больш будзе хацецца, тым больш будзе нельга. Урэшце, дзьве скіраваньня адна супраць аднае сілы могуць набраць крытычную масу. Варта прадбачыць і такі вынік «памежнага будаўніцтва». Каму ўвогуле патрэбны гэты селікатны мур? Для людзей, нацыяў, дзяржаваў — Беларусі й Летувы — гэта адно страты. А выйграе хіба які-небудзь часовы палітык. Скалоціць сабе капіталец на чарговым «міжрэгіянальным канфлікце», і пойдзе на пэнсію...

* * *

6 ліпеня Летувіская Рэспубліка адзначае Дзень дзяржавы — дзень каранацыі ў Навагрудку літоўскага караля Мяндоўга. У гэты дзень я думаю пра пераемнасьць. Мне цікава, ці будзе ў новай Канстытуцыі Летувы пра тое, што ЛР ёсьць дзяржавай-пераемніцай ВКЛ? Мусіць, добра, каб было, і каб гэта было сэнсам палітыкі ЛР. Сапраўдная пераемнасьць ВКЛ азначала б шырыню дзяржаўнага погляду й поўнае пераадоленьне рэцыдываў нацыянал-ізаляцыянізму «маленькай дзяржавы». Хіба можна ўявіць сабе, каб ВКЛ імкнулася «ў ідэале» да адной мовы, адной канфэсіі, а ўрэшце — адной нацыі? Адзін ковенскі беларус мне так і сказаў — наша задача спакойна летуанізавацца. Я ўспомніў нядаўнія часы, калі для ўсяго савецкага народу дзяржаўнай мовай была абвешчаная расейская... Дзяржаўнасьць ВКЛ — гэта Вялікая Талеранцыя.

* * *

Існуе такая думка, што калі б Вільня ў свой час сталася сталіцай Беларусі, дык... Нават верш ёсьць:

Можа й добра, што Вільню забралі?
Бо каб нашай сталіцай была,
— У магілах бы храмы ляжалі
На пагосьце бэтону і шкла.

Але ў самой гэтай думцы закладзеная антытэза, магчыма, нават мацнейшая за самую тэзу: а ці не таму ў нас «храмы ляжаць у магілах», што «Вільню забралі»? Як бы глядзеў цывілізацыйна сьвет, як бы глядзелі тутэйшыя палякі і летувісы, як бы глядзела кіраўніцтва краінаў-прэтэндэнтак на дзейнасьць нашых герастратаў у такім горадзе? Ці не спынілася б тут іхняя рука? А калі тут — дык і па ўсёй Беларусі? А засталіся б храмы, гістарычнае асяродзьдзе, засталіся б нацыянальная годнасьць і мова... Словам, гісторыю назад не адматаеш, але падумаць ёсьць пра што.

С.

пражыве толькі тыдзень.
Сын сканае пад Вяткай —
застрэліцца пан Малахоўскі,
зубы сьціснуўшы,
пойдзе ўдава да прыслугі.
Леон Ройзман памрэ як габрэй —
сын усё праматае.
Службу скончыць паручнік
мерзлым мясам на Шыпцы крывавай.
Сумна, страшна, панура.
Канца не відаць.

4. 1976 год, Мінск. Цяпер Менск...

Над сталіцай саюзнай рэспублікі
ні хмаркі ў спакойным небе.
Лепшыя хлопцы зь мястэчак
спакойна едуць вучыцца.
Нашы савецкія танкі
спакойна стаяць на Эльбе.
А ў крамах стаяць спакойна
гарэлка, цукар, гарчыца.

А па-за сталіцай рэспублікі
калгаснае жыта красуе.
Няма авантуры аўганскай —
няма аўганскіх герояў.
Нідзе не відаць беларусаў —
ніхто іх не палянізуе.
Жывуць спакойныя людзі
бяз клопатаў і бяз мрояў.

5. Пастаралька на 27 ліпеня 1990 году

Поўныя боты апілак,
дулі ў пустых кішэнях.
Гразь, балота і сьмецьце —
сьлед белага чалавека.
Чыхае трактар савецкі
на лёс казённы ды шэры.
— Трэба трымацца разам, —
хворага вучыць калека.

Брэша сабака навязаны,
вольны хвастом віляе.
Галёкае менскае радыё,
Але кругом бюракратыя,
І ўсё ў галаве мяшаецца:
робіш толькі ды робіш —
а дзе яна, тая свабода?!
Памёр вось на днях начальнік,
а іх ніяк не зьмяншаецца...
Таму з глыбіняў народных
нясецца голас народу:

«Замок на сільпе павесілі,
работы — адна толькі відзімасьць.
Ніхто ні жалеет дзірэўню —
так эта і вам ні забудзецца...
Вот Дзімяньцей на сесіі
атваюет січас нізавісімасьць,
дак быстра сільпо аткроеце,
імперыялісты прыблудныя...»

Сонная здохлая хмара
ляніва лезе на вёску.
Карова ляніва лётае —
зь лёгкімі крыламі-марамі.
Бабы ляніва пляткуюць,
што ў беларускім войску
жаўнерыкі дземяньцееўскія
будуць жвавыя, што камарыкі...

6. Аповяд шатлянскай аўчаркі Боны пра свае канікулы ў вёсцы Біскупцы Лідзкага павету, калі здарылася рэвалюцыя 1991 году, а таксама падробка пад гаспадыню Боны Дануту Бічэль

Лёс у сабакаў сабачы.
Пуста ў людзей за душою.
Мы з гаспадыняй на дачы
марна шукаем спакою.

Зьнікла шляхэцкая мужнасьць.
Правіць савецкая раса.
Братніх народаў садружнасьць
зьела сабачае мяса.

Цэлае лета пацею,
нешта шукаю па кучах;
кажуць, канец Дземяньцею —
зьелі й яго разам з пучам!

Лесам ляціць да Ляжневіч
пах самагонкі, як птушка.
Менскам кіруе Шушкевіч —
вёскай кіруе чакушка.

Морду паклаўшы на лапы,
ціха драмлю да абеду,
кажуць вясковыя бабы,
што заваююць нас швэды.

Нос не высоўваю з дому —
гэта ў маіх інтарэсах:
шастаюць цёткі з райкому,
нібы ваўчыцы, па крэсах...

7. Сон перад незалежнасьцю

Будуць хлопцам мэдалі і шынкі, і кралі.
Кожнаму заплоціць Бог срэбрам і вінам.
Змагарамі пабылі. Гульні адгулялі.
А цяпер сядзяць і п'юць
за чужым сталом.
А свайго няма стала ды няма Айчыны.
І сьмяецца з хлопцаў тых
родны іх народ.
Вось і п'юць ды лёс клянуць
з гэткае прычыны.
Вось і страшаць белы сьвет
ўжо каторы год.
А народ іх не дурны —
моцных не чапляе.
А працуе на зямлі — хай і нічыёй.
Вось і скончыўся народ. І зямля ўмірае.
І ўздыхае Бог адзін вечнай цішынёй...

Анатоль Сыс

Вершы з кнігі «ЯГАМОСЬЦЬ»

САМОТНЫ

Маё шчасьце недзе заблукала...
цяжка ўспомніць — ноч была ці дзень —
як мяне самота адшукала,
падыйшла, ў чало пацалавала.
Бы жанчыну,
я абняў свой цень.
Цяжка ўспомніць — ноч была ці дзень —
я адчуў самоты асалоду,
хоць за рэчкай — шчасьце,
я — ля броду...
Не пайшоў. Спалохаўся за цень.
А самота ў вочы цалавала,
быццам парушынкі з воч вымала,
ды глядзець за рэчку не давала.

Так спазнаў яшчэ адну жанчыну.

Цяжка ўспомніць — дзень быў альбо ноч —
цяжка,
бо пазбавіўся я воч.
А сябры, прыгожыя каханкі,
позіркі — пякучыя маланкі,
хто зь віном, хто зь вершамі,
ішлі,
ды мяне ранейшым не знайшлі...
Я хаваў ад іх сьляпыя вочы,
налівалі, і я піў віно,
сам жа, як злачынца,
ўсёадно
я чакаў сваёй самотнай ночы.
Я зьмярцьвеў,
хоць чуў вакол прамовы
пра каханьне, Адраджэньне, мову,
тосты за Радзіму...
ўсёадно
за самоту піў сваё віно.

Так спазнаў яшчэ адну Радзіму,

цяжка ўспомніць — ноч была ці дзень —
бо здушыла горла, як камень,
мне віно, і верш мой занямеў.

Прыгажуні падстаўлялі вусны,
я ж у лоб нябожчыц цалаваў,
мне яны шапталі: «Парню грустно?..»
«Хлопцу сумна...» — я перакладаў.
А сябры, нібыта на пахмельле,
пакідалі вершыкі свае,
і, напэўна, кожны думаў:
зельле
ад мае самоты мне дае.
І тагды
я ўзьняў сьляпыя вочы,
каб яны жахнуліся бяльма,
беглі ад яго
у сьвет,
упрочкі,
бо ў вярыгах ісьціны няма.
І тагды
адбіткі сваіх бельмаў
я убачыў і на іх вачах.
«Парням грустно?..»
«Хлопцам сумна вельмі...» —
я хацеў сказаць, але ня змог,
бо чакала за сьпіной самота,
і гарлянку разьдзіраў камень,
бы жанчыну,
я абняў свой цень
і прыпаў да зваблівага роту,
і здушыў сваёй крывёй самоту...

Зьнікла ноч.
Ізноў вярнуўся дзень!

* * *

Лёс шляхі выбірае,
беражэ ці карае
і на ростанях вабіць,
асабліва жанчын.
Якой хочацца пекла?

Я
яшчэ
ня попел
і ня прысак
пакахай мяне
такім як ёсьць —
ў боскіх іскрах
ці ў шампанскіх
пырсках
Ягамосьць!



ШАРАЯ ГАДЗІНА

З нагоды 40-й гадавіны выхаду кнігі Хв. Ніцкі. Канспэкт дакладу.

Алег Мінкін

Бывае такі журботны час, калі вечар ужо скончыўся, а ноч яшчэ не надышла. Навакольле тады патанае ў няпэўным, хваробліва-шэрым сьвячэньні, у якім звыклы сьвет страчвае раптоўна свае фарбы й наўвоч ператвараецца ў зусім незнаёмы, непрытульны, канаючы нейкі сьвет, а душу міжволі агортвае неспакой і сполах перад нетрываласьцю таго, што дагэтуль здавалася трывалым і непарушным... Журботны гэты час, час кананьня перад насоўваньнем начнога змроку, называлі даўней шараю гадзінай.

«Шарая гадзіна» — назваў сваю першую й апошнюю кнігу, выдадзеную акурат сорак гадоў таму, знакаміты цяпер паэт Хведар Ніцка. Сёньня, калі наш край збавіўся ад паўкаляніяльнай залежнасьці ад магутнай суседняй дзяржавы, а заадно пазбыўся й шмат якіх праяваў яе культурнага ўплыву, уліўшыся ў садружнасьць іншых вольных краінаў кантынэнту, — высьвятляецца, што нашыя колішнія памкненьні да духоўнай і палітычнай незалежнасьці пачасту грунтаваліся на досыць павярхоўных ідэалах (мары пра лепшы дабрабыт, напрыклад). Пераняўшы разам зь безумоўнымі дасягненьнямі супольніцтва больш разьвітых грамадзтваў і ўсе іхнія хваробы, мы пачынаем усьведамляць, што так званы Прагрэс як зямная зьява — тупіковы шлях разьвіцьця чалавецтва, які вядзе да духоўнага выраджэньня. Горка прызнацца, але жыцьцё майго пакаленьня, апанаванага змаганьнем з таталітарызмам і шмат у чым эйфарычным імкненьнем да абстрактнай свабоды, усе нашыя надзеі на адраджэньне занядбанага краю, наша настальгія-туга па інакшых, лепшых часах — былі толькі апошнімі плямамі згасальнага сонца на вяршыні пагорка ў час, калі ўжо ўся суздром зямля ахутана няіснымі прысьмеркамі шарай гадзіны. Хведар Ніцка, паэзія якога ў свой час абвяшчалася ў лепшым разе "няўцямным нагрувашчваньнем містычных парываньняў і стылістычных выкрунтасаў", ці ня першы з нас адчуў набліжэньне нязнанай раней нявыкруткі сёньняшняга чалавечага йснаваньня. Больш таго — і гэта асабліва ўражвае — дакладна адлюстраваўшы той незайздросны духоўны тупік, у якім мы сёньня апынуліся, ён ужо тады пачаў шукаць выйсьце ў старадаўняй філязофскай традыцыі й практыцы краінаў Усходу, прадказаўшы тую панацэю, якая, ці не адна з усяго бясконцага арсэналу мэтадаў і шляхоў выратаваньня, спраўдзіла сябе.

«Ноша» або драма сэнсастраты

Героя «Ношы», першага разьдзелу кнігі Ніцкі, мы застаем ва ўскрай цяжкім, крытычным духоўным стане. Усе повязі са сьветам, якія зьнячэўку зрабіўся яму чужы, парушаныя, дый сам герой расплываецца на мноства супярэчлівых вершаваных матываў, якія нічога ўжо апрача пачуцьця прыгнечанасьці й стомы не выклікаюць. Падобна да таго, што герой «Ношы» робіць бязьлітасны разьвітальны агляд свайго жыцьця ў сьвеце, які не прыняў яго. Ён пільна ўглядаецца ў непрыстойна аголенае дно высахлага раптам існаваньня й пакутуе ад таго, што звыклыя чалавечыя адносіны ператварыліся для яго ў хваравітыя сутаргі "рыбы ў нераце", дзе ўсім бракуе паветра й кожны разьдзірае да крыві свае бакі аб вострыя плаўнікі суседа. Так герой балады «Адкрыцьці», прайшоўшы ўсе колы пакутаў каханьня, знаходзіць раптам ня партрэце ў ваблівчы здавалася б да болю знаёмага, каханага чалавека — "д'ябальскія рысы". Сьвет у гэтай цудоўнай балядзе паварочваецца да зьляканага падарожніка невядомым дагэтуль, злавесным тварам.

Матыў невыноснасьці й глухога мура неразуменьня перамяжоўваецца ў «Ношы» з матывам канчатковай адзіноты чалавека й роспачы перад тварам звыродлівага, бязглуздага сьвету, а тут яшчэ й за сьпінаю зеўрыць "...халодная бездань, якую ніколі Кволым цяпельцам істоты жывой не спатоліць". Нават зварот паэта да злабадзённых тэмаў (таталітарызм, адраджэньне нацыі й да т.п.) толькі ўзмацняе напал абсурдысцкага сьветаўспрыманьня, выклікае пачуцьцё разгубленасьці перад неспасьцігальнымі законамі сьветабудовы. Ніцка ня бачыць ніякае мэты ў існым, ня верыць, што чалавецтва рухаецца да нейкага больш дасканалага стану. Рэальна йснуе толькі плынь часу з камбінацыяй тых самых падзеяў — бессэнсоўная іх гульня. Здаецца, гісторыя й жыцьцё чалавека падпарадкаваныя нейкай абсалютнай інэрцыі й пад яе ўзьдзеяньнем усё на сьвеце вяртаецца да таго самага: вечнае гэтае вяртаньне Ніцка параўноўвае з паўтарэньнем выпадковых карцінак у калейдаскопе, якім кіруе калі й не варожая, дык абыякая да чалавека Рука. У вершы «Пята» усе, хто ацалеў пад гнётам пяты гісторыі, у зьбянтэжанасьці спытваюць адно ў аднога: "А раптам вернецца Пята І мы пачуем трэск хрыбта?" А зазірнуўшы ў "рассохлы куфар" чалавечай душы, Ніцка з горкасьцю заключае: "Апусьціце сьвінцовае века І замкніце нутро чалавека!"

Той самай напружанасьцю й бязвыйснасьцю пранізаныя й пэйзажныя замалёўкі «Ношы». На кожным кроку — парадаксальныя збліжэньні: "На тратуары бачу зяпу люка І дрэва чорнага абрыс бязрукі". Прырода ахутаная каламутным мярцьвяным сьвятлом, афарбоўка ўсіх бадай што твораў «Ношы» — манахромная, выкананая ў пахмурных фарбах шарай гадзіны. Інакш, відаць, і ня можа быць, калі ўсё навакольнае ўспрымаецца, як нешта сьляпое, жорсткае, чужое чалавеку.

Натуральны вынік занадта пільнага й працяглага ўгляданьня ў паточаны шашалем абсурду сьвет — спустошанасьць і ўнутраны холад, што насоўваюцца ўсьлед за празьмерным напружаньнем і стомаю. "Душа й калені да ільду прымерзьлі: Заўжды я вінен Пекнаце халоднай!" — канстатуе герой балады "Кай". І вось ужо мільгае першая здагадка, што й сама душа чалавека — гэтая выратавальная выспа ў зьменлівым акіяне абсурднага сьвету — таксама відма, мройныя выпарэньні таго самага акіяну.

«Мэтамарфозы» або драма адчужэньня

Страціўшы адчуваньне сябе самога, скінуўшы апошнюю ахоўную абалонку "самасьці", герой «Мэтамарфозаў» спрабуе ўцячы ў ілюзорную Пушчу ўяўленьняў. Ён гатовы зрабіцца ў гэтай Пушчы чым заўгодна, абы толькі не застацца сам-насам з той страшлівай terra incognita, што ў яго за сьпінаю, а дакладней, — у ім самім. Прычым увесь цымус другога разьдзелу «Шарай гадзіны» ў тым, што Ніцка падае ўцёкі ў міталягізаваную Пушчу, як спробу пазбавіцца ад невыцерпных пакутаў і балючых "чалавечых ісьцінаў". Зрабіўшыся дрэвам, герой «Мэтамарфозаў» нібы радуецца такому ператварэньню й патэтычна спытвае: "Чаму я здрадзіў гойнаму маўчаньню, Што безь мяне ўва мне заўжды жыло?" Аднак ужо праз страфу, зазірнуўшы ў цёмную бездань, на адхоне якой ён пусьціў карані, просіць, каб яму было дазволена вечна быць "калі ня лісьцем, дык хоць шумам лісьця".

І ўсё ж спакуса бездані мацнейшая за трываласьць каранёў. Драма сэнсастраты перарастае ў драму татальнай адчужанасьці ад сябе самога: "Думку, якая прайшла нараджэньне, я аддзіраю. Месіва слоў я выштурхваю прочкі, а не складаю".

«Цяга» або драма здабываньня

Бібліёграфы Ніцкі схіляюцца да думкі, што паэт у часе стварэньня «Шарай гадзіны» практыкаваўся ў якойсьці з усходніх мэдытацыяў. Я ня бачыў у ягонай бібліятэцы ніводнай з тых працаў па ўсходніх рэлігіях, аналёгіі зь якімі дасьледчыкі знаходзяць у вершах вялікага паэта. Але цяжка ўявіць, што духоўныя станы разьдзелу «Цяга» мог зафіксаваць чалавек, які не "пакаштаваў" іх. Ніцка параўноўвае іх і зь імклівым падзеньнем у цёмнае прадоньне ("Я варушу губамі, як быццам завадны, Але зь іх не зьлятае

кожнай хочацца раю.
І жанчыны, як пчолы,
ляцяць на язьмін.
А язьмін адцьвітае,
і чарнеюць галіны,
і цяжарныя мараць
аб плоці жывой.
Не да плоду — да камня
прырасла пупавіна.
Дух хаваецца ў целе,
як вечны ізгой.

ЯК ТОЙ САБАКА

Як той сабака
я шукаю схову —
сканаць у ім,
каб шкельцы гострых сьлёз
спаўзьлі з вачніц,
нібы з асьвіных гнёзд
на вусны
і з крывёй збудзілі мову.

Няхай, хоць перад сьмерцю,
я пачую —
што
кроў мая раскажа пра мяне?..

Ды гэтай ноччу сьмерць хай абміне,
І, бы ў труне, я ў схове заначую,
як той сабака...

Я пагібель чую.

ПЕСЬНЯ ПРА ЖАНУ

Ахвярую Юрыю Кузьняцову

У расейцаў шаблі касыя,
у расейцаў вочы Батыя,
конскія хвасты за плячыма,
потная кабыла — Айчына.

Не патрап пад шаблі касыя,
не павер у вочы Батыя,
не сядлай жарэбнай кабылы —
прывязе да цёмнай магілы,

а ў мяне ж свая ёсьць магіла,
а мяне ж яна палюбіла,
палюбіла сынам і мужам,
як жану, я біў яе гужам,
а я біў-пытаўся: ці мала
да мяне з чужынцамі спала?

«Спала з маскалём, спала зь ляхам,
ды была пасьцельлю мне плаха,
спала з тваім бацькам — ліцьвінам,
а цяпер з табой — з маім сынам,

паглядзіся ў рэчкі лясныя,
хіба ж маеш вочы Батыя,
хіба ж конскі хвост за плячыма,
паглядзі — з кім спала Айчына,

а ў расейцаў шаблі касыя,
а ў расейцаў вочы Батыя,
конскія хвасты за плячыма,
потная кабыла — Айчына.

Не патрап пад шаблі касыя,
не павер у вочы Батыя,
не сядлай жарэбнай кабылы —
прывязе да цёмнай магілы,

а ў цябе ж свая ёсьць магіла,
а цябе ж яна палюбіла,
палюбіла сынам і мужам,
як жану, ты біў яе гужам,

а ты біў-пытаўся: ці мала
да цябе з чужынцамі спала.

Спала з маскалём, спала зь ляхам,
ды была пасьцельлю мне плаха,
спала з тваім бацькам — ліцьвінам,
а цяпер з табой — з маім сынам,

паглядзіся ў рэчкі лясныя, —
хіба ж маеш вочы Батыя,
хіба ж конскі хвост за плячыма,
паглядзі — з кім спала Айчына.»

ПЕРАД БОГАМ

Я думаў
вершы мае відушчыя —
аж пакуль не асьлепнуў сам
ад маланкі, самім жа пушчанай,
я гарэў, як бязбожны храм,
сам сабе я ў ім здаўся богам,
адпускаў сам сабе грахі —
грызла ганак, вяла дарога
зноў на д'яблавыя кругі,
ад яго я вяртаўся ў поўсьці
і калі цалаваў свой крыж,
ён адбіткам жахлівым помсьціў,
бы люстэрка ці д'яблаў віж,
і тагды я складаў малітву
можа ў соты свой самасуд,
той малітвай, нібыта брытвай,
сашкрабаў у вадчаі бруд,
і ў вадчаі я рэзаў вочы,
і жахаўся крыві сваёй,
і жагнаўся — набожна, тройчы —
і агідны, жывёльны лой
з гострай брытвы маёй малітвы
быццам гной, патыхаў маной.
Я пакінуў свой храм сьмярдзючы,
азірнуўся на купалы,
а сьвятыя ў маіх анучах
несьлі кроў маю на сталы,
а я
голы, як здань, бяскроўны,
у чыесьці ступаў сьляды,
перад Богам жывёле роўны,
нёс грахі свае на клады,
і глыбела за мной сьцяжына,
і ступала ў мае сьляды
маці грэшных усіх — Жанчына —
з поўнай чарай жывой вады.

ніводны гук зямны"), і зь незвычайным полем, дзе няма ніводнае "Звыклае травінкі", і з пахаваньнем сябе самога. А ў невялічкай заключнай паэме «Хвароба» паэт адлюстроўвае здабываньне новага сьвету ў выглядзе своеасаблівай "гісторыі хваробы". Першыя праявы новай духоўнасьці ўспрымаюцца героем як сымптомы страшэннай невылечнай пошасьці ("Яна, яна — Вялікая Праказа — адзначыла таўром маё чало!"). Ён назаўсёды пакідае стары сьвет, спаліўшы ўсё, што раней было сутнасьцю ягонага йснаваньня: "Свой бедны скарб спаліў датла я — Струпехлае, абрыдлае жытло, І, як салома, ў поцемках палала, Ўсю ноч ня гаснучы, мінулае маё". Хвароба ў сапраўднасьці аказваецца духоўным здароўем. Прыцемак бездані запаўняецца новымі фарбамі й гукамі. Адчужанасьць ад сьвету перарастае ў новую духоўную прыроду. Туга па сэнсу жыцьця расьсейваецца, і нечакана раскрываецца велічная панарама новага сьвету. Дакладней, гэта той самы, ранейшы сьвет, толькі цяпер ён бачыцца, нібы з самалёту — увесь цалкам, а барвы ягоныя настолькі выразныя, што сьпярша здаюцца ірэальнымі. У стане духоўнага прасьвятленьня герой «Шарай гадзіны» заступае на "шлях жыцьця ў прорве сьмерці", як акрэсьлівалі ўсходнія мысьляры ўступленьне на стромы шлях духоўнага дасканаленьня.

На заканчэньне

Тры гады таму аматары паэзіі Ніцкі былі ўзрушаныя весткаю, што паэт да нядаўняга часу жыў у мурох манастыра Цзонхавы на Тыбэце. Аднак, неўзабаве прыйшло й расчараваньне: у небагатым скарбе, які пакінуў па сабе паэт, не было знойдзена ніводнага·новага радка. «Шарая гадзіна» так і засталася першаю й апошняю кнігаю нашага выдатнага творцы. І ў гэтым мне бачыцца пацьверджаньне думкі аднаго майстра слова прамінулага стагодзьдзя, што творчая бясплённасьць неадлучная ад сапраўднай, высокай і чыстай духоўнасьці.

ТЭТ-А-ТЭАТАР

Жана Лашкевіч

1.

Адслугаваўшы эпосе савецкай, зэрагі камісараў зь дзядамі цыбулькамі (каралеваў усё больш ня йгралі) пасунуліся былі ўпрочкі, але ж сказана: «спадчына — гэта пераўвасабленьне», і вось ужо чарада тэатральных акадэмікаў выпраўляецца ўвасабляць гвалт усё той самай Рагнеды...

Фэномэн гэты невытлумачальны хоць бы паводле сваёй няўцямнай прыроды: беларускі тэатар. О! Рэй калгасна-саўгасных інтанацый, альбо дасканаленьне мастакоўскіх вартасьцяў паводле прамаўленьня сцэнічнага «ч»; імітацыя творчага жыцьця й сапраўднае (патаемнае?) жаданьне по-настоящему работать, маракаваньне на скрут галавы — як спалучыць посьпех з адпачынкам...

Сталіца бяжком адзначае зьяўленьне на адной са сваіх самых прэстыжных сцэнаў «Тутэйшых», і актор Манаеў дзесьці ля шапіка пытае па-расейску «Вячорку», — гэтаму прысьвячаецца самая кароткая рэцэнзія самай свабоднай газэты. «Тры сястры», мудуруючыся, каб хоць ня схібіць з канцэпцыі, выгукаюць «у маскву, у маскву», — усе першыя рады партэра зажурана ўслухваюцца ў водгульле пустое залы. Менская раздражнёнасьць спакваля апраменьвае правінцыйнікаў, і вось неўзабаве тэатар у Берасьці, дагэтуль намастачаны штукарыць «Крепости», падлабуньваецца да набокаўскае «Ляліты», — у выніку мае два «Конскія партрэты»... Налучаецца пасьлядоўная мітусьня вакол «Хрыста й Антыхрыста» Д.Меражкоўскага ў Расейскім тэатры Беларусі (перастаўлена з расейскай сцэны Летувы). Вынік — прэмія імя Ігната Буйніцкага за буйное нацыянальнае дасягненьне — ролю Пятра І... О!

Роля, паводле якой апантаны полаганием основ ды падмуркаў гасудар дае дыхту сыну-юроду, тэхнічна зьбіваючы яго на горкі яблык, а потым файны такі кажушок пляміць чырвонаю фарбай, пазначыўшы забойства сына рэжысэрскай знаходкай у стылі графа Талстога Аляксея. Нашаэраны ўласна Меражкоўскі, чыім імем ганараваная тэатральная апавестка, разгублена гуртуецца з натапыраным уласна Буйніцкім, чыім імем ганараваныя прэміяльныя грошы: «Наша культура складаецца... не з прыміраных культур мінулага, але зь непрымірымых яго частак».

... Вось крытык непрымірымай пазыцыі й пасьлядоўна тэатральнае любові да бліжняга вывучыўся па-беларуску: «рабы — ня мы».

... Вось мы з акторам Манаевым, адно за адным па-расейску выпрошваючы ў шапіку беларускія газэты, мяркуем, якім такім сцэнічным вабноцьцем давесьці публіцы намер тутэйшага тэатру вярнуцца ва ўлоньне Эўропы, — бадай, акрамя як нямецкім ці ангельскім — няма якім...

... Вось рэжысэр Пінігін, запатэнтаваўшы прачытаньне «Тутэйшых» гадоў на колькі ўперад, тузаецца між буколікай, пастаральлю ды ідыліяй, вымяркоўвае для опэры «Сялянка» прастору драматычнае (Купалаўскай) сцэны; вось рэжысэр Ляляўскі рыхтуе да прэм'еры ў Дзяржаўным лялечным тэатры «Цара Ірада» паводле традыцыйных батлейкавых прадстаўленьняў... Імітуюць нацыянальнае жыцьцё?

... Вось мой трохгадовы сын пакрыўджана выгукае: «Чаго ты прыстаўляесься, ты ж будзеш пераказваць, а глядзець буду я!» — значыць, вырашае, куды падацца бавіць час, «у Купалу» ці «ў лялькі», але толькі з матуляй, якая забясьпечыць пераклад са сцэнічнай мовы на яму зразумелую... Зробіць адметны круцьверць, ператлумачыўшы падсьвядомае нацыянальна-тэатральнае «нам няма куды ісьці, нам няма чаго сказаць» якімсьці шляхетным эпілёгам...

А вось, ратуючыся ад фэномэну беларускага тэатру, хоць куды імкнуць акторы-безнадзейнікі — хоць дзе старым добрым спосабам паказаць сябе ў прапанаваных абставінах, — тутэйшыя абставіны ня ўстоялі... І хутка я перакажу сыну ўсе слынныя байкі: пра тэтральную атмасфэру і актораву палітру, — як бярэ дзядзька адну фарбу і квачом, квачом, пакуль не патрапіцца шляхетны эпілёг; альбо выштукую казку пра дзівосны мастакоўскі заняпад, пасьля якога аднаго разу быў росквіт, ці распавяду, як фэномэн — беларускі тэатар — пасябраваў з фэномэнам — сусьветным прагрэсам, але да іх панадзіўся мастацкі крызіс і так утоўпіўся-ўбіўся, што йдзеш цяперака ў тэатар, а патрапляеш проста ў крызіс.

Але ж і горда рэе наш бел-чырвона-белы сьцяг на падвалінах беларускага тэатральнага фэномэну! Ідуць скаўты — праз Аляксандраўскі сквэр нацянькі, ідуць навукоўцы — сумуюць па сваіх «Тутэйшых», ідуць страйкоўцы, перамаўляюцца з сусьветным прагрэсам па-ангельску альбо па-камароўску. Бо ўжо й курс валюты, пастаяўшы на колішняй Койданаўскай вуліцы ды атабарыўшыся за кратамі Камароўскага рынку, самотна давёў, што нават заняпад няможна адрадзіць альбо аднавіць, а можна толькі стварыць нанова.

ЧАЦЬВЕРТАЯ НАЦЫЯ...

Беларусы ў Вільні паступова вяртаюцца на месца адной з чатырох нацый — сёньня чацьвертай па колькасьці, па мове ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі, па ўстановах асьветы... Чацьвертай пасьля летувісаў, расейцаў, палякаў. За апошнія сто гадоў у розных галінах віленскага жыцьця гэтыя чатыры нацыі займалі розныя месцы, мелі розную вагу, розныя дачыненьні паміж сабою. Звычайна ўсё вынікала з таго, каму належала дзяржаўная ўлада. На працягу XX ст. Вільня тройчы зьмяніла сваё нацыянальнае аблічча. Прынамсі, для Эўропы гэта прыклад выключны. Пра тое, як усё тое адбывалася, успамінае стары віленчук Лявон Луцкевіч.

Гутарка зь Лявонам Луцкевічам

— Для большасьці сучасных жыхароў Беларусі Вільня — менш зразумелае слова, чым Вільнюс. І сам горад са сваёй адмысловай культурай успрымаецца такім, які ён ёсьць, — зь летувіскаю мовай на шыльдах, у крамах, у вуснах элеганцкіх мінакоў, з адмысловым балцкім налётам на тутэйшым жыцьці. Але ці заўсёды было гэтак? Якое месца ў Вільні летувісы займалі да апошняй вайны, ці чуваць было іх, ці мелі зь імі кантакты людзі з тутэйшага беларускага асяродку? Чыёй увогуле лічылася Вільня?

— Беларускае грамадзтва мела зь імі кантакты й нават добрыя кантакты. Адносіны былі больш шчырыя, чым цяпер. Не было такой насьцярожанасьці з-за таго, што беларусаў разглядаюць, як адных з прэтэндэнтаў на Вільню. У той час, калі горад трымала ў сваіх руках польская ўлада, інтарэсы ў нас былі амаль аднолькавыя. Гутарка йшла пра вызваленьне ад таго рэжыму, які й беларусы, і літоўцы (я ўжо буду ўжываць гэты тэрмін) лічылі акупацыйным, чужым.

— І інтарэсы былі аднолькавыя, і вага?

— Вага была не аднолькавая. Мабыць, і літоўцам сяголньня трэба прызнаць, што ў тэй сытуацыі яны тут былі без параўнаньня слабейшыя за беларусаў. У іх тут была невялічкая жменька інтэлігенцыі. Прычым тая частка этнічнага літоўскага насельніцтва, якая засяляе Віленскі край, што ўваходзіў у Польшчу, — была настолькі ізаляваная ад Ковеншчыны, ад той Літвы, незалежнай, што яны мелі зусім мала дапамогі адтуль, са свайго цэнтру. Беларусы таксама былі ізаляваныя ад менскага цэнтру, але затое ў іх было вялікае заплечча ў выглядзе ўсёй Заходняй Беларусі, уключаючы Палесьсе. Калі ў Заходняй Беларусі на пачатку 20-х гадоў было шмат сярэдніх школ, шмат гімназіяў, дык ужо ў сярэдзіне 20-х яны былі зьліквідаваныя амаль усюды, за выключэньнем Вілені. У Вільні таксама працаваў унівэрсытэт. Словам, сюды сьцякалася інтэлігенцыя й моладзь, якая хацела ўліцца ў кадры інтэлігенцыі. Так што нераўнавага была на карысьць беларусаў. Прыклад, які я неаднойчы выкарыстоўваў у гутарках на гэтую тэму, — пэрыядычны друк. Нягледзячы на тое, што ўлада была польская, і палякі, вядома, мелі першынства, на другім месцы па колькасьці выданьняў і тыражу стаялі беларусы. Такая статыстыка была прыведзеная ў 28-м годзе Віленскім унівэрсытэтам, прычым ня тымі, хто хацеў паказаць прысутнасьць беларусаў. На трэцім месцы быў жыдоўскі пэрыядычны друк, на чацьвертым расейскі і, бадай, ці не на пятым, — літоўскі.

— Атрымліваецца пяць нацыянальных групаў. Як яны паміж сабой стасаваліся?

— Бачыце, калі беларусы й літоўцы йснавалі ў Віленскім краі, таму што тутака іхняе памежжа, дык польскі й расейскі ўплывы былі прадыктаваныя палянізацыяй Вялікага Княства Літоўскага й русыфікацыяй падчас расейскай акупацыі. І ўсе гэтыя, так сказаць, інтэлектуальныя сілы мелі тут сваё адлюстраваньне. Але мы забываемся яшчэ на праблему жыдоўскую. Таму што жыды складалі прыблізна 40% насельніцтва. Калі казаць пра асьвету, дык жыды былі на другім месцы пасьля палякаў па школах, яны мелі некалькі жыдоўскіх гімназіяў, была адна беларуская гімназія, адна літоўская, адна расейская. Нейкі час, магчыма, былі нават дзьве расейскія, таму што па старой традыцыі жаночая была асобна.

— Узаемапрыцягальнасьць паміж рознымі нацыянальнымі групамі: беларусы, жыды, летувісы, расейцы (калі ня браць палякаў)...

— Я думаю, што ўсё разьмежаваньне йшло па лініі: палякі, як пануючая ўлада, і — усе астатнія меншасьці. Як бы два франты. Гэтыя меншасьці групаваліся й салідарызаваліся паміж сабой і ў палітычным жыцьці, і ў інтэлектуальным, а палякі стаялі над імі, адмяжоўваліся як гаспадары. Што тычыцца расейцаў, дык яны ня вельмі гарнуліся да такога аб'яднаньня паміж меншасьцямі. Найбольш адчувалася сумеснае грамадзкае жыцьцё трох нацыянальнасьцяў: беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў. Напрыклад, былі нацыянальныя студэнцкія саюзы, якія супольна ладзілі многія мерапрыемствы.

— Украінцы? Яны тутэйшыя ці толькі тыя, што прыяжджалі ва ўнівэрсытэт?

— Прыяжджалі вучыцца. Іх тут было, безумоўна, няшмат. Школы яны ня мелі, мелі свой студэнцкі саюз і заўсёды праяўлялі даволі добрую арганізаванасьць. Маральную, магчыма, нават і матэрыяльную падтрымку мелі з боку Львоўшчыны.

— А якое месца ў гэтым раскладзе займала жыдоўскае насельніцтва?

— Яно таксама дзялілася па сацыяльных пластох. Жыдоўская бедната (а яе, вядома, колькасна была бальшыня) належала, як правіла, да левых напрамкаў, была пад уплывам камуністычнай партыі (таксама як, зрэшты, і беларускі пралетарыят). А буржуазія, яна была даволі індыфэрэнтная ў палітычным сэнсе, заўсёды прыстасоўвалася й імкнулася быць ляяльнай да тэй улады, якая йснавала. Таму жыдоўская буржуазія й інтэлігенцыя вельмі лёгка ўпісаліся ў расейскую прысутнасьць тутака, лёгка засвоілі расейскую мову. Нават пры Польшчы яшчэ адчувалася, што старэйшае пакаленьне жыдоўскай інтэлігенцыі лепей валодала расейскай мовай, чым польскай.

— А ў вашым дзіцячым асяродзьдзі... Гульні ў двары... Ці былі там летувісы?

— Не, не было. Праўду кажучы, у двары я больш чуў далёка ня якасную польскую мову, можа быць, расейскую, але расейскую я хутчэй чуў у асяродзьдзі інтэлігенцыі, зь якой сутыкаўся бацька. Вы зразумейце, у 1930-м мне было ўсяго 8 гадоў. Але гэтыя гады былі яшчэ настолькі блізкія да царскага часу, калі ва ўсёй Вільні панавала культура расейская, што ў вельмі многіх сем'ях захоўвалася яшчэ традыцыя расейшчыны, асабліва праваслаўе. Яно паўплывала на тое, што просты народ цягнуўся да гэтай расейшчыны праз царкву, хоць этнічна яны, магчыма, былі беларусы.

— Вы кажаце, што летувісаў і беларусаў яднала процістаяньне польскаму афіцыёзу. Ці былі размовы пра тое, што польская ўлада можа зьмяніцца на летувіскую, беларускую ці яшчэ якую? Ці, наадварот, думалася, што гэта назаўжды: Польшча стала, Польшча ёсьць, і Польшча будзе?

— Абсалютна не. Бальшыня беларусаў Віленшчыны... людзі ведалі, неяк адчувалі, што гэта нетрывалае ўсё. І чакалі зьменаў.

— Ад якіх сілаў чакалі зьменаў? Ад вонкавых? Савецкі Саюз? Нямеччына?..

— Ведаеце, сярод беларусаў адчувалася, што Вільня, як сталіца Заходняй Беларусі...

— Гэта адназначна?

— Адназначна — як сталіца Заходняй Беларусі, так успрымалася, інакш не ўспрымалася... І тая невялікая групоўка літоўскай інтэлігенцыі, зь якой меў кантакты мой бацька... мне здаецца, яны памяркоўна ставіліся да таго, што беларусы ўспрымаюць Вільню як сваю й спалучаюць яе з усёй тэрыторыяй Заходняй Беларусі. А паколькі беларусы заўсёды марылі пра ўзьяднаньне... і я думаю, гэтыя думкі мелі ўсе беларусы, самых розных напрамкаў — ад камуністаў да хрысьціянскіх дэмакратаў... Рыскі трактат адназначна ўспрымалі як акт несправядлівасьці й беларусы, і ўкраінцы. Тут не магло быць двух поглядаў на гэтую справу.

— А летувісы памяркоўна ставіліся да такога ўяўленьня беларусаў і тым ня менш самі глядзелі на Вільню як на сваю тэрыторыю...

— Так, бясспрэчна. Але я думаю, што больш моцныя настроі ў напрамку здабыцьця (у іх паняцьці было — вяртаньня) Вільні да Літвы (паводле гэтага тэрміналягічнага непаразуменьня: усё ж такі — Літва, і сталіца Літвы — Вільня), такія настроі мацнейшыя былі ў незалежнай Літве, чым сярод літоўскага насельніцтва тутака, на польскай тэрыторыі.

— Яны бачылі рэальнасьць, што ўсё ня так проста...

— Так. Але я думаю, што сярод літоўскіх патрыётаў Вільня заўсёды разглядалася як іхняя сталіца, якая абавязкова мусіла далучыцца да Літвы.

— Але спрэчак на гэтую тэму зь летувісамі не было...

— Не. І, мне здаецца, што гэта традыцыя яшчэ той літоўска-беларускай салідарнасьці, якая была на пачатку стагодзьдзя, калі выходзіла *НН*, калі яе прэнумэрату прыймалі ў літоўскай кнігарні Пясэцкайтэ-Шлапялене, калі літвін Марцін Кухта друкаваў беларускія газэты, — яна як бы перанеслася й на міжваенны час. Сьцяпан Кайрыс, муж Цёткі, зусім адназначна казаў: у нас зь беларусамі ў той час (гэта 15-16 год) не ўзьнікала пытаньня аб Вільні; мы ўсе адчувалі тую несправядлівасьць, што царская ўлада — чужая, накінутая й нам, і беларусам. Ужо ўзьніклі праявы нацыянальнага адраджэньня і ў адных, і ў другіх, і важна было скінуць гэтае ярмо, а як далей — мабыць, ня надта задумваліся.

— Калі б тагачасным віленчукам зь беларускага асяродзьдзя, зь лідараў, удалося раптам пабачыць Вільню сёньняшнюю, летувіскамоўную сталіцу зусім іншай, балцкай дзяржавы, гэта быў бы для іх — нонсэнс?..

— Так, гэта быў бы для іх незразумелы, непрыемны момант, як нечаканы сон. Дзякуючы якраз тагачаснай прапорцыі нацыянальных сілаў у Вільні, чутка пра далучэньне да Літвы ўспрынялася нечаканасьцю. Справа ў тым, што прынамсі два месяцы пасьля 17 верасьня Вільня гвалтоўна рыхтавалася да плебісцыту за далучэньне да Беларусі.

— Савецкімі ўладамі?

— Так, былі арганізаваныя агітпункты з чырвонымі транспарантамі, і ўсё гэта на беларускай мове, выходзіла беларуская газэта... І гэта ўспрымалася, маўляў, так павінна быць.

— А за далучэньне — ад каго?

— Проста за далучэньне, бо ўжо перастала йснаваць Польшча як дзяржава. Але трэба

Вершы пра Вільню

Каб зразумець, чым ёсьць для беларусаў Вільня, трэба найперш зьвярнуцца да беларускае паэзіі. Адказ атрымаецца просты й неабвержны. Таму першым выдавецкім праектам Рэдакцыі *НН* і стаў зборнік пад умоўнаю назвай «Вільня ў беларускай паэзіі».

Самы пачатак працы над такім зборам паказвае, што гэта будзе зусім адмысловы збор. Гарадзкая тэматыка для традыцыйна вясковае паэзіі ставала пэўным эстэтычным выпрабаваньнем, змушала да іншых словаў, іншае вобразнасьці, каб адбіць на паперы зусім іншыя пачуцьці. Адзіны літаратуразнаўчы артыкул на гэтую тэму належыць пяру Антона Луцкевіча. Пасьля яго вось ужо больш за 60 гадоў да гэтае тэмы беларускія крытыкі не зьвярталіся. Мабыць таму, што Вільня стала Вільнюсам... Што, зрэшты, не перашкодзіла зьяўленьню новых і новых вершаў пра Вільню. (Рэдакцыя НН у сваю чаргу падтрымала гэтую тэму, абвясьціўшы ў 4-м нумары паэтычнае спаборніцтва на лепшы сучасны верш пра Вільню.)

Вось сьпіс некаторых твораў, што прысьвечаныя Вільні (Магчыма, Вы ведаеце вершы, якія не ўвайшлі ў гэты сьпіс, магчыма, маеце ўласныя творы. Тады, калі ласка, паведамце пра тое Рэдакцыі):

Народныя песьні: *Дачка-птушка. Маладая малодачка зь Вільна ішла...*
Ананім (К.Сваяк?): *Вострабрамска Маці Божа (Голас Душы. Рым, 1949).*
Арсеньнева Натальля: *** *Сьветла, спакойна, лёгка бяз канца... Восень у Вільні. Месячнай ночай. Вечар у Вільні. Прошча. Цыкль «Прывіды». Тваё імя.*
Багдановіч Максім: *Касьцёл Сьв. Ганны ў Вільні.* *** *Вулкі Вільні зіяюць і гучна грымяць!... У Вільні (Санэт). Пагоня.*
Бядуля Зьмітрок: *Сьвятое гэта месца. Віленскія помнікі. Жалезны воўк. На Замкавай гары.* *** *А людзі, як тыя мурашкі. На беразе Вяльлі. Руіны жрацоў. У чарах. Касьцёл Сьв. Ганны. Паходні (урывак).*
Вярыга-Дарэўскі Арцём: *Літвінам, што запісаліся ў мой «Альбом» (урывак).*
Гарун Алесь: *Варожба, Засьцянковая аповесьць (урывак). Дні.*
Глёбус Адам: *1939, Вільня, Слова беспрацоўнага.*
Гурыновіч Адам: *Зьвярынец.*
Дудзіцкі Ўладзімер: *Вільні.*
Жылка Ўладзімер: *Тэстамэнт (урывак). Вершы аб Вільні: І. Калі сябры нас гудзяць згубаю... ІІ. О, Вільня крывіцкая Мэкка!..*
Зьніч: *Сталіца.*
Зязюля Андрэй: *Малітва да М.Б. Вострабрамскай.*
Кавыль Міхась: *Вяльляначчка (Танго).*
Камейша Казімір: *Вуліцы Вільнюса.*
Караткевіч Уладзімер: *Вільня ў дождж.*
Колас Якуб: *Новая зямля (урывак).*
Купала Янка: *Лірнік Вясковы (урывак). Замкавая гара (Зь віленскіх абразоў).*
Лось Еўдакія: *Вільнюс.*
Лужанін Максім: *Вільнянка.*
Лучына Янка: *Паляўнічыя акварэлькі з Палесься (урывак).*
Марціновіч Павал: *У Вільнюсе. Каменныя балады. Успамін.* *** *Цягніка грукочуць колы...*
Машара Міхась: *Падарожжа.*
Мінкін Алег: *Цыкль вершаў у НН.*
Панчанка Пімен: *Сустрэча зь Вільняй.*
Родзевіч Леапольд: *Мінуўшчына.*
Рэніер Мамэрт: *** *(У альбом А.Вярыгу-Дарэўскаму, урывак).*
Салавей Алесь: *Сад (Да 25-годзьдзя Віленскай беларускай гімназіі). Францішак Скарына. Ля Вострай Брамы. Вільня. Вянок санэтаў (урывак). За славу Радзімы. (Да арганізацыі Беларускага корпусу Самааховы, урывак).*
Сапач Тацяна: *У Вільні.*
Семашкевіч Рыгор: *Інтэрнат (урывак).*
Сокалаў-Воюш Сяржук: *Песьня пра Вільню.*
Сыракомля Уладзіслаў: *Вызваленьне сялян (урывак).*
Танк Максім: *Вільня. У Панарах. Вільнюс. У Вільнюсе. Мікалай Дворнікаў (урывак з паэмы).*
Цётка: *З чужыны.*
Чачот Ян: *Яжовыя (урывак). Бекеш (урыўкі). Радзівіл, альбо Заснаваньне Вільні.*

зразумець псыхалёгію тутэйшага народу ўсіх нацыянальнасьцяў (за выключэньнем самых літоўцаў). Усе ж яны былі, як правіла, альбо руска-, альбо польска-, альбо беларускамоўныя. Ага, далучэньне да Беларусі, значыць, да Беларусі. І ўсё. Для іх праблемы не было. Існаваньне ў складзе Беларусі ўспрымалася... ну, не такі рэзкі нералом, як прыход улады з зусім чужой і абсалютна незразумелай для больш чым 90% насельніцтва Вільні мовай. Гэтая ж мова тут была невядомая. Асабіста я ня з вуліцы, не зь літоўскага асяродзьдзя, а ад бацькі пачуў два першыя літоўскія словы. Калі брат мой Юрка пачынаў дурэць, бацька яго называў Юргіс дурняліс... Зразумейце, ня з вуліцы, не зь літоўскага асяродзьдзя... Бо не было, не было дзе чуць гэтую мову.

— А як тое, што Вы кажаце, спалучыць з ранейшымі словамі, маўляў, гэта зямля двух народаў...

— Што тычыцца краю, дык этнічная прысутнасьць у навакольлі Вільні заўсёды пераважала беларуская. Я думаю, што літоўскія дасьледчыкі таксама маюць рацыю, калі кажуць, што нават у XIX ст. яшчэ йшоў працэс перасоўваньня моўнай граніцы з поўдня на поўнач на карысьць беларускай мовы, прычым незалежна ад уплываў кіраўнічае ўлады. Гэта нейкая дыфузія, растварэньне літоўскіх вёсак, якія спачатку паўвыспамі ўваходзілі вельмі глыбака, значна глыбей, чым сёньня, у беларускую тэрыторыю, потым яны звужаліся, потым абразаліся й тварыліся астраўкі, і адсюль гэтыя астраўкі беларускія на Літве й літоўскія на Беларусі. Некалі мне давялося ў Троцкім раёне працаваць на электрыфікацыі калгасаў, і ў ваднэй сям'і, дзе я быў на кватэры (каталіцкая сям'я, сялянская, яны лічылі сябе тутэйшымі палякамі, хоць пастушкі на полі ўсюды сьпявалі беларускія песьні, гутарылі й лаяліся па-беларуску), бабуля ў хаце, калі я прыходзіў туды разам са сваёй брыгадай (дзе былі ўсе літоўцы, акрамя мяне аднаго, брыгадзіра; яны між сабой гаварылі па-літоўску), бабулька казала: а я яшчэ разумею па-літоўску, я ўсё разумею, што вы гаворыце... Гэта на пагранічччы, Сімілішкі, калгас імя Касьцюшкі, дзе вельмі разнародны этнічны склад. Так што безумоўны этнічны ўплыў існаваў. Гэта прасочваецца й па прозьвішчах. Помню, у першай ці ў другой клясе Віленскай беларускай гімназіі быў беларускі хлапчына. Прозьвішча яго Кетурка. Дык ён жа ня ведаў, што ён літовец, але прозьвішча гаварыла за гэта. І працэс зьбеларушчваньня ішоў якраз на ўзроўні сельскіх мясцовасьцяў, якія гранічылі. Пэўная перавага была таму, што наша мова была больш блізкая да славянскіх дзяржаўных моваў. Дзяржаўнай мовы балцкай ніколі тут не было. Гэта таксама мела адмоўны ўплыў на фармаваньне іх нацыянальнай сьвядомасьці, але яны здолелі гэта перамагчы. Вось у чым заслуга літоўскага адраджэньня, што яны здолелі ўсе гэтыя цяжкасьці пераадолець, стварыць і сваю буржуазію, і сваю тэхнічную і сваю гуманітарную інтэлігенцыю.

— Ці адбывалася такая «дыфузія» на ўзроўні гораду?

— Бачыце, нацыянальная ці хутчэй моўная структура гораду — вельмі зьменлівая. І таму я думаю, трэба гэты стан гораду крыху абстрагаваць ад нацыянальнае самасьвядомасьці. А што сапраўды колькасна іх тутака было вельмі мала, дык гэта ж прызнаюць усе статыстыкі.

— Але статыстыкі й нас прызнаюць вельмі мала...

— Так, зусім слушна. Таму што мы ў той час таксама былі яшчэ праслойкай прыбыўшых у горад зь вёскі. Напачатку гэтага стагодзьдзя беларусы й літоўцы былі мужыцкімі нацыямі. Настолькі маленькі працэнт быў сваёй нацыянальнай інтэлігенцыі, яна толькі нараджалася.

— Якая была рэакцыя беларускага асяродзьдзя на далучэньне Вільні да Летувы?

— Што ўяўлялася мне, як яшчэ вельмі недасьведчанаму юнаку? Гэта было настолькі вялікае зьдзіўленьне!.. Між іншым, ня ведаю, зь якіх крыніц, але перад самым арыштам бацька ўжо недзе "пранюхаў" і сказаў: яшчэ ня выключана такая магчымасьць, што Вільня трапіць у склад Літвы. Гэта было ў кастрычніку. І потым мы ўсе былі так зьдзіўленыя, калі ягоныя словы ўжо пасьля арышту спраўдзіліся. Мы проста не маглі зразумець, ці гэта палітычная дальнавіднасьць, ці інфармацыя аднекуль...

— Што Вы думаеце пра нацыянальную будучыню Вільні? Зразумела, што ёсьць тое, што ёсьць. Але, скажам так, як бы Вам хацелася?

— Хацелася б зьмякчыць міжнацыянальную напружанасьць, таму што ў карысьць якой бы нацыі яна ні йшла, яна заўсёды будзе выклікаць варожасьць з боку ўсіх трох. Я маю на ўвазе: польскую стыхію, расейскую, беларускую й літоўскую — гэты чатырохкутнік мусіць сёньня неяк прыціраццa, каб не ствараць напружанасьці. Бо заўсёды тут так выходзіць. Літоўцы адбіваюцца ад уплываў трох нацыянальнасьцяў: польскай, расейскай і цяпер — зноў — беларускай (таму што адраджэньне беларускасьці на Беларусі стварае як бы дадатковую нагрузку пры гэтым ціску). Палякі, тыя, што прытрымліваюцца рэваншысцкіх поглядаў (граніц 39-га году), адчуваюць, што супраць будуць літоўцы, расейцы, беларусы. Расейцы-вялікадзяржаўнікі... паколькі гэта быў Савецкі Саюз, значыць, Савецкая Расея, значыць, Расея, значыць, усе гэтыя — іншародцы, прыдуманыя нацыі, якія не павінны йснаваць. Так вось і атрымліваецца, што ў кожнага прэтэнзіі да ўсіх трох.

— А беларусаў Вы не назвалі...

— А беларусаў я называю і зь вялікім сумам мушу сьцьвердзіць, што нам таксама прыходзіцца адчуваць націск з трох бакоў. Нам асабліва, таму што націск пануючай нацыі мы заўсёды адчувалі ці то расейскі, ці то польскі. А цяпер прыціскае й літоўскасьць, асабліва таму, што сярод маладзейшага пакаленьня літоўцаў наагул няма разуменьня права беларускай нацыі на йснаваньне. Літоўцам, выхаваным у савецкай школе, мабыць, хацелася б, каб Беларусь перастала йснаваць як нацыя, таму што беларусы, дзякуючы свайму памежнаму становішчу, таксама пэўны націск на Літву рабілі.

— Як прэтэндэнты?

— Як прэтэндэнты. Тым больш, улічваючы супольную гісторыю. Гэта, можа, нават інтуіцыйна неяк, нават падсьвядома ўспрымалася: ну што, прападзе Беларусь як нацыя, а што нам плакаць? Зьявіўся нейкі нацыянальны эгаізм. У той час, калі быў адзін супольны вораг, быў ня тое што альтруізм, але была супольнасьць інтарэсаў заўсёды ўсіх трох нацый супраць чацьвертай, якая на сёньняшні дзень панавала. Вільня ўвесь час фармавалася ў такіх умовах.

— Які можа быць на будучыню лепшы варыянт разьвіцьця падзей?

— Я думаю, што перш за ўсё, мабыць, — ня трэба чапаць граніц. Але трэба стварыць такія варункі пры поўным дзяржаўным сувэрэнітэце усіх ужо сфармаваных народаў, каб між гэтымі сувэрэннымі дзяржавамі граніцы былі неадчувальныя. Павінна быць як найбольш цесная эканамічная й культурная, пабытовая сувязь. Усялякае абмежаваньне перасоўваньня праз граніцу — гэта, мне здаецца, абмежаваньне правоў чалавека. І гэты варыянт для Віленшчыны вельмі важны. Вядома, будзе адбывацца пэўная этнічная дыфузія, можа быць, нават у некаторых вёсках узмоцніцца літоўскі ўплыў, а ў некаторых, дзе пераважаюць беларусы, узмоцніцца ўплыў беларускі. У тых жа Салечніках.

— Цяпер на мяжы поўным ходам ідзе ўзьвядзеньне "заслоны" з абедзьвюх бакоў. Мабыць, хутка зьявяцца ўзараныя палосы...

— Так, гэта вельмі сумная зьява. Але мне здаецца, што гэта ўсё ж такі будзе пераходным этапам. Калі ўпарадкуюцца эканамічныя адносіны, дык, напэўна, на ўзроўні Эўропы ня будуць патрэбныя гэтыя палосы. Граніца застанецца як дзяленьне чыста адміністрацыйнае, таму што недзе ж павінна канчацца адна ўлада, пачынацца другая, гэтаксама як паміж раёнамі, абласьцямі й г.д. Мы, памятаю, у ранейшыя часы часта на сваім старэнькім масквічыку, як яго называлі — бобіку, езьдзілі зь Вільні пад Менск. І заўсёды, калі пераяжджалі мяжу, то з добрай дарога рабілася адразу поўная выбаін, а мы крычалі: ура! мы пераехалі граніцу! Вось такое адчуваньне граніцы й павінна быць. Толькі дай Бог, каб дарога па сваёй якасьці зь двух бакоў была аднолькава добрая.

С.Д.

P.S. Калі так яно й будзе, калі бацькаўшчына не акажацца за новай каменнай сьцяной, беларусы Віленшчыны ня будуць адчуваць сябе загнанымі ў кут эмігрантамі на зямлі сваіх продкаў, нацменамі з адпаведным наборам комплексаў непаўнавартасьці, ЧАЦЬВЕРТЫМІ. Сама гэтая лічба будзе азначаць ня больш, чым увогуле азначаюць лічбы. І тое, што мы чацьвертыя ў Вільні, будзе хваляваць нас ня больш, чым тое, напрыклад, што мы дванаццатыя ў Эўропе ці пяцідзесятыя ў сьвеце...



Здымак Алены Адамчык.

Зборка чысьціні беларускае мовы

Вяртаньне беларускага друку да колішняга правапісу ня сталася абвальным. Затое некалькі выданьняў, якія перайшлі з наркомаўкі на тарашкевіцу, ужо сьцьвердзілі трываласьць свайго намеру й натуральнасьць старога, «няспрошчанага» правапісу ў новыя часы. Гэта *Свабода*, *Бярозка*, *Наша Ніва*, пакуль часткова *Спадчына*. На другім годзе выхаду гэтых пэрыёдыкаў пазначыліся пэўныя разыходжаньні ў выкарыстаньні тарашкевіцы. Правапіс, які быў забаронены ў БССР у 1933 г., вымагае ўдасканаленьня. Вось жа дзеля таго, каб узгадніць пазыцыі, 14 чэрвеня ў памешканьні рэдакцыі *НН* у Вільні сабраліся карыстальнікі тарашкевіцы на рабочую нараду, якую вырашылі лічыць першай і традыцыйна называць «зборкай чысьціні беларускае мовы». У нарадзе ўзялі ўдзел апроч супрацоўнікаў *НН* (Л.Луцкевіч, С.Шупа, А.Мінкін, С.Дубавец ды іншыя), М.Клімковіч зь *Бярозкі* ды Вінцук Вячорка са *Спадчыны*.

ПАПРАЎКА

У мінулым нумары нашае газэты па тэхнічных прычынах адбылася прыкрая дэфармацыя тэксту эсэ Чэслава Мілаша «Старыя спрэчкі пра анклаў». З гэтае прычыны мы прыносім свае прабачэньні чытачам і ўзнаўляем дэфармаваны ўрывак (на стар. 7) у поўным выглядзе:

«Зрэшты, той самай воляй прадыктавана вынаходніцтва назвы Vilnius, хоць места ніколі не называлася так. У даўніх кроніках называецца Вільна альбо Вільня, ад ракі Вільны. Яшчэ Тарыба ўжывала назву Wilno».

Рэдакцыя.

Fratres strictioris observantiae

Алег Дзярновіч

У папярэднім нумары НН была гаворка пра францішканаў. А бэрнардыны — гэта пазьнейшае адгалінаваньне францішканаў, але ў пэўным сэнсе — прыхільнікі найбольш раньніх іхніх канонаў.



Аб'яднаныя жабрацтвам (дакладней — прынцыпам жабрацтва) францішканы ўтварылі своеасаблівае кола. Ня проста дзеля падтрымкі фізычнага йснаваньня, а дзеля актыўнай прысутнасьці ў духоўна-ідэалягічным і палітычным жыцьці тагачаснай Эўропы, ордэну неабходныя былі значныя матэрыяльныя сродкі. Абвяшчалася, што вярхоўным уладальнікам маёмасьці зьяўляецца папа, а францішканы толькі карыстаюцца гэтай маёмасьцю. У дамініканаў — законьнікаў яшчэ аднаго ордэну жабрацтва (*НН* №5) — Тамаш з Аквіну гэтую праблему вырашыў крыху йнакш, можа й рашучай: лічыце, што валодаеце ўсім. Але толькі дзеля таго, каб калі каму-небудзь спатрэбіцца тое, чым вы валодаеце, вы аддасьцё яму гэта — і не па вашай добрай волі, а па абавязку. Міласэрнасьць, а зусім не жабрацтва — галоўны прынцып сьвятога жыцьця. Папа Ян XXII увогуле настойваў на адмене прынцыпу жабрацтва. Галоўны тэзіс апазыцыянэраў, маўляў, Хрыстос ды апосталы не валодалі ніякай уласнасьцю (ні індывідуальнай, ні калектыўнай) быў абвешчаны ерасьсю. Сэнс дыскусіі ня ў тым, ці будзе касьцёл валодаць якім-небудзь палацам, ці не. Тэзіс пра жабрацтва Хрыстова можна з аднолькавым посьпехам даказаць альбо абвергнуць — Эвангельле тут не дае канкрэтнага адказу. Пытаньне ў іншым: ці мае права касьцёл дыктаваць сваю волю зямным уладарам.

Так францішканы пазначылі праблему валоданьня й карыстаньня. У спрэчцы былі выпрацаваныя два шляхі: зьмякчэньне фармулёвак прынцыпу ці яго кансэрвацыя. Бэрнардыны — тыя, хто абраў другі шлях.

Каб пазьбегнуць тэрміналягічнай блытаніны, заўважу, што ў Францыі ды Італіі бэрнардынаў называюць цыстэрыянцаў. У нашым жа рэгіёне — Сярэдне-Ўсходняй Эўропе — гэтая назва замацавалася за францішканамі-традыцыяналістамі.

Непасрэдна назоў ордэна зьвязаны з Бэрнардам Сіенскім (Bernhardinus Sennensis. 1388-1444), які аднавіў стара-францішканства*. Акрамя таго, Бэрнард быў адным з самых арыгінальных рэлігійных практыкаў сярэднявечча. Менавіта пры ім на Канстанцкім саборы 1415 г. правілы пачатковага францішканства былі пацьверджаныя — гэты час і можна лічыць пачаткам арганізацыйнага ўладкаваньня новага ордэну, якое завяршылася ў 1517 годзе, калі бэрнардынам было дазволена абрацьуласных кіраўнікоў ды аддзяліцца ад больш лібэральных, скажам так, братоў-францішканаў, якія зваліся канвэнтуаламі. Самыя ж бэрнардыны афіцыйна называюцца абсрвантамі — Fratres strictioris observantiae (варыянт перакладу — Брацтва шанаваньня суворасьці). І калі ў 14 ст. бэрнардыны, якія паходзілі пераважна з маламаёмасных слаёў, уцякалі ў пушчы, і там сярод вечнай прыроды аддаваліся супакаеньню, то пазьней яны ўжо дапамагалі Сьвятому пасаду ва ўсіх ягоных найважнейшых акцыях, адпраўляліся ў складзе пасольстваў у розныя краіны, адныя зь першых выступілі супраць ерэтызму. У нехрысьціянскіх краінах (найперш Індыі) пасьля езуітаў яны мелі найбольш знакамітых місыянэраў і пакутнікаў. Урэшце, праз выкладаньне тэалёгіі ва ўнівэрсытэтах яны падтрымалі славу вядомых дактароў-францішканаў.

Ідэалягічныя ўстаноўкі бэрнардынаў зрабілі іх досыць лібэральнымі ў грамадзкім жыцьці. Напрыклад, у жыцьці тагачаснае Беларусі.

У 1490 г. вялікі князь Аляксандар даў бэрнардынам прывілей на «месца пад сваім замкам у Полацку... дзеля ўзьвядзеньня касьцёла пад імем сьвятых Францішка ды Бэрнарда, кляштара й яго пабудоваў». У 1498 годзе місія ў драўляным канвэнце (прастакутні замак) пачала дзейнічаць. І менавіта полацкія бэрнардыны ахрысьцілі сына купца Скарыны, даўшы яму імя свайго патрона Сьв. Францішка. Бэрнардыны досыць талерантна ставіліся да праваслаўя, прызнавалі важнасьць і слушнасьць усіх праваслаўных таемстваў. І калі род Скарынаў перш быў праваслаўны, то невыпадкова іх рэбаптызацыя адбылася менавіта праз бэрнардынаў. Дзякуючы гэтаму, як лічыць прафэсар А.Мальдзіс, Францішак Скарына і быў сфармаваны як надканфэсыйны мысьляр.

А найпершым бэрнардынскім кляштарам у Вялікім Княстве быў Віленскі (1469), адкуль і прыехалі мніхі ў Полацак. Іншыя значныя кляштары й гады іх заснаваньня:

Горадня 1494	**Слуцак 1661**
Будслаў 1504	**Глуск 1662**
Нясьвіж 1594	**Віцебск 1676**
Заслаўе 1606	**Валожын 1681**
Трокі 1617	**Магілеў 1687**
Берасьце 1623	**Янаў 1700**
Менск 1624	**Юрэвічы 1700**
Слонім 1630	**Мазыр 1700**
Іўе 1631	**Беніца 1700**
Друя 1643	**Пінск 1717**
Сапежын 1653	**Мсьціслаў 1727**
Ворша 1653	**Бярэзіна 1737**

Бэрнардынкі мелі кляштары ў Вільні, Горадні, Слоніме, Менску, Берасьці.

Адсюль відаць, што бэрнардыны на Беларусі й Літве зьявіліся досыць рана, яшчэ да канчатковага зацьверджаньня закону. Але ў межах Вялікага Княства іхняя правінцыя на дзіва цяжка артымвала аўтаномію. Першая спроба падзелу на польскую ды літоўскую правінцыі адбылася ў 1530 г. У 1571 г. літоўская правінцыя касуецца. У тыя ж часы ў Вільню прыбывае Антоніа Стражыё, камісар ордэна Рэфарматараў (яшчэ аднаго адгалінаваньня францішканаў). Ён, як сьведчаць крыніцы, гвалтоўна змушаў бэрнардынаў да рэформы. Трымаючыся сваіх прынцыпаў, бэрнардыны Вялікага Княства яшчэ колькі разоў на працягу 17 ст. дамагаліся ўласнай правінцыі й столькі ж разоў гублялі яе. Толькі ў 1728 г. канчаткова ўсталёўвасцца літоўская правінцыя Сьв. Казімера — патрона Вялікага Княства. Першым правінцыялам быў Францішак Андрушкевіч.

18 ст. увогуле было кульмінацыйным пунктам разьвіцьця бэрнардынаў, калі на 1790 г. у сьвеце налічвалася 170 іхніх правінцый, а колькасьць кляштараў і законьнікаў не паддаецца падліку.

Наступнае, 19 стагодзьдзе стала для іх эпохай перасьледу. Паступова іх выцясьняюць зь Нямеччыны й Францыі, на нашай зямлі ордэн скасаваны ў 1864 г. Дата "стандартная", зьвязаная з агульнавядомымі падзеямі...

Але калі на вуліцы вы сустрэнеце манахаў у каптурох цёмна-шэрага колеру, а на рызе ў знак жабрацтва будзе шмат залатак, дык ведайце, што гэта й ёсьць бэрнардыны.

* Тэрмін «стара-францішканства» — досыць умоўны; для чалавека тае эпохі два стагодзьдзі зусім не былі глыбокай старажытнасьцю й не стваралі глыбокіх традыцый.

ЧОРНЫ ГРЫФ

«Вось сымбаль твой, забыты краю родны!»



Лётаць — прывілей птушак. Аж да Новае Зэлянды лётаюць галубы, вераб'і, вароны. З новазэляндзкіх птушак да нас ніхто не далятаў. А вось з Афрыкі прылятаюць грыфы — чорныя або шэрыя, або "мніхі" (Aegynius monachus).

Гэта дзіўная птушка. У будыстаў яна сьвятая. На Тыбэце яна дапамагае ў пахаваньні (ці як гэта лепей назваць?), бо мерцьвячына — яе галоўная ежа.

На Беларусі няма больш буйной драпежнай птушкі. Размах яе крылаў сягае 2,5 м. У даўжыню грыф мае каля мэтра, а вага яго 7-12 кг. Пер'е цёмна-бурае, амаль чорнае. На галаве і верхняй частцы шыі — толькі пляшывы пух, затое вакол шыі — шыкоўнае "боа" з бледна-бурага пер'я.

Гадзінамі высока-высока ў небе лунае гэтая велізарная птушка, цікуючы сабе пачастунку. Цяжка параўнаць з кім грыфа-санітара, ні з чым не параўнаеш ягоны палёт. А бачылі грыфа і на Цэнтральным Палесьсі, і ў Сеньненскім раёне, і нават у Менску, у 1928 годзе.

Калі-небудзь пабачыўшы ў небе вялікі чорны цень грацыёзнага грыфа, памятайце — гэта самы вялікі беларускі крылаты драпежнік, родам з Афрыкі.

S.H.

Што пішуць?

Пра НН:
(Мэва Марон з Брэкнэлу, Вялікабрытанія)

Гэты ліст у Рдакцыю *НН* перадаў Сп. С.Карніловіч з Амэрыкі: «Выбачайце, што пішу па-ангельску: я больш упэўнена адчуваю сябе ў польскай або ўкраінскай мове, чым у беларускай, але сябра зь Менску толькі што прыслаў мне трэці нумар *Нашае Нівы* — і я адразу адчула, што гэта часапіс для мяне! Мне спадабаўся Арлоў, багдановіцкія старонкі, штучка пра Дастаеўскага. Я пазнала Тугласа, якога чытала ў перакладах на эспэранта».

Пра Новую Культурную Сітуацыю:
(Сяржук Шыдлоўскі з Наваполацку)

Адноўленую Вамі Нашу Ніву я чытаю зь першага нумару. Фэерычная газэта! Ад яе ў мяне зьяўляецца настрой, які бывае перад навальніцай. Прадчуваньне нечага грандыёзнага, што ўжо блізка. А пяты нумар *НН* мяне нават натхніў, і плён гэтага натхненьня — развагі наконт Новай Культурнай Сітуацыі — я дасылаю Вам. «У княстве пчол — Вясна!» Я навапалачанін, мне 18 гадоў, вучуся ў БДУ на першым курсе гістфака.

Пра сьцягі:
(С.Квят зь Менску)

У Львове ёсьць Музэй нацыянальных сымбаляў народаў былога СССР. У Менску ёсьць Задзіночаньне Беларускіх Студэнтаў (ЗБС). У ЗБС ёсьць свой сымбаль — сьцяг: ва ўсю шырыню белага тла — чырвоны крыж. Збэсавец Сяржук Г. паехаў у Львоў на маладзёжную канфэрэнцыю й прадаў там сьцяг ЗБС за 50 рублёў, якія пасьпяхова прапіў (справа была да падвышэньня коштаў). Цяпер штандар ЗБС вісіць у Львоўскім Музэі. Нведнікі, як і супрацоўнікі Музэя, шчыра ўпэўненыя, што гэта — нацыянальны й дзяржаўны сьцяг Беларусі.

Пра Малітву за Беларусь:
(Эл. Мамачка з Баранавічаў)

Гэтая Малітва за Беларусь ня дзеліць людзей на канфэсіі, яна для ўсіх, хто пачувае сябе беларусам і жадае зьвяртацца да Бога на сваёй беларускай мове.

Малітва мае сваю гісторыю. 19 лютага 1989 году я была ў Менску на мітынгу, які арганізаваў БНФ. Вярталася дадому ў роздуме пра лёс Беларусі, а перад вачыма стаяў авал стадыёну «Дынама» і людзі, што пачыналі скідаць зь сябе "пантэру" страху. Думалася пра тое, як цяжка будзе нам адрадзіцца як народу ў гэтай Вандэі з Вандэй, і таму я прасіла аб дапамозе найвышэйшую й справядлівую сілу — Бога. Словы маёй просьбы складаліся не ў кананічную малітву, а адвольна, так, як калісьці малілася мая бабуля Вера.

У пачатку 1990 году сваю Малітву за Беларусь я перадала ў сям'ю амэрыканскіх беларусаў з просьбаю, каб там, у Амэрыцы, сьвятары баславілі й асьвяцілі яе. Надзеі на тое, каб хто-небудзь з праваслаўных бацюшкаў (сама я хрышчаная ў царкве) у нас на Беларусі ўспрыняў малітву па-беларуску тады яшчэ не было, асабліва ў нас, у Баранавічах. Тым больш я ўдзячная незнаёмым добрым людзям у далёкай Амэрыцы, якія выканалі маю просьбу.

Праз некаторы час малітва была прачытаная па радыё «Свабода», і, такім чынам, ужо ў тым жа 1990 годзе яна вярнулася на Беларусь. Восеньню таго ж году на першым набажэнстве па-беларуску ў касьцёле ў Баранавічах малітву прачытаў каталіцкі сьвятар айцец Гей. Прачытаў так, як яна й была складзеная. Зьмяніла я толькі словы "Крый нас, Божа, ад грэху халуйства" на словы "Крый нас, Усемагутны Божа, ад грэху прыніжэньня годнасьці Бацькаўшчыны нашай Беларусі й кожнага чалавека на зямлі яе".

Сапраўднага майго прозьвішча ня ведалі ні тыя, каму была перададзеная Малітва, ні на радыё «Свабода», бо падпісаная яна была псэўдонімам. Пад псэўдонімам яе прачыталі й па «Свабодзе».

МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

У імя Айца і Сына і Сьвятога Духа.

Божа Ўсемагутны, адхілі напасьці ад Бацькаўшчыны нашай Беларусі, дай краю волю на вякі вечныя, захавай зямлю плоднай, паветра чыстым, ваду здаровай, нетры непарушанымі, каб цешылася з ласкі Тваёй усё жывое: і чалавек, і птушка, і зьвер, і рыба, і малая кузурка.

Ойча Нябесны! Блаславі люд беларускі як у краі, так і далёка за яго межамі. Ня дай пазнаць варожага ўціску, вайны, голаду, мору, агню пякельнага, ратуй нас ад д'ябальскай сілы чарнобыльскай, несправядлівасьці, а таксама і ад брацкай нязгоды.

Блаславі на еднасьць і ўзаемадапамогу люд беларускі ў кожным месцы зямлі Тваёй, накіруй на шлях дабра і праўды, спагады да бліжніх нашых.

Дапамажы нам захаваць у сэрцах веру нашу і славіць Сьвятое Імя Тваё на мове нашай беларускай.

Дай спазнаць літасьць Тваю, даруй нам грахі нашы: злабу й гультайства, распушчэнства й зайздрасьць, а роўна ж і абыякавасьць да гора людзкога. Адвядзі ад нас спакусу здрады, нявернасьці, крывой прысягі.

Зрабі ясным розум люду нашага, дапамажы пазбыцца ад ідэй і слоў аблудных, ад учынкаў нялюдзкіх, што губяць душу й нясуць сорам і няволю краю нашаму. Крый нас, Усемагутны Божа, ад грэху прыніжэньня годнасьці Бацькаўшчыны нашай Беларусі й кожнага чалавека на зямлі яе.

Не карай нас бяспамяцтвам і ня дай забыцца мовы нашай беларускай, гісторыі, традыцыяў, а дай сілы й шчырасьці зь любоўю й шанаваньнем адраджаць і прымнажаць спрадвечнае й высакароднае, што стварылі для нас продкі нашыя.

Божа Літасьцівы! Пашлі народу нашаму моц і цярпеньне ў стараньнях яго аб росквіце Бацькаўшчыны нашай Беларусі, захавай яе нам на вякі вечныя. Аман.

Кароткія віленскія беларускія навіны:

З другога паўгодзьдзя тысячы сталых падпісчыкаў на Віленшчыне ня будуць атрымліваць пэрыядычныя выданьні зь Менску, бо Міністэрства Інфармацыі РБ не пераслала ў Вільню свае каталёгі.

Удвая, да 10 хвілінаў у тыдзень скарочаная Беларуская перадача на Летувіскай Тэлевізіі. Кажуць, што толькі на летні час.

У Каардынацыйную Раду Беларускіх Згуртаваньняў Віленшчыны ўвайшлі таксама суполкі з Салечнікаў і Падбродзьдзя. Рада выказала пратэст сўраць скарачэньня тэлеперадачы й занепакоенасьць намерам уладаў закрыць мяжу Летувы й Беларусі.

На беларускі факультэт Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту сёлета здаюць іспыты 14 паступленцаў. Цяпераканцэ ў гэтым унівэрсытэце будуць ужо два беларускія курсы. Шмат паступленцаў — з Салечнікаў.

Магчыма, неўзабаве ў Вільні пачне выходзіць яшчэ адна беларуская газэта. Яна будзе прысьвечаная жыцьцю Вільні і Віленскага краю.



На Росах, на Літарацкай горцы ўстаноўлены помнік на магіле Францішка Аляхновіча. Помнік зрабіў віленскі скульптар Эдвард Падбярэзскі. На здымку ён справа, зьлева — старшыня Таварыства Беларускай Культуры Хведар Нюнька.

Заява Каардынацыйнае Рады

Каардынацыйная Рада беларускіх згуртаваньняў Віленшчыны накіравала ў Вяхоўныя Саветы Беларусі й Летувы заяву, у якой выказваецца занепакоенасьць намерам ўладаў Рэспублікі Беларусі й Летувіскае Рэспублікі закрыць мяжу паміж дзьвюма дзяржавамі.

Пра такі намер, — сказана ў заяве, — сьведчаць выказваньні афіцыйных асобаў, публікацыі друку й рэальныя захады ўладаў: уведзены памежны кантроль, у тым ліку для жыхароў памежжа, плянуецца візавы рэжым пераезду праз мяжу; ненатуральна завышаныя тарыфы на паслугі сувязі; стаў немагчымы жыльлёвы абмен паміж гарадамі Віленшчыны й РБ і г.д. Няўжо трэба было вызваляцца ад ізаляцыянісцкага камуністычнага рэжыму дзеля таго, каб узьвесьці новую заслону там, дзе яе ніколі не было?!

Паміж Віленшчынай і Беларусяй сапраўды ніколі ў гісторыі не было мяжы. І тая заслона, якую ўлады ствараюць сёньня — гэта зусім новая гістарычная рэалія, скіраваная на абмежаваньне правоў чалавека, штучны падзел традыцыйнага этна-культурнага рэгіёну, далейшае адчужэньне Вільні, як гістарычнага і духоўнага цэнтру ад беларускага народу.

Тая заслона, якую ва ўгоду палітычнай кан'юнктуры будуюць паміж беларусамі Віленшчыны й беларусамі Рэспублікі Беларусі, ператварае дзесяткі тысяч карэнных жыхароў Віленшчыны беларускае нацыянальнасьці й тысячы летувісаў Беларусі ў прышлых людзей на ўласнай зямлі. Тым самым улады РБ здымаюць зь сябе адказнасьць за лёс гэтага насельніцтва, за будучыню беларускага нацыянальнага адраджэньня, якое бязь Вільні як духоўнага фактару — мала рэальнае. А ўлады Летувы праз новыя законы аб грамадзянстве й эміграцыі замацоўваюць за віленскімі беларусамі статус эмігрантаў.

Мы вымушаныя нагадаць, што беларусы спрадвеку жывуць на Віленшчыне, яны будавалі Вільню, баранілі яе ад захопнікаў. Тут выйшлі з друку першыя беларускія кнігі, тут старабеларуская мова стала дзяржаўнай мовай Вялікага княства Літоўскага, тут жылі, змагаліся й загінулі кіраўнікі паўстаньня 1863 г., тут пачалося наша нацыянальнае адраджэньне XX ст., зьвязанае зь імёнамі Купалы, Коласа, Багдановіча, з выданьнем газэты Наша Ніва, на падставе віленскіх беларускіх гаворак стварыў першую граматыку нашай мовы Б.Тарашкевіч. Тут і дагэтуль жыве беларуская мова, беларускі фальклёр. І гэта нягледзячы на тое, што за гады польскага панаваньня й савецкай Летувы былі зьнішчаныя ўсе віленскія беларускія арганізацыі і ўстановы, школы, музэй, друк, уся віленская беларуская інтэлігенцыя. 50 гадоў віленская беларушчына ведала адно прыніжэньне, зьнішчэньне й заняпад. Новая заслона на мяжы з Беларусьсю стане давяршэньнем палітыкі, скіраванай на поўную пагібель беларушчыны ў Віленскім краі.

У зьвязку з гэтым Каардынацыйная рада беларускіх згуртаваньняў Віленшчыны патрабуе ад Вярхоўных Саветаў Беларусі й Летувы знайсьці магчымасьць ажыцьцяўляць дзяржаўныя інтарэсы, не разрываючы вякамі зьнітаваныя лёсы людзей і народаў.

Асацыяцыя Фундатараў

Мабыць, няблага пачувалася калісьці беларуская культура пад апекай фэадалаў-мэцэнатаў Якуба Бабіча ці Льва Сапегі. Ня горш ёй было й тады, калі ў Вільні, Берасьці, Любчы, Нясьвіжы, Слуцку, Навагардку, Заслаўі, Узьдзе на содкі мясцовых князёў ды магнатаў існавалі культурныя цэнтры: працавалі друкарні й школы, тэатры й бібліятэкі.



Розныя былі часы...

Сёньня нацыянальная культура нібыта й абуджаецца, але... Ці ж можна чакаць абуджэньня культурнага жыцьця, калі ў эканоміцы — разлад і нэндза?

Як ні ўніфікаваўся й дазаваўся духоўны пажытак у камуністычныя часы, але ён быў гварантаваны афіцыйнай разьмекавальнай сыстэмай. Цяпер жа ні матэрыяльных, ні духоўных разьмеркавальнікаў няма. Ёсьць стыхія, у якой кожны сам шукае сабе пракорму. І спаміж іншых тут — беларуская культура...

Вядома, доўга так трываць ня можа. Вось чаму прадстаўнікі творчае інтэлігенцыі нашай краіны аб'ядналіся ў намаганьні здабываць сродкі дзеля фундацыі розных культурных парэктаў.

Яны зьвярнуліся да мэцэнатаў з прапановай скаардынаваць ды актывізаваць іхнюю дабрачынную дзейнасьць — аб'яднацца ў Асацыяцыю мэцэнатаў і спонсараў Беларусі (АМіС).

Нядаўна ў Менску адбыўся першы сход ініцыятараў АМіС. Неўзабаве адбудзецца і ўстаноўчы зьезд.

Калі ў вас ёсьць жаданьне й сродкі на тое, каб спрычыніцца да фундатарскай дзейнасьці, тэлефануйце ў Менску: 27-54-42.

М.Т.

Згода ў Гервятах

19-20 чэрвеня у Гярвятах Астравецкага раёну адбылася сустрэча гісторыкаў Беларусі й Летувы.

Удзельнікі абмяркоўвалі праблемныя пытаньні гісторыі й мэтадалёгіі дасьледваньня Вялікага Княства Літоўскага з мэтай вызначыць агульныя падыходы да некаторых прынцыповых палажэньняў. Удзельнікі, узгадніўшы пазыцыі, зьвярнулі ўвагу на такі мэтадалягічны фактар, як супольнасьць дзяржаўнасьці, дзяржаўнай сьвядомасьці, дзяржаўных інтарэсаў і грамадзянскай мэнтальнасьці ў ВКЛ. Гэты фэномэн зьяўляецца бясспрэчнай падставай навуковых падыходаў да вывучэньня спадчыны ВКЛ.

Была адзначаная культуралягічная й палітычная ўнікальнасьць супольнай балта-славянскай дзяржавы, яе арганізацыйна-палітычнае адзінства.

Удзельнікі лічаць непрадуктыўным мэханічны перанос сучасных нацыянальных уяўленьняў на дачыненьні палітычных сілаў і тэндэнцыяў у ВКЛ. Патрэбы гістарычнай навукі і йснаваньне дзьвюх сувэрэнных дзяжаваў — Рэспублікі Беларусі й Летувіскай Рэспублікі — прамых спадкаемцаў гісторыі ВКЛ — вымагаюць раскрыцьця сутнасьці супольнага дзяржаўнага ўтварэньня, якое можна вызначыць зь сёньняшняга гледзішча як летувіска-беларускую або — раўназначна — беларуска-летувіскую дзяржаву, улічваючы пры гэтым важкі ўклад, які ў палітычнае й культурнае разьвіцьцё ВКЛ працяглы час уносіў украінскі народ.

Палажэньні гісторыяграфічных канцэпцыяў, якія вынікаюць з палітычных меркаваньняў «трэціх сілаў» і тэндэнцыйных ацэнак гісторыі ВКЛ, непрыймальнае з навуковага пункту погляду.

Будучыня беларускага й летувіскага народаў і нашых дзяржаваў неадлучныя ад раскрыцьця й аб'ектыўнай ацэнкі нашай мінуўшчыны.

* * *

Вырашана стварыць двухбаковую камісію гісторыкаў Летувы й Беларусі для вызначэньня формаў далейшага супрацоўніцтва й ажыцьцяўленьня канкрэтных прапановаў.

НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ,



Паводле аналёгіі гээты тэкст
можна было б назваць
Прадмовай да
«Дудкі Францускай».
Дастаткова прыгадаць словы
Францішка Багушэвіча
«аб нашай бацькавай
спрадвечнай мове,
ды й не адны мы,
а ўсе людзі цёмныя
“мужыцкай” завуць,
а завецца яна “беларускай”»,
якая ёсьць такая ж людзкая
й панская, як і француская,
албо нямецкая,
альбо й іншая якая», —
і аналёгія адазу
набудзе сэнс.
Кожны народ
раней ці пазьней
бараніў ды ўслаўляў
сваю “мужыцкую” мову
ці ня тымі самымі
словамі й довадамі,
з тым самым пачуцьцём.

Твор францускага клясыка Жаашэна Дзюбэле «Абарона і ўслаўленьне францускае мовы» напісаны ў 1549 годзе. Тэкст, які мы друкуем, узяты зь Першае кнігі.

Жаашэн Дзюбэле

Разьдзел I

Пра паходжаньне моваў

Каб прырода — пра якую адзін зь вялікіх сказаў, што яшчэ не вядома, ці трэба называць яе маткай ці мачахай, — падарыла людзям агульную волю й згоду, а разам зь імі — тыя незьлічоныя выгоды, якія зь іх вынікаюць, дык чалавечая нясталасьць ня мусіла б выдумляць столькі розных манэраў гаворкі. Бо цяперашнюю іх разнастайнасьць і перамяшанасьць напраўду можна назваць Бабілёнскаю Вежай. Але мовы ня ўзьніклі й не ўзрасьлі самі сабою — так, як травы, карані ці дрэвы: адныя недалужнымі й безгаловымі, другія здаровымі й дужымі дый болей здольнымі выкласьці сутнасьць чалавечых паняцьцяў, — усе іх добрыя якасьці нарадзіліся з волі й жаданьня звычайных сьмяротных людзей. І гэта здаецца мне сур'ёзнай падставай, каб не дазваляць нам занадта расхвальваць адну мову й ганьбаваць другую, бо ва ўсіх у іх аднолькавае паходжаньне й адна крыніца — чалавечае ўяўленьне, і ўсе яны ўзьнікаюць з аднолькавага ўспрыйманьня ды служаць аднолькавым мэтам: выяўляць паняцьці й высновы розуму. З часам, праўда, адныя, зь якімі абыходзіліся больш рупліва й дбайна, зрабіліся багацейшымі за іншыя; але гэта не павінна прыпісвацца нейкай абранасьці саміх гэтых моваў, а вытлумачвацца толькі ўмельствам і майстэрствам людзей. Так — усё створанае прыродай, усе мастацтвы й навукі — паўсюль тыя самыя на ўсіх чатырох краёх сьвету, але людзі ў кожным месцы надзеленыя рознай воляю, то й гавораць яны, і пішуць пра іх па-featureрознаму. У сувязі з гэтым я не магу надта ўжо абурацца — за іх бязглуздую фанабэрыю й нахабную неразумнасьць — на тых сваіх суайчыньнікаў, якія, зусім ня будучы грэкамі ці лацінянамі, тым ня менш з такою стаічнай упартасьцю пагарджаюць і адкідаюць, не міргнуўшы вокам, усё напісанае па-француску; як не магу я й не зьдзіўляцца тым навукоўцам, якія лічаць, што нашая мужыцкая мова ня здольная да прыгожага пісьменства й інтэлектуальных трактатаў — нібыта пра вынаходніцтва трэба меркаваць, добрае яно ці благое, толькі ў залежнасьці ад мовы, на якой яно апісанае. Першым я ня буду кідаць пальчаткі. Другіх жа, калі здолею, хацеў бы пераканаць з дапамогаю некалькіх кароткіх заўвагаў — не таму, што я ў гэтым больш за іх дасьведчаны, а таму толькі, што іхняя занадта вялікая пашана да чужых моваў не дазваляе ім цьвяроза й ясна зірнуць на іхнюю родную — “мужыцкую”.

Разьдзел II

Чаму француская мова не павінна называцца варварскаю

Каб пачаць непасрэдны разгляд сутнасьці нашага пытаньня, высьветлім, адкуль узялося само гэтае слова: “варвар”. Варварамі ў даўніну называлі тых, хто няправільна размаўляў па-грэцку. З таго часу грэкі пачалі азначаць гэтым словам усе грубыя й жорсткія звычаі, называючы ўсе народы па-за межамі Грэцыі варварамі. Вядома, гэта ніякім чынам не павінна памяншаць чароўнасьці нашае мовы, бо тая напышлівасьць, зь якою грэкі захапляліся толькі сваімі дасягненьнямі, ня ў праве й ня ў сіле ўзвысіць іх нацыю й прынізіць усе астатнія, пра што сьведчыць Анахазіс, які казаў, што калі скіфы й лічацца варварамі сярод атэнцаў, дык і атэнцы лічацца такімі ж у скіфаў. І калі дапусьціць, што варварскія звычаі нашых продкаў паслужылі грэкам падставай называць нас варварамі, то я зусім ня бачу прычыны, чаму нас павінны лічыць такімі цяпер. Бо й цывілізаванасьцю нашых нораваў, і справядлівасьцю законаў, і сваёй вялікадушнасьцю, карацей — усімі формамі й праявамі жыцьця, якія могуць быць вартыя ўхвалы й прыносіць карысьць, мы нічым ня горшыя за іх, а нават і лепшыя, бо цяпер яны самі такія, што мы маглі б сапраўды называць іх тым імем, якое яны далі некалі іншым. Яшчэ меншыя падставы называць нас варварамі былі ў рымлянаў, якія, імкнучыся ня толькі падпарадкаваць, але й прынізіць і зьбэсьціць усе іншыя народы, — якраз ад галаў болей, чым ад іншых, дасталі сабе ганьбы ды стратаў. У сувязі з гэтым я — часта разважаючы, чаму гэтак выходзіць, што подзьвігі й дзеі народу Рымскай Імпэрыі й цяпер, пасьля стольківх стагодзьдзяў, так шырока шануюць ва ўсім сьвеце, аддаючы ім перавагу перад слаўнымі ўчынкамі ўсіх іншых народаў разам узятых, — я знаходжу гэтаму толькі адну прычыну: рэч у тым, што рымляне мелі столькі пісьменьнікаў, што большасьць іхніх дзеяў і подзьвігаў (калі не сказаць — усе), іх гарачыя бітвы й спусташэньні бязьмежных італійскіх прастораў ад набегаў чужынцаў — усё гэта было захавана імі й дайшло да нас праз доўгую чараду гадоў. Што да слаўных учынкаў іншых народаў — і ў прыватнасьці, галаў (да таго, як яны трапілі пад уладу франкаў), дый саміх франкаў (пасьля таго нават, як яны падарылі сваё імя галам), — дык усё гэта настолькі кепска зьбіралася й захоўвалася нашымі продкамі, што цяпер мы ня толькі забыліся пра іх славу, але і ўвогуле страцілі ўсякі ўспамін. Нямала гэтаму пасобіла й зайздрасьць рымлянаў, якія, нібы са злой волі, змовіўшыся супраць нас, імкнуліся, у чым толькі маглі, прынізіць нашыя ратныя посьпехі, бляск якіх не даваў ім спакою; і гэтым яны прынесьлі нам ня толькі вялікую шкоду, але й, каб выставіць наш народ яшчэ больш брыдкім і нікчэмным, называлі нас грубымі й нікчэмнымі варварамі. Сёй-той скажа: чаму ж яны не далі такой самай мянушкі грэкам? Ды таму, што сабе яны гэтым нанесьлі б яшчэ большую шкоду, чым грэкам, бо менавіта ад іх запазычылі ўсё, што было ў іх лепшага, прынамсі ў дачыненьні да навук і ўслаўленьня іх мовы ў прыгожым пісьменстве. Гэтых разваг, я думаю, дастаткова, каб кожнаму бесстаронняму чытачу, які хоча шчыра разабрацца ў сутнасьці нашай гаворкі, зрабілася ясна, што нашая мова — якую называюць варварскай нашыя ворагі ці тыя, хто ўвогуле ня мае ніякага права называць яе так — не павінна быць, тым ня менш, пагарджаная, асабліва тымі, каму яна родная й падораная прыродай і хто ні ў чым ня горшы за грэкаў ці рымлянаў.

Разьдзел III

Чаму француская мова не такая багатая, як грэцкая ці лацінская

Калі нашая мова ў параўнаньні з грэцкай ці лацінскай не такая шчодрая й багатая, то гэта ня можа прыпісвацца нейкай яе заганнасьці — нібыта яна сама па сабе асуджаная вечна быць беднаю й бясплённай, — перадусім гэта

Рэквіем па нясьвіскім сале

Уладзімер Арлоў

Адам Міцкевіч страшэнна (яшчэ больш, чым Гётэ — сабак і часныку) не любіў гарадоў, не пазначаных на мапах. Гораду, куды ты едзеш, нялюбасьць аўтара “Дзядоў” ніколі не пагражала. Гэты горад — Кракаў.

Калісьці за кухлем кракаўскага піва адзін твой знаёмы выпускнік тамтэйшага ўнівэрсытэту разважаў пра тое, што “понеже от прироження звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя...” Цяпер у Кракаве жыве твой знаёмы рэжысэр Кшыштаф, які паставіў у вас у Менску спэктакаль пра вар'ята й манашку і, калі захопленая публіка запатрабавала яго на сцэну, выйшаў басанож, бо ніколі не дазваляў сабе зьневажаць сцэну чаравікамі. А яшчэ ў Кракаве жыве беларускі гісторык Алег, які знайшоў там магілу Алеся Гаруна. Табе здаецца, што ў Кракаве ўсе людзі такія, як Алег і Кшыштаф. Але тры пляшкі нашай новай сувярэннай гарэлкі “Белая Русь” (адна законная й дзьве кантрабандныя), што ляжаць у цябе ў валізе, ты вып'еш не са сваімі знаёмымі. Ты зусім ня будзеш іх піць.

Ты ня будзеш піць “Белую Русь”, бо ў Кракаве ёсьць Мар'яцкі касьцёл. Некалі татарская страла зрэзала зь ягонае вежы дазорцу, што затрубіў, каб папярэдзіць места пра варожы напад. На памятку пра гэта на вежы штогадзіны граюць трубачы-гейналістыя.

Упершыню за 600 гадоў яны маўчалі тае начы, калі на вежу залез беларускі пісьменьнік Уладзімер Караткевіч. Ты спадзяесься, што сярод гейналістых і сёньня няма непітушчых. Гэтым разам пад акампаніямэнт храпу гейналістых начны Кракаў (з тае прычыны, што гімну ў Рэспубліцы Беларусі дасюль няма) пачуе, як «Саўка ды Грышка ладзілі дуду». Магчыма, гэта здарыцца ўжо заўтра.

А пакуль ваш аўтобус пад'яжджае да памежнага берасьцейскага пераходу за Варшаўскім мостам. У вас у кішэнях ляжаць запрашэньні на сэмінар па гісторыі Рэчы Паспалітай, факсы й камандыровачныя пасьведчаньні... Гейналістым ужо, напэўна, сьніцца Беларусь... Аўтобус заколыхвае, і вакол цябе таксама тчэцца вопрадзень сьненьня. Ад думак пра сярэднявечнага гейналістага ў сон лезуць раскосыя твары, якія чамусьці просяць даляраў... Тарганууўшыся, аўтобус спыняецца, і ты адплюшчваеш вочы. За вакном гараць у цемрыве вогнішчы, нешта булькоча ў задымленых саганах, бегаюць па смуглявых абліччах агнёвыя водсьветы. На мяжы явы й сьненьня табе здаецца, што ты глядзіш сон далей, што гэта ідуць на Кракаў праз Варшаўскі мост татара-мангольскія захопнікі. Праўда немаведама чаму татары гамоняць па-расейску й нецьвярозымі галасамі пяюць задушэўныя расейскія песьні пра “ой, мороз-мороз”. Прыемнае каларатурнае сапрана каля суседняга вогнішча выводзіць: «А вот намедни на крючок поймал русалку. Я это помню, это было, как вчера. Крючок я бросил, бросил леску, бросил палку, А что словил? Да только три пера».

Як на сон, дык гучыць занадта саўкова, і ты прачынаесься. Ад Варшаўскага мосту, губляючыся ў бяззорнай цямрэчы, цягнецца бясконцая гірлянда агнёў. Сонныя гейналістыя трывожна пераварочваюцца на другі бок, а ты змагаесься зь нядобрымі прадчуваньнямі й таксама клічаш на дапамогу Марфэя. Там, у сьне, паміж аўтобусамі шнуруюць баскакі. Да хвастоў іхніх калматых конікаў прывязаныя берасьцейскія аўтамабільныя нумары, а на гнедых баках выведзена: «Милиция». З машынай-міргалкаю наперадзе ў бок мяжы паважна праходзіць караван сланоў і вярблюдаў, і за кадрам хтосьці тлумачыць, што гэта адбывае з афіцыйным візытам спадар прэм'ер...

Раніцою ты ачынаесься пасярод голага поля. У рэдкім туманцы ў далечыню ад застаўленай аўтобусамі да самага далягляду шашы брыдуць ланцужкі людзей. Відовішча нагадвае кадры ваенных кінафільмаў: партызаны ідуць з заданьнем на “жалезку”. Нават няўзброеным вокам відаць, што й бяз ранішніх дывэрсантаў поле замініравана так надзейна, што ніякай арганікі яму да XXI стагодзьдзя не спатрэбіцца.

У вадрозьненьне ад уторкнутых берасьцейскімі дойлідамі ў сьмярдзючыя лужыны трох “шпакоўняў” (плюс адна калёнка з вадою) на шэсьць кілямэтраў аўтачаргі, сьмецьцевых бачкоў у нашай незалежнай краіне пакуль што хапае.

Бачкі ледзь не штохвіліны правяраюць абходчыкі зь ёмістымі торбамі. У аднаго на торбе партрэт Міхаіла Сяргеевіча з падмаляванымі гітлераўскімі вусікамі, у другога — лёзунг: «СССР — оплот мира». Часам паміж абходчыкамі ўсчынаецца двубой за пустую пляшку.

Значна спакайнейшая й выгаднейшая іншая прымежная прафэсія — гандаль месцам у чарзе.

ФРАНЦУСКАЙ!..

мусіць тлумачыцца цемнатой нашых продкаў, якія, маючы ў большай пашане высокія ўчынкі, чымся высокія словы (як пісаў нехта, гаворачы пра старажытных рымлянаў) і лічачы за лепшае пакінуць нашчадкам узор дабрадзейнасьці, а не настаўленьні, пазбавілі сябе славы сваіх высокіх учынкаў, а нас — магчымасьці насьледаваць ім і тым самым пакінулі нам нашую мову такою беднай і голай, што цяпер ёй даводзіцца прыбірацца, пазычаючы — калі так можна сказаць — пёры ў іншых. Але ці знойдзецца ахвотнік сьцьвярджаць, што грэцкая й лацінская мовы заўсёды былі ў тым бляску, якога дасягнулі пры Гамэры й Дэмастэне, Вэргіліі й Цыцэроне? Калі б гэтыя аўтары меркавалі, што ўсе іхнія стараньні і ўся культура ўсё адно ніколі не прынясуць такога багатага плёну, ці ж высільваліся б яны, каб падняць свае мовы на тую вышыню, на якой мы іх бачым цяпер? Тое самае можна сказаць і пра нашую мову, якая толькі пачынае распускаць свае кветкі, але не прыносіць пакуль пладоў, ці, праўдзівей, нагадвае яшчэ кволы парастак тае расьліны, якая нават не расквітнела й далёкая ад таго, каб спарадзіць свой плод, на які яна здольная. І так яно зусім не праз заганнасьць нашае мовы, здольнай прыносіць плён, як любая іншая, а зь віны тых, хто мусіў за ёй даглядаць, ды не ўзгадаваў як сьлед, хто кінуў яе дзічэць у пустэчы, дзе яна ўзьнікла, і ні разу яе не паліў, не абрэзаў лішніх галінак, не абараніў ад калючак і церня, што кідалі на яе цень, хто занядбаў яе да таго, што яна ўся счэзла і ці не памерла. Калі б старажытныя рымляне з такой абыякавасьцю паставіліся да ўзрошчваньня свае мовы, калі яна толькі пачынала дужэць, — яна ніколі так хутка не дасягнула б такога росквіту. Але ж яны, як добрыя земляробы, перасадзіўшы яе спачатку зь дзікага поля на ўрадлівую глебу, акружылі яе добрым клопатам і, каб яна хутчэй прынесла найлепшы плён, абразалі на ёй непатрэбныя адгалінаваньні ды прышчаплялі добрыя й карысныя, пазычаючы іх галоўным чынам у грэкаў. Вось адкуль у лацінскай мове нарадзілася ўся тая безьліч разнастайных, рознакаляровых пладоў і кветак, славутае красамоўства й слаўнае майстэрства, на якія — не з адной толькі прыроды сваёй, але праз адмысловы догляд — здольная кожная мова. Калі ж нават рымляне й грэкі, якія даглядалі за сваімі мовамі больш рупліва, чым мы за сваёй, здолелі толькі празь вялікую стараннасьць і працавітасьць дасягнуць такой іх зграбнасьці, багацьця і, урэшце, красамоўства, то ці павінныя мы зьдзіўляцца, што нашая, мужыцкая — не такая багатая, якою можа быць, і праз адно гэта пагарджаць ёю, як нечым брыдкім і безгустоўным. Яшчэ, можа, настане час, калі, я спадзяюся, праз ласку й прыхільнасьць лёсу нашае магутнае каралеўства ўзвысіцца сваёй высакароднасьцю па-над астатнімі, і мова нашая (якой воляю караля Францыска не было дадзена згінуць дазваньня) — мова, якая яшчэ толькі пачынае пускаць карані, зьявіцца з-пад зямлі й дасягне такое велічы й вышыні, што здолее зраўняцца з грэцкай і лацінскай, як і яны, спарадзіўшы сваіх гамэраў, дэмастэнаў, вэргіліяў і цыцэронаў, — так, як некалі з францускае зямлі выйшлі свае пэрыклы, ніцыі, альківіяды, тэмістоклі, цэзары й сцыпіёны.

Разьдзел IV

Пра тое, што француская мова не такая бедная, як шмат хто мяркуе

Разам з тым я не лічу нашую мужыцкую мову — нават у цяперашнім яе стане — брыдкай і нізкай, як гэта робяць нашыя фанабэрыстыя прыхільнікі грэцкай ды лацінскай, якія мяркуюць, што нават будучы самою Пітыяй, багіняю пераканаўньня, ня здолелі б сказаць нічога добрага пра напісанае мовай мужыцкаю, а не якой замежнай. Калі ж у каго ўзьнікне шчырае жаданьне зірнуць на нашую мужыцкую мову бліжэй, ён адразу заўважыць, што яна зусім не такая ўжо бедная, каб не змагчы правільна й дакладна перадаць перакладзенае на яе зь іншых, і не такая бясплённая, каб ня здолець самастойна спарадзіць на сьвет які высакародны твор, дзякуючы майстэрству й руплівасьці сваіх даглядчыкаў — балазе яшчэ знойдуцца такія сябры свайму краю й сабе, у якіх ня зьнікла ахвота ёю карыстацца. І доказам гэтаму — тое, што многія грэцкія й лацінскія філёзафы, гісторыкі, мэдыкі, паэты й прамоўцы цяпер навучыліся гаварыць па-француску. Я ня буду абмяркоўваць тут малапісьменныя довады тых, хто сьцьвяджае, што таямніц тэалёгіі, маўляў, нельга раскрываць, бо пераклад на мужыцкую мову іх ці не апаганьвае, як і ня буду прыводзіць думкі іх апанэнтаў. Гэтая спрэчка не датычыць сутнасьці нашай гаворкі, мэта ў якой адна — паказаць, што пры сваім нараджэньні нашая мова зусім не была пад уладаю нейкіх варожых зор ці багоў, якія нібыта пажадалі, каб яна ніколі ня здолела дасягнуць роўнай зь іншымі бездакорнасьці й дасканаласьці, а наадварот — што на ёй могуць быць дакладна й поўна выкладзеныя любыя навукі, як гэта відаць зь незьлічоных кніг, перакладзеных на францускую мову шматлікімі майстрамі пяра, нашымі сучасьнікамі, ня толькі з грэцкай і лацінскай моваў, але й зь італійскай, гішпанскай ды іншых.

Разьдзел V

Чаму адных перакладаў мала, каб давесьці францускую мову да дасканаласьці

І ўсё ж я ня думаю, што адной перакладчыцкай працы, якою б пачэснаю яна ні была, будзе дастаткова, каб паставіць нашу мужыцкую мову ўпоравень з найбольш славутымі й зрабіць зь яе ўзор для іншых. Усе найлепшыя знаўцы рэторыкі пагаджаюцца, што красамоўства складаецца зь пяці частак: вынаходлівасьці думкі, лёгкасьці маўленьня, адмысловае схільнасьці да прадмету, памяці й вымаўленьня. Паколькі дзьве апошнія якасьці ня столькі вывучаюцца дзякуючы мовам, як даюцца ласкаю прыроды, а потым разьвіваюцца і ўмацоўваюцца руплівасю працай і безупыннай стараннасьцю, і паколькі адмысловая схільнасьць абапіраецца ў большай ступені на цьвярозасьць і яснасьць мысьленьня прамоўцы, чым на пэўныя настаўленьні й правілы, а таксама ўлічваючы, што разнастайнасьць падзей, абставін, умоваў і выпадкаў у часе, прасторы й грамадзтве немагчыма ахапіць, я абмяжуюся тым, што павяду гаворку толькі пра дзьве першыя якасьці, а менавіта вынаходлівасьць і лёгкасьць.

Як вядома, абавязак кожнага прамоўцы — зграбна й разгорнута гаварыць на любую прапанаваную тэму. І такая здольнасьць гаварыць на любую тэму можа быць набытая толькі праз дасканалае веданьне навукаў, здаўна распрацаваных рымлянамі, якія таксама былі імітатарамі сваіх папярэднікаў. Такім чынам, кожны, хто хоча набыць такую ж багатую вынаходлівасьць думкі, якая ёсьць першым і найгалоўнейшым інструмэнтам прамоўцы, павінен абавязкова пазнаёміцца з гэтым на абедзьвюх старажытных мовах. І тут верныя перакладчыкі могуць быць у вялікай прыгодзе, дапамагаючы тым, хто не валодае настолькі неацэннаю здольнасьцю чытаць на замежных мовах. Што ж да лёгкасьці маўленьня, безумоўна, найбольш цяжкай з усіх частак, зь якіх складаецца красамоўства, безь якой усё астатняе застаецца марным і нагадвае меч, ня выняты з похваў, — той лёгкасьці, паводле якой, галоўным чынам, і ацэньваецца майстэрства прамоўцы і ягоная здольнасьць гаварыць лепш за іншых, якая, уласна, і называецца самім красамоўствам і галоўная якасьць якой заключаецца ў словах, ужываных зазвычай, а не чужых нармальнай мове, у мэтафарах, алегорыях, параўнаньнях, прыпадабненьнях, адушаўленьні нежывых рэчаў і столькіх іншых прыёмах і спосабах, безь якіх прамова й верш застаюцца голыя, бедныя й лядашчыя, — то я ніколі не паверу, што ўсяму гэтаму можна навучыцца ў перакладчыкаў з той простай прычыны, што перадаць гэта з такой самаю натуральнай зграбнасьцю, як гэта зроблена аўтарам, немагчыма, паколькі кожная мова мае нешта няўлоўнае, нешта ўласьцівае толькі ёй, і калі вы паспрабуеце выказаць гэтую няўлоўную сутнасьць на іншай мове па ўсіх правілах перакладу, якія прадпісваюць не выходзіць за межы, акрэсьленыя аўтарам, то вашыя фразы будуць змушаныя, халодныя й нязграбныя. І каб запэўніцца, што гэта так, пачытайце Дэмастэна й Гамэра на лаціне, Цыцэрона й Вэргілія па-француску, і паглядзіце, ці выклікаюць яны ў вас, — нават пераўвасобіўшыся, як той Пратэй, у самыя розныя формы, — такія ж пачуцьці, якія ўзьнікаюць, калі вы чытаеце гэтых аўтараў на іх родных мовах. Вам падасца, што з распаленай вяршыні Этны вы перанесьліся на халодныя сьпічакі Каўказа.

Вось сьцісла прычыны, якія прымушаюць мяне меркаваць, што працы й стараннасьці перакладчыкаў, якімі б карыснымі яны ні былі для навучаньня тых, хто не валодае замежнымі мовамі, — усё ж мала, каб давесьці нашую мову да дасканаласьці й даць ёй той апошні й настолькі жаданы мазок, якім мастакі завяршаюць свой твор.

Пераклаў з францускае З.К.

Адзін аўтобус каштуе сто рублёў, а аўтобусаў тут недзе пад паўтысячы. За дзень прапускаюць штук трыццаць-сорак. Кажуць, што праблему здымаюць 500 "зялёных", але ў вас іх ненашмат болей, чым "фанэрных" ва ўдавы філіпінскага прэзідэнта Маркаса. Таму вы мітусіцеся паблізу шлягбаўма са сваімі паперамі, а кучаравы капітан з прозьвішчам ці то Гурок, ці то Бурак, зазірнуўшы ў іх адным вокам, пагардліва кідае: «Пущай сам Шушкевич придет и мне скажет, тогда пропущу». Ягоны калега, зрабіўшы страшныя вочы, абяцае, што ўсё адно будзе правярацъ "щацильна".

Каля шлягбаўма гамуе аўтобус зь дзявочай зборнаю па нейкім спорце. Пакуль трэнэр вядзе перамовы з начальствам, юныя спартоўкі просяцца ў паставога: «Товарищ милиционер, пропустите. У нас соревнования. Нам завтра вечером на помост в Париже выходить». «Знаем мы ваши соревнования, — міралюбна адгукаецца "товарищ милиционер". — Трахаться едете с французами за даляры. Будете с нами за рубли — тогда пропустим».

Пэрспэктыва пакаштаваць нясьвіскага сала з чырвонай праслойкаю й пачуць адну з вэрсіяў утварэньня колеравай гамы нашага сьцягу робіцца для кракаўскіх гейналістых усё больш туманнаю. Ваш апанаваны апошнімі надзеямі аўтобус бярэ курс на Берасьце — шукаць справядлівасьці ў высокіх кабінэтах. Надпіс на ўезьдзе ў горад папярэджвае: «Народы СССР — едины». Мяркуючы па аўтобусных нумарох у чарзе за мяжу й па агульнай эканамічнай прасторы прымежнага поля, па якім не адважыцца прайсьці басанож нават твой знаёмы серабранкаўскі п'янтос Камінтэрн, — лёзунг кажа шчырую праўду.

Беларускае мовы на берасьцейскіх вулках і ў берасьцейскіх кабінэтах людзі ці то ня хочуць разумець, ці то сапраўды не разумеюць. «Так вы, ребята, к нам из Белоруссии приехали? — з ухмылкаю пытаецца абласны начальник. — Как у вас в Белоруссии погода?..»

З аднаго кабінэта ў другі вы пераяжджаеце па вуліцы імя Касманаўтаў, і табе згадваецца, як гадоў пяць таму ў Воршы сакратар гаркаму партыі самых разумных і сумленных, пачуўшы прапанову назваць аршанскую вуліцу Касманаўтаў, дзе пісалася "Дзікае паляваньне караля Стаха" імем Караткевіча, абурана адрэзаў, што гэта "идеологически неверно". На просьбу ўдакладніць, хто з касманаўтаў нарадзіўся ці жыў у Воршы, сакратар дасьціпна зазначыў: "Они здесь пролетали". Назвы вуліц Берасьця сьведчаць, што над ім праляталі Пушкін з Гогалем, Будзённы з цэлым эскадронам бальшавіцкіх башыбузукаў, а таксама Ленін з самім камунізмам.

Няблага вывучыўшы гарадзкую тапаніміку "западных ворот советской страны", вы вяртаецеся на шашу і — о, сьвятая наіўнасьць! — спрабуеце заняць у чарзе ранейшае месца. Яшчэ на далёкіх подступах з аўтобуса зь віцебскім нумарам высыпаюцца, як блашчыцы з матраца, дзесяткі два разьятраных жанок і іхніх няголеных спадарожнікаў. Ваш аўтобус намагаецца сутаргава пліснуцца наперад. Хмурныя няголеныя мужчыны дакляруюць размалаціць каменьнем вокны. Жанчыны дзейнічаюць больш радыкальна. З крыкам: «Проедете по нашим трупам!» яны кладуцца пад колы на мокры ад імжачкі асфальт.

Ты выбіраеш сярод ляжачых прыгожую маладзіцу ў сьветлай куртцы й пачынаеш яе ўгаворваць зьмяніць пазіцыю. Ты цярпліва даводзіш ёй, што брудны асфальт — ня самае зручнае месца дэманстраваць бясспрэчныя вабноты. Ты пытаесься ў яе ймя й тэлефон і, зьвяртаючыся да скарбаў айчыннай паэзіі, кажаш пра духмяныя стагі, дзе жанчыны, як радасны сон на зары.

Маладзіца зь віцебскага аўтобуса прыслухоўваецца да тваёй беларускай мовы, і раптам ейны гожы твар перасмыквае, і яна зь нянавісьцю верашчыць: «Уйди, хохол бородатый! Тут белорусы по десять суток мучаются, а еще вас понаехало!»

Гэта гучыць, як прысуд.

Унурыўшы галаў у плечы, ты выцягваеш з аўтобуса валізу зь "Белай Русьсю" і цешчыным салам, спыняеш спадарожны "масквіч", расштурхоўваеш на вакзале колькі падазроных асобаў "кавказской национальности" каля адзінай адчыненай касы, купляеш квіт у цягнік, што йдзе з таго боку, куды цябе не пускаюць, залазіш упершыню ў жыцьці ў мяккі й абсалютна пусты міжнародны вагон і праз чатыры гадзіны ўжо падыходзіш да свае хрушчобы ў Серабранцы.

Як казаў, прыяжджаючы з-за сьвету ў сваю Нарвэгію Фрыцьяф Нансэн, «вяртаньне — прыз кожнага падарожжа».

... Апоўначы ты бярэш сынаву дудку й выдзімаеш на ёй "Саўку ды Грышку". У тую ж хвілю на вежы Мар'яцкага касьцёлу падносіць да вуснаў трубу кракаўскі гейналісты.

Вашыя мэлёдыі зьліваюцца ў рэквіем па "Белай Русі" й белчырвон-белым нясьвіскім сале.

Сакавік 1992.

ГАРАСКОП БЕЛАРУСІ

Гараскоп — як спакуса прадвызначэньня ці момант шчырасьці. Магчымасьць суаднесьці сябе зь іншымі, нават «падслухаць споведзь». Момант сьпірытызму. Сур'ёзныя людзі саромеюцца гараскопаў як забабонаў. Але ёсьць тут нешта й ад статыстыкі, ад сыстэмы. Нездарма найбольшым даверам гараскопы карыстаюцца ў заблытаныя часы. Вось пацярпеў фіяска марксізм-ленінізм, які быў для савецкага чалавека ўсім, у тым ліку й гараскопам, заменьнікам боскага ці касьмічнага прадвызначэньня, канстантай жыцьця. Цяпер яго няма. І чалавек шукае іншую, сваю зададзенасьць, зь якой пушчаны ў сьвет... А разам з чалавекам шукаюць Ідэя й Край, беларушчына й Беларусь. Якія зоркі сталіся для іх спрыяльнымі, а якія не?

Калі глядзець на падзеі гісторыі, дык яны часта супярэчлівыя пад адным сузор'ем Задыяка. Скажам, БНР была абвешчаная пад Бараном, але пад Бараном жа 25 сакавіка 1829 году была скасаваная царкоўная Унія. Якую падзею лічыць вызначальнай? Ці — ад той, якая спадабаецца, вызначаць, станоўчыя ці адмоўныя былі ўсе астатнія? Наўрад ці з гэтага што атрымаецца. Напрыклад, пад Ракам пачаліся рушэньні войскаў Напалеона й Гітлера на Беларусь, але пад гэтым самым знакам прайшлі ўстаноўчыя зьезды БНФ і ТБМ. Пад Дзевай — славутая перамога К.Астроскага пад Воршай і — «вызваленчы паход савецкай арміі» 17 верасьня 1939 г. Скарпіён прынес заснаваньне Нашае Нівы ў 1906-м і разгон мітынгу ў Менску 30 кастрычніка 1988 г., расстрэл вялікае групы беларускіх літаратараў 29-30 кастрычніка 1937 г.

Напэўна, знакі Беларусі — тыя, што ў дачыненьні да Беларусі выявіліся адназначна спрыяльна ці адмоўна. Зусім станоўчым сузор'ем выглядае Леў: Востраўскае пагадненьне Ягайлы зь Вітаўтам, першая кніга Ф.Скарыны, грамата Вялікага князя Аляксандра пра сувэрэнітэт ВКЛ... Але характар Ільва — ўладарны й ганарлівы, чаго ніяк ня скажаш пра Беларусь. Зусім неспрыяльны знак — Рыбы: бітва на Нямізе, Слуцкая канфэдэрацыя, павешаны К.Каліноўскі, Рыская дамова пра падзел Беларусі. Але...

Калі ж разглядаць пэрсаналіі — вядомых творцаў і палітыкаў Беларусі, а таксама яе захопнікаў і вешальнікаў — дык убачым зусім іншыя заканамернасьці. Разьмеркаваўшы пэрсонаў па знаках, мы можам вывесьці й нейкую сваю, беларускую характарыстыку таго ці іншага знаку. Але гэта калі хто зоймецца. Сёньняшняя падборка ўвогуле даволі выпадковая, і кожнае новае імя можа разбурыць адносную лёгіку гэтага тэксту. Калі, вядома, усяму гэтаму верыць...

КАЗЯРОГ
(22.XII-20.I)




Знак Зямлі. Стандартная характарыстыка кажа: упарты й трывалы, Казярог праз усё жыцьцё дробнымі крокамі пасоўваецца да чарговае мэты, якую вызначыў сабе сам. Гэта скрытны, выдатна сарганізаваны халодны рэаліст. А цяпер уявіце сабе **Адама Міцкевіча, Эдгара По, Элвіса Прэсьлі** і параўнайце, скажам, з ваенізаваным **Мао**... Наступны парадокс — Мао і **Жана д'Арк**. Чорнай памяці мітрапаліт **Іосіф Сямашка**, паплечнік графа Мураўёва-Вешальніка, нарадзіўся ў вадзін дзень зь **Ісакам Ньютонам**... Цікава, які яблык «асяніў» Сямашку? А наогул Казярогі — гэта моцныя духам. Прычым, безь ніякага патасу. **А.Станкевіч, Б.Тарашкевіч, Р.Шырма, Ул.Самойла, З.Азгур**... Крыху выбіваецца з гэтага роўнага шыхта **Ядвігін Ш.** — натура не такая адназначная... Мне здаецца, Казярог для Беларусі — знак рэтраспэктыўны, учарашні. Гэтыя вельмі стабільныя ўнутрана людзі зусім не спалучаюцца з тым душэўным разладам, які пануе ў нас сёньня. Гэта сялянскія дзеці, якія добра надаліся ў часе «заваяваньня» гораду ды ўсталяваньня інстытутаў нацыянальнае дзяржавы й духоўнасьці. Пасьля ім проста не было дзе рэалізоўвацца. Магчыма, новы бум Казярогаў чакае Беларусь заўтра?.. У беларускай літаратуры Казярогі пайшлі ад **К.Буйлы**. Гэта **А.Александровіч** і **А.Дудар, А.Кулакоўскі, А.Кудравец, А.Вялюгін, Д.Бугаёў, Я.Сіпакоў**. У роўным шыхце «павольных, але няўхільных» — **А.Васілевіч, Д.Бічэль-Загнетава, В.Іпатава.** Тут жа **В.Сёмуха** й **Г.Кахановскі**... Хто будзе спрачацца, што ўсе яны маюць рысы Казярога? Праўда, калі сказаць, што нехта зь іх нарадзіўся пад іншым знакам, дык, напэўна, знойдуцца й нейкія іншыя рысы. **Ул.Мулявін** — таксама Казярог... А ўвогуле ня скажаш, што гэтае сузор'е стала для Беларусі сузор'ем геніяў. Такім, напрыклад, як Воднік.

ВОДНІК
(21.I-19.II)



Знак Паветра. Хуткі, цікаўны, мысьліць арыгінальна — настолькі, што часам яго прызнаюць за дзівака. **Моцарт. Байран. Бёрнс.** Так упарта шукае праўды і ўсяго нязнанага! **Галілей. Жуль Вэрн. Дарвін.** Але любіць адасабляцца. Праўда, на самоце ніколі ня нудзіцца, бо самае цікавае на сьвеце для яго — уласныя развагі. Вось **Дыкенс,** напрыклад. І **Фэліні,** які, здаецца, здымае свае фільмы толькі для сябе самога. Для Беларусі гэта знак зорак першае велічыні. **Мікалай Радзівіл Чорны, Касьцюшка, Кіркор, Каліноўскі.** Мастакі **Ваньковіч, Хруцкі, Орда, Малевіч, Бялыніцкі-Біруля, Савіцкі...** Літаратары **Дунін-Марцінкевіч, Каганец, А.Луцкевіч, Сваяк, Гарэцкі, Мележ, Стральцоў, Куляшоў, Шамякін, Шушкевіч.** Тут жа **Мурашка, Навуменка, Дайнека.** Дасьледчыкі **Улашчык, Мушынскі, Ліс.** Артыстка **Л.Александроўская...** Цікава: на наступны дзень пасьля Моцарта нарадзіўся **А.Мясьнікян**!.. Вось і мяркуйце, кім быў для Беларусі **П.Машэраў** — Моцартам ці Мясьнікянам, ці — тым і тым адразу?..

РЫБЫ
(20.II-20.III)



Знак Вады. Паводле стандартнай характарыстыкі, гэта нешта процілеглае Казярогу. Рыбы лагодныя, уразьлівыя, яны, між іншым, вераць у гараскопы, яны вельмі музычныя (**Шапэн, Вівальдзі, Равэль**). Кажуць, Рыбы — прыроджаныя апякункі, сёстры міласэрнасьці, выхавацелькі дзяцей. Падобна, што гэта жаночы знак. Але ў маёй падборцы толькі дзьве жанчыны: **А.Кабаковіч** і **Е.Лось**. Тут жа — **Пане Каханку** і **К.Лышчынскі**. Тут жа — пісьменьнікі ад **Шаўчэнкі** да **Акутагавы**, г.зн., **Гюго, Ібсэн, Гогаль, Горкі**. **А.Смоліча, А.Чарвякова** і **К.Дуж-Душэўскага** я хутчэй аднес бы да Казярогаў (стэрэатып найноўшага часу). Калі істотны ня толькі сам знак, але й дата нараджэньня, тады варта супаставіць асобаў, якія нарадзіліся ў вадзін дзень і, калі верыць гараскопу, мусяць мець аднолькавы характар. **Кандрат Крапіва** нарадзіўся ў вадзін дзень з Шапэнам, **А.Гарун** — з **М.Сеўруком**, **Ф.Багушэвіч** — з **Ф.Аляхновічам**, **А.Пісьмянкоў** — з **С.Дарожным**, **А.Марачкін** — з **М.Ткачовым** і **С.Андраюком**. Нарэшце, **А.Багдановіч, Р.Барадулін** і **А.Бачыла** зьявіліся на сьвет кожны сам па сабе... Цікава, пад якім знакам нарадзіўся Сальеры?

БАРАН
(21.III-20.IV)



Знак Агню. Імпульсіўны, адважны, заўсёды ў авангардзе. На жаль, яму бракуе рэалізму. Ён часта зробіць, а тады толькі падумае. Хутка да нечага запальваецца, але яшчэ хутчэй згасае. Праўда, лічыцца, што менавіта дзякуючы Барану сьвет пасоўваецца наперад. Для Беларусі гэта можа пацьвердзіць імя **Льва Сапегі**. Для сьвету... **Ф.Гоя, Г.Х.Андэрсан, Гэрбэрт фон Караян**. Шэраг паэтаў выглядае даволі заканамерна — **Н.Гумілёў, А.Пысін, В.Дашкевіч, А.Мінкін**. Празаікі — **Галавач, Карпюк, Коўтун, Лялько, Прокша**. **Я.Лецка** нарадзіўся ў вадзін дзень з **А.Гітлерам**. І тут ёсьць некалькі асобаў, якіх я аднес бы да Казярога — **С.Рак-Міхайлоўскі, Стары Ўлас, Дыла, Гмырак**... Цікава, народжаныя пад якім знакам першыя пакрыўдзяцца на мяне за «вольнае абыходжаньне зь іхнімі прозьвішчамі»? Была б яшчэ адна выдатная характарыстыка... Што да Барана, дык гэтае сузор'е выглядае знакам ня столькі самой беларушчыны, колькі — спрыяньня беларушчыне. Гэта пацьвярджаюць прозьвішчы **Я.Лялевеля**, графа **М.Румянцава, В.Жыдліцкага**. Магчыма, гэта нехта з Бараноў і прыдумаў прымаўку: для беларусаў яшчэ можна нешта зрабіць, а разам зь імі — ніколі.

БЫК
(21.IV-20.V)



Знак Зямлі. Гэта цьвярозы рэаліст, аседлы, любіць добра пад'есьці, прыроду, грошы і дасканала ведае, чаго яму трэба ў жыцьці. Быка няпроста вывесьці з раўнавагі. Наогул гэта каралеўскі знак. Пад ім нарадзіліся брытанская каралева **Лізавета II**, імпэратар Японіі **Хірахіта**, расейская царыца **Кацярына II**. А таксама **Маркс** і **Ленін**. **Шэкспір, Гашак** і **Севяранін**. Цяжка сказаць, што апошніх трох лучаць нейкія літаратурныя якасьці, хутчэй, можа быць, — чалавечыя. Зь беларусаў па даце нараджэньня самы блізкі да Леніна — **Адам Русак**. З Шэкспірам у вадзін дзень зьявіліся **З.Бядуля** і **В.Казько**. З Марксам — **С.Манюшка** і **М.Нікіфароўскі**, а назаўтра нарадзіўся **Паўлюк Трус**. Выпісаўшы прозьвішчы нашых літаратараў у слупочак, я пераканаўся, што прафэсыйны характар гэтае сузор'е вызначае як найменш, але ж надта падобнымі падаліся мне людзі: **В.Рыч, А.Лойка, Ю.Гаўрук, Я.Маўр, Р.Баравікова, А.Петрашкевіч, А.Бялевіч, Ул.Галубок, Б.Сачанка, В.Вітка, Я.Пушча, А.Іверс, Ул.Конан, С.Станюта, З.Бандарэнка... Зянон Пазьняк**.

БЛІЗЬНЯТЫ
(21.V-21.VI)



Знак Паветра. Кажуць, вельмі няпэўныя людзі, раздвоеныя. Але добра прыстасоўваюцца да абставінаў. Заўсёды крыху раздражнёныя, але пры гэтым інтэлігентныя, цэняць кантакты зь людзьмі... Магчыма, гэта яшчэ й самы касмапалітычны знак. Ён, таксама як і Воднік, нараджае геніяў, якія працуюць не дзеля нацыі, а дзеля ўсяго людзтва. Прынамсі, патрыятызм для гэтых людзей ня ёсьць вяршыняй сьвядомасьці. Магчыма, гэта й прымушае іх «раздвойвацца», асабліва ў нашых умовах, якія патрабуюць якраз патрыятызму. У траўні нарадзіліся (пасьлядоўна): **І.Бродзкі, А.Пушкін, Ул.Жылка, Іван Луцкевіч, Дантэ, Пётар І**; у чэрвені: **А.Асташонак, Ю.Віцьбіч, В.Зуёнак, Т.Ман і К.Галкоўскі, В.Рагойша, Э.Ажэшка і А.Дудараў, К.Чорны, Л.Родзевіч, М.Даўнар-Запольскі, Э.Грыг, А.Ельскі, В.Быкаў**. 21 чэрвеня ў маім нататніку пазначаныя даты нараджэньня аж чатырох асобаў. Гэта **А.Сержпутоўскі, Ж-П.Сартр, А.Макмілін** і **В.Вячорка**.

РАК
(22.VI-22.VII)



Знак Вады. Спачатку два прозьвішчы — **Рубэнс** і **Маякоўскі**. Стандартная характарыстыка выглядае так: самы загадкавы з усіх знакаў Задыяка. Нясьмелы, абразьлівы, поўны апякунскіх пачуцьцяў да бліжніх. Настрой мяняе неспадзявана, схільны бясконца аналізаваць уласныя й чужыя пачуцьці. Неадэкватна рэагуе. Замыкаецца ў сабе. Але гэта якраз Ракі ствараюць тую літаратуру й мастацтва, дзе ёсьць глыбокае пранікненьне ў людзкую душу. **Рэмарк, Ч.Мілаш, Інгмар Бэргман**... Тут **Купала** й **Брыль**, тут і **Броўка** з **Глебкам**, тут **П.Сергіевіч** і **А.Анікейчык**, **Мікалай Крыштап Радзівіл Сіротка, Ян Чачот, Янка Лучына, Цётка, Л.Вітан-Дубейкаўскі**... Выразнае супольнасьці не відаць ані ў творчасьці, ані ў характарах. Што гэты знак для Беларусі? Бадай, як знак — нічога. Тут кожны сам па сабе. Самая індывідуалісцкая суполка. **Дубоўка, Астрэйка, Някляеў, Арабей, Ламан**... Магчыма, агульнае ўбачыцца ў **Бярозкіна, Каваленкі, Бечыка, Карамазава**?..

ЛЕЎ
(23.VII-23.VIII)



Знак Агню. Разумны, амбітны, шляхетны, прагны да ўлады. Але нічога ня цяміць у людзях. Па натуры лянівы, але калі трэба, будзе добра працаваць. Часьцей у гуморы, чым зьнэрваваны. У справах пачуцьцёвых яму на ўсё трэба паказаць пальцам. «Дыяпазон» Львоў — **Б.Шоў, Б.Мусаліні, Луі дэ Фюнэс**. 15 жніўня нарадзіліся **Напалеон, В.Скот** і **В.Каратынскі**. Дзіўна, апошні з гэтых трох быў усяго толькі сакратаром у Сыракомлі. Гэта пры тым, што першы зь іх сказаў: «Лепей быць першым у Ліёне, чым другім у Парыжы». Няшчасны Каратынскі! Можна сабе ўявіць, як яго разрывала знутры ягоная львіная прырода. Леў — даволі выразны знак. Дастаткова назваць **І.Буйніцкага, Ал.Уласава, Л.Геніюш, А.Мальдзіса** і **П.Панчанку**, — характар уяўляецца зусім цэльна. Не псуюць карціну Вялікі князь Літоўскі **Аляксандар, А.Абуховіч, Ю.Крашэўскі, А.Чарнышэвіч** і **М.Селяшчук. І.Лучанок** і **В.Манаеў** — нібыта ня львы, але хіба толькі зьнешне. А яшчэ Леў — **Вільгельм Кнорын**.

ДЗЕВА
(24.VIII-23.IX)



Знак Зямлі. Пра Дзеву кажуць: дакладная, аналітычная, любіць лад і парадак у найшырэйшым сэнсе. Гэта каб ня думалі, што — толькі дзяржаўны лад. Гутарка, напэўна, ідзе пра сьветабудову. Дбае пра чысьціню й здароўе, нават іншым імкнецца навязваць гігіенічны, здаровы стыль жыцьця. Часта сварыцца зь іншымі з-за ўласнае пэдантычнасьці ды ўсялякіх дробязяў. Такія, выходзіць, былі **Апалінэр, Шастаковіч** і **Борхес**. У вадзін дзень нарадзіліся **В.Гётэ, Л.Талстой** і **Г.Бураўкін**. Дзева непасрэдна ўплывае на прафэсійны выбар. Дастаткова згадаць **І.Грыгаровіча, Е.Раманава** і **М.Федароўскага**. З буйнейшых беларускіх паэтаў Дзевы — **Н.Арсеньнева** й **М.Танк** (кажуць, Дзевы дрэнна сыходзяцца адна з адной), **М.Сяднёў, С.Грахоўскі, А.Вольскі, Н.Мацяш, П.Макаль**. Апошні, дарэчы, нарадзіўся ў вадзін дзень зь **Іванам Жахлівым**. А яшчэ Дзева — тэрарыст **Іван Пуліхаў**. З празаікаў — **К.Лейка, С.Баранавых, А.Асіпенка** і **Ул.Арлоў**. Дасьледчыкі **Р.Семашкевіч, Ул.Калесьнік, Ф.Янкоўскі, Ул.Казьбярук, Алесь Адамовіч**. З мастакоў — **А.Кашкурэвіч**. Дзевай была й Паўлінка — **Паўліна Мядзёлка**. Сузор'е настолькі ж індыфэрэнтнае да нацыянальнае арыентацыі, наколькі выразнае мэтадалягічна. Гэта прафэсіяналы, «кваліфікаваныя патрыёты»...

ШАЛІ
(24.IX-23.X)



Знак Паветра. Ураўнаважаныя, любяць красу й элеганцыю, дыпляматычныя. Справядлівыя, глядзяць на сьвет як добрыя судзьдзі. Але робяцца зусім несправядлівыя, калі раптам закапрызуюць. Тут **Лермантаў** і **Бунін**. **Мікола Гіль** нарадзіўся ў вадзін дзень з **Фрыдрыхам Ніцшэ** (цікава з гэтага пункту гледжаньня зірнуць на *ЛіМ*, які М.Гіль рэдагуе). Беларусі Шалі больш далі ў мінуўшчыне (**М.К.Агінскі, М.Без-Карніловіч, А.Варыга-Дарэўскі, Г.Дмахоўскі, Я.Драздовіч, Ф.Ждановіч, І.Насовіч, В.Ластоўскі, Ул.Пічэта, Ф.Смуглевіч, Ул.Сыракомля, А.Бурбіс, А.Вабарэка, Л.Калюга, Ц.Гартны, З.Верас**). На мяжы мінуўшчыны й сучаснасьці — **М.Лужанін, Э.Агняцвет, Н.Гілевіч** і **А.Бажко**. На магчымы плён у будучыні паказваюць імёны **К.Тарасава, А.Бяляцкага, А.Глёбуса, С.Сокалава-Воюша**... Пад гэтым сузор'ем нарадзіліся **Вера Харужая, М.Мураўёў-Вешальнік** і **Сяргей Палуян**. Шалі, бадай, ня столькі цікавыя як творцы, колькі як аб'ект творчасьці. Яны самі жывуць як героі раманаў і трагедый. Іх уласныя паводзіны, стыль жыцьця, учынкі выклікаюць большую цікавасьць, чым тое, што ствараюць яны самі.

СКАРПІЁН
(24.X-22.XI)



Знак Вады. Знак беларускае літаратуры. Вось некалькі імёнаў не літаратараў — **Міхал Андрыёлі** й **Пабла Пікаса, Эміля Плятар** і **Маргарэт Тэчар. Суворaў**. Усе астатнія — пісьменьнікі. Цэлы масіў. Гэта той выпадак, калі колькасьць пацьвярджаецца якасьцю. Цікава паглядзець на датах нараджэньня на сыходнасьць натураў. У кастрычніку нарадзіліся (пасьлядоўна): 26 - **А.Сыс**, 28 - **І.Тургенеў**, 30 - **Ф.Дастаеўскі**, 31 - **М.Грамыка**; у лістападзе: 1 - **В.Адамчык**, 3 - **Я.Колас, Я.Семяжон, Я.Скрыган**, 4 - **Ц.Гартны**, 5 - **А.Вярцінскі**, 6 - **Я.Лёсік** і **М.Засім**, 7 - **М.Чарот**, 9 - **Альбэр Камю**, 11 - **Альбэрт Паўловіч**, 12 - **А.Макаёнак**, 13 - **А.Зязюля**, 14 - **П.Пестрак**, 15 - **Д.Ліхачоў**, 16 - **А.Блок**, 18 - **М.Лынькоў**, **М.Машара**, 19 - **Э.Ялугін** і **А.Вольны**, 20 - **М.Зарэцкі, М.Клімковіч** і **Я.Янішчыц**, 21 - **Вальтэр** і **А.Русецкі**. Кожны лістападаўскі дзень прыносіў беларускай літаратуры аднаго-двух немалых літаратараў. Стандартная характарыстыка Скарпіёна: моцная воля, няўступлівасьць, трываласьць у дасягненьні мэты, памятлівасьць. Са Скарпіёнам ня варта канфліктаваць. Калі ён твой сябра ці вораг, дык на жыцьцё й сьмерць. Ідэальны знак для працаўнікоў службы бясьпекі й хірургаў. Кажуць, Скарпіён непараўнальны ў каханьні.

СТРАЛЕЦ
(23.XI-21.XII)



Знак Агню. Шчыры, больш за ўсё любіць волю й незалежнасьць. І падарожжа. Кажуць, гэта найбольш музычны з усіх знакаў. Калі не лічыць палітыкаў, **Сталіна, Пілсудзкага, Пляханава,** дык знойдзем тут пару-тройку дасьледчыкаў — **Я.Карскі, Я.Станкевіч, С.Александровіч**, аднаго мастака — **Ф.Рушчыц**, пару-тройку пісьменьнікаў — **К.Кірэенка, І.Чыгрынаў, М.Арочка, А.Каско**. Стралец — нібы птушка, якая б'ецца аб сьценкі клеткі, гэта натура, якая разрываецца зь сярэдзіны, але — трагічна сьцятая, сьціснутая халоднымі абставінамі. Паэты-Стральцы на Беларусі маюць найбольшую й праўдзівую папулярнасьць: **М.Багдановіч, Ул.Караткевіч, А.Разанаў**...

Калі, вядома, усяму гэтаму верыць...

С.П.

Пераклады Васіля Сёмухі

Шаноўная НН!

Дасылаю пераклады двух вершаў нямецкіх паэтаў Г.Гэсэ й Р.Блюмнэра.

Адзін верш (з клясыка Г.Гэсэ) — твор ясны, традыцыйны ды традыцыйна ж і перакладзены, а з увагі на перакладчыкаў век — вяшчыца яўна аўтабіяграфічная.

Другі верш (з дадаістага Р.Блюмнэра) — аўтэнтычнасьцяй, эквілінэарнасьцяй, эквівалентнасьцяй і тузінам іншых парамэтраў добрага перакладу дакляруе вяршыню перакладчыкавай творчасьці, бо сягае-такі да плянкі арыгіналу, хоць яе й не ддольвае, што як рыхтык і мае быць у мастацкім перакладзе, што й ёсьць філязофіяй працэсу. І тут мушу прызнаць, што гэты дарагі майму сэрцу пераклад далёка не кангэніяльны арыгіналу, бо ж: беларускі тэкст учынены ў тым пісьмовым варыянце беларускай мовы, які можна трактаваць як, так бы мовіць, артаграфічную трасянку. За плятформу ўзятая ўсім спрыкралая наркомаўка (параўн. "судыо" й інш.) і далікатна разбаўлена тарашкевіцай (пар. "ляэля") з адмысловымі калярытнымі перасмычынамі роднае мне (як шчо бо я чысьцюткі полешучыско!) шыльгоўкі (пар. "тюлю", "брорр ш'ятт").

Такім чынам, у перакладзе захаваныя ўсе супярэчлівасьці веку й нявырашаныя праблемы перакладу як працэсу творчага, і я дужа спадзяюся, што калегі-перакладчыкі, угробшыся ў творчую спрэчку, завершаць распачатыя высьцігі перакладам гэніяльным.

Перакладчык
Васіль С. Сёмуха,
спадар

Гэрман Гэсэ
(1877-1962)

Партрэт літаратара-пярэстарка

Яшчэ ён стоўп, яшчэ ў фаворы,
хоць спарахнеў пад ім падмурак,
і, каб ня вецер, даў бы форы
пуцатым выскачкам амурам.

Хоць слабне, чэзьне спакваля
з падагры, дыхавіцы, спазмаў,
а здольны ўзьбіцца з мазаля
на ладны тузін плеаназмаў.

Зь дзіцячых баваў шчасны подзіў
сабе штукуе старац творчы,
у дзевятнаццатым стагодзьдзі
ў раі сваім забыўшы вочы.

1958

Literaten. Bildnis eines zu alt gewordenen. **З кнігі:** Die Gedichte. Band 2. Frankfurt am Main, 1977.

З швэйцарскае мовы
пераклаў В.С.

Рудольф Блюмнэр
(1873-1945)

Анго Ляйна

Оіаі ляэля оіа ссісіяю
энсудыо трэса судыо мішнумі
я лён штуац
брорр ш'ятт
оіацо цуігулю
уа сэса масуо тюлю
уа сэса машыато торо
оі сэнгу гадзэ андоля
оі андо сэнгу
сэнгу андоля
оі сэнгу
гадзэ
іна
леіоля
кбао
сагор
кадо

1921

Ango Laina. **З кнігі:** Lyrik des expressionistischen Jahrzehnts. Deutsche Taschenbuch Verlag. München, 1962.

З аўстрыйскае мовы
пераклаў В.С.



Кніга пра недарэчных людзей

навэля

Шэрвуд Андэрсан



На думку многіх крытыкаў ды пісьменьнікаў, дваццатае стагодзьдзе ў амэрыканскай навэлістыцы пачынаецца з Шэрвуда Андэрсана.

... я называў сюжэт ядам, які атручвае навэлістыку. Я лічыў, што патрэбны не сюжэт, а форма, інакш кажучы, нешта нашмат больш складанае, няпэўнае, цяжкадасягальнае... Як апавядальнік, я прыйшоў да думкі, што сапраўдная гісторыя жыцьця ёсьць толькі гісторыя асобных момантаў.

Ш.Андэрсан

Старому пісьменьніку было цяжкавата забірацца ў ложак. Вокны былі высока над падлогаю, а яму, калі ён прачынаўся ўраньні, хацелася глядзець на дрэвы. Прыйшоў цясьляр, каб падняць ложак упоравень з падваконьнем.

Цясьляр, вэтэран Грамадзянскай вайны, прысеў пагаварыць пра памост, на які ён меўся паставіць ложак. Побач ляжалі цыгары, і цясьляр запаліў.

Сьпярша яны пагаварылі пра тое, як падняць ложак, пасьля загаварылі пра іншае. Цясьляр узгадаў вайну. Пісьменьнік па сутнасьці сам падбіў яго на гэта. Цясьляр пабываў у палоне, сядзеў у ваеннай вязьніцы ў Андэрсанвіле, і ў яго загінуў брат. Брат памёр ад холаду, і, успамінаючы пра гэта, цясьляр плакаў. У яго, як і ў старога пісьменьніка, былі сівыя вусы; плачучы, ён надзімаў вусны, і вусы соваліся ўверх і ўніз. Стары са сьлязьмі на шчаках і цыгараю ў роце выглядаў сьмешна. Пра падняцьце ложка, як тое ўяўлялася пісьменьніку, забыліся, і пазьней цясьляр зрабіў усё па-свойму. Пісьменьнік, якому йшоў сёмы дзясятак, быў змушаны ўзьбірацца на ложак з дапамогаю крэсла.

У ложку пісьменьнік паварочваўся на бок і суцішваўся. Ён быў зацяты курыльшчык і з году ў год неадступна думаў пра сваё хворае сэрца, і сэрца ягонае трымцела. У галаву яму запала думка, што ён памрэ зьнянацку, і перад сном ён кожнага разу думаў пра гэта. Тая думка не палохала яго. Яна жыла ў ім неяк асабліва, цяжка нават растлумачыць як. І, лежачы ў ложку, пісьменьнік адчуваў незвычайнае ажыўленьне. Ён ляжаў зусім ціха, цела ягонае было ўжо старое, і толку ад гэтага цела было ўжо небагата, аднак нешта ўсярэдзіне заставалася зусім маладое. Ён быў усё адно як цяжарная жанчына — толькі насіў у сабе не дзіця, а маладосьць. Не, нават не маладосьць, а жанчыну, маладую і ў рыцарскай кальчузе. Бачыце, які бязглузды занятак спрабаваць растлумачыць, што ажывала ў пісьменьніку, калі ён ляжаў на высокім ложку і прыслухоўваўся да таго, як трымціць ягонае сэрца.

За доўгае жыцьцё ў галаве ў старога пісьменьніка назьбіралася багата розных паняцьцяў. У свой час ён быў цікавы мужчына, і не адна жанчына кахала яго. Апроч таго, ён ведаў людзей, шмат людзей, ведаў неяк асабліва блізка, зусім ня так, як мы з вамі. Гэтак, прынамсі, меркаваў сам пісьменьнік, і яму было прыемна. Не спрачацца ж са старым чалавекам пра ягоныя думкі!

Пакрысе на пісьменьніка насоўваўся сон, які, праўда, быў не зусім сон. Недзе на паўдарозе паміж яваю й мрояй перад ягонымі вачыма пачыналі ўзьнікаць постаці. Яму ўяўлялася, быццам гэта тое маладое, невытлумачальнае, што жыве ў ім, вядзе доўгую чараду постацяў перад ім.

І бачыце, тут вельмі істотнае тое, <u>якія</u> постаці перад вачыма пісьменьніка. Усе яны былі недарэчныя. Усе мужчыны й жанчыны, якіх пісьменьнік колісь ведаў, рабіліся ў сьне недарэчнымі. Аднак ня ўсе яны былі такія з выгляду. Былі амаль бездакорнае прыгажосьці, былі й забаўныя, а адна жанчына зь непазнавальна скажоным абліччам балюча раніла старога сваёй недарэчнасьцю. Калі яна прыходзіла, ён скуголіў нібы сабака. І калі б вы апынуліся ў пакоі, вы падумалі б, што ў старога благія сны ці нястраўнасьць.

З гадзіну пэўна цягнулася чарада людзей-недарэкаў перад вачыма старога, а потым, хоць і цяжка яму гэта было, ён выбіраўся з ложка й сядаў пісаць. Той ці іншы зь недарэкаў уражваў старога, і яму карцела апісаць яго.

За сталом пісьменьнік працаваў ня больш за гадзіну. У выніку атрымалася кніга з назваю «Кніга пра недарэчных людзей». Яе так і не надрукавалі, але я яе аднойчы прачытаў, і яна мяне надзвычай уразіла. Праз кнігу праходзіла адна скразная, дужа дзіўная думка, якую я засвоіў назаўсёды. Дзякуючы ёй, я зразумеў многіх людзей і многія рэчы, што раней былі недаступныя майму разуменьню. Думка гэтая даволі складаная, а спрошчана яе можна выкласьці так:

Спачатку, калі сьвет быў яшчэ малады, існавала процьма розных думак, аднак ісьцінаў якраз і не было. Чалавек сам высноўваў ісьціны, і кожная зь іх складалася з мноства цьмяных думак. Паўсюль у сьвеце зьявіліся тыя ісьціны, і кожная па свойму была цудоўная.

Стары пісьменьнік занатаваў у сваю кнігу сотні такіх ісьцінаў. Ня буду пералічваць вам усе. Былі там ісьціна цноты й ісьціна страсьці, ісьціны багацьця й галечы, скупасьці й марнатраўства, легкадумнасьці й самазабыцьця. Сотні й сотні ісьцін, і ўсе — цудоўныя.

А потым зьбегліся людзі. І кожны хапаў сабе якую-небудзь ісьціну, а дужэйшыя хапалі іх па цэлым тузіне. Вось ісьціны й зрабілі людзей недарэкамі. Пісьменьнік разьвіў тэорыю на гэты конт. Паводле ягоных уяўленьняў, як толькі чалавек рабіўся ўладальнікам адной зь ісьцінаў, называў яе сваёю й сіліўся згодна зь ёю пражыць жыцьцё, ён рабіўся недарэчным, а ягоная ўлюбёная ісьціна — хлусьнёю.

Самі разумееце, што стары, які аддаў пісаньню ўсё жыцьцё, можа скрэмзаць сотні старонак, разьвіваючы гэтую тэму. Кніга так разраслася ў ім, што пісьменьнік сам рызыкаваў ператварыцца ў недарэчнага чалавека. Аднак не ператварыўся. Мяркую, з тае самае прычыны, зь якое не надрукаваў сваю кнігу. Маладое ў ім — вось што ўратавала старога.

А што да старога цесьляра, які падымаў пісьменьніку ложак, дык яго я згадаў толькі таму, што сярод усіх недарэчных асобаў у кнізе пісьменьніка яго, як і многіх так званых простых людзей, лягчэй за іншых было зразумець і палюбіць.

**Пераклаў
з ангельскае А.А.**

Горад падлеткаў

Нататка пра Сочы

Антон Бакіноўскі

Як толькі згадваюцца Сочы, мой твар крывіцца ў цынічнай усьмешцы. Ён сам крывіцца, і нічога зь ім ня зробіш. Каб вы пабылі ў Сочы 13 разоў, дык і ў вас скажаўся б твар пры адной толькі згадцы пра чарнаморскі райскі куток.

Перш-наперш у Сочы патрэбныя цёмныя акуляры. І я, як толькі пачынаю зьбірацца на поўдзень, дык пішу на розных паперках, каб не забыцца: "Акуляры! Акуляры!! Акуляры!!!". Гэтым разам узяў нават двое — брунатнавата-дымчатыя ў танюткай апраўцы ды чорна-зялёныя з квадратнымі шкельцамі. Акуляры прызнаю толькі шкляныя. А ўсялякія плястыкавыя, цэляфанавыя, плястмасавыя... І нашто іх робяць? Хіба што дзеля жабракоў. Толькі ніводнага разу мне на вочы не трапляўся жабрак у плястмасавых акулярах.



Здымак Алены Адамчык.

У Сочы мора жабракоў. У аэрапорце, на вакзале, у падземных пераходах, каля крамаў, каапэратыўных будак, на пляжах, у марпорце, ну й вакол царкоўкі, вядома. Жабрак, як і армянін з расейцам, адна з самых распаўсюджаных нацыянальнасьцяў у вольным горадзе Сочы. Вось сёньня падыйшоў я да жабрака й кажу: «Чэнч! Давай пакладу табе ў шапку два рублі й вазьму зь яе чатыры манэткі па 15 капеек. Трэба ў Менск затэлефанаваць, а нідзе ніхто не мяняе». «Бяры, — кажа ён, — колькі трэба, бяры». На разьвітаньне п'яны жабрак памахаў бурачковымі ручкамі й сказаў, каб бог даў мне здароўя.

У Сочы жабракоў процьма. Бязногіх, бязрукіх, на дошках з колцамі, брудных цыганак зь немаўлятамі, бабулек у белых хустачках з раскладзенымі на каленях насоўкамі, на якіх пабліскваюць начышчаныя медзякі. У Менску жабракі хоць ціхія, а ў Сочы ледзь ня ўсе яны сьпяваюць сіпатымі галасамі.

Яшчэ ў Сочы на кожным кроку тырчаць камэрцыйныя шапікі, а ў іх сядзяць вусатыя армянкі. У кожнай армянкі раве дый стогне магнітафон. І з усіх армянскіх магнітафонаў гучыць расейская эстрада — зьява гадкая, як расейскі мат і расейскі бруд. Так што сіпатым жабракам цяжка сьпяваць на сонечных вуліцах курортнага Сочы.

На адной з сочынскіх вуліц ёсьць зусім маленечкі парк, а нараклі яго «Паркам савецка-японскай дружбы»... Зрэшты, на шыльду можна не зьвяртаць увагі, а вось на мэталёвага дракончыка, які сядзіць на камені, варта й паглядзець. У дракона тоўстыя вусы, і так яны выгінаюцца на задраным лычы, што вельмі ўжо нагадваюць акулярную аправу. Каб мая воля, уставіў бы шкельцы: адно чырвонае, што японскае сонца, а другое зялёнае, што жабіна ікра.

Альтанка ў сочынскім японскім парку згарэла. Стаяла такая пагада, цешыла вока, а нехта ўзяў і спаліў. Я йшоў да альтанкі, а прыйшоў да вугольля. Закурыў. Дымок паплыў над чорнымі дошкамі. І зрабілася сумна, і адзінота агарнула мяне. Згадаўся верш:

На голай галіне
Воран сядзіць самотны.
Восеньскі холад.

... Гэтым разам напярэдадні майго прыезду цэлыя суткі ліў дождж. Таму мора зрабілася ймглістa-белае з глыбінная зеленкаватасьцю, падобнае колерам на сок дзьмухаўца.

А яшчэ з пляжу можна пайсьці ў сочынскі парк «Рывіера». Там спакой і можна засяродзіцца, ажно пакуль ня прыйдуць пасьля сьняданьня мацяркі зь дзецьмі. Дзеці пачнуць плакаць, крычаць, сьмяяцца, дурэць... Дзеці ў Сочы — пакута страшэнная. Можа, ім сонца зашмат, а можа, у бацькоў ад сонца не хапае сілы, каб іх даглядаць.

Сочы не для дзяцей. Сочы — горад падлеткаў.

Прыяжджае сюды які-небудзь салідны, сыты цэнтнэр жывое вагі, намесьнік міністра. Заходзіць ён у санаторый імя Мянжынскага-Дзяржынскага-Кржыжаноўскага і першае, што робіць у нумары люкс, — ператвараецца. Скідае шырачэзныя нагавіцы й нацягвае шорты. Надзявае форму падлеткаў, у якую акрамя шортаў уваходзяць: кашуля з кароткімі рукавамі, яркія шкарпэткі, красоўкі й панамка. І ні вусы а ля пясьняр, ні люлька, заціснутая ў зубах, ні партманэтка з далярамі ня здатныя ўжо вярнуць намесьніка міністра ў дарослы стан. Нават размова зь міністрам (той таксама будзе стаяць пад пальмаю ў падлеткавай уніформе — спартовым строі — і лізаць марозіва, а яно будзе раставаць і капаць на спартовыя зь лямпасамі нагавіцы). Белыя кроплі-чарвячкі нададуць замежным нагавіцам тутэйшай сапраўднасьці, зьнішчаць іерархічны глянец, зраўняюць, зьлепяць, змацуюць у вадно ўсіх міністраў і намесьнікаў, рабочых і сялян у вадно Балтыйска-Чарнаморскае падлеткаўскае племя.

Марозіва — нацыянальная страва гораду Сочы.

Сочы знаходзіцца на адной шыраце зь Нью-Ёркам. І архітэктура тут выглядае даволі сьмелым спалучэньнем агульнакаўкаскай саклі з амэрыканскім канструктывізмам. Але архітэктура — сур'ёзная рэч, як грошы, як зброя. А Сочы — несур'ёзны гарадок. І несур'ёзнае ў ім усё, нават аўтаматычны пісталет.

Вось толькі што я піў каву ў маленькай сталоўцы, якую так-сяк перарабілі за адну зіму ў бар. Кава рэдзенькая, падлога непадмеценая, сталы аблупленыя й няўстойлівыя, так што й цыгарэты на іх выкладаць ня хочацца. Навокал за такімі ж расхістанымі сталамі сядзелі армяне. Гаварылі яны гучна па-расейску, але з моцным каўкаска-салдацкім акцэнтам. Раптам адзін барадаты ўскочыў і наставіў на другога, вусатага, пісталет. Гук стрэлу мярзотны, рэзка-рыпучы, кароткі... Патрон халасты. Жарт. Садысцкая падлеткаўская хохма. У бары засьмярдзела порахам. Я сыйшоў.

А цяпер варта стрэліць мне, прыцэліцца, сабрацца й трапіць у самае тое месца ў сочынскіх мужчын.

Сэксу ў Сочы няма. Ну, які, скажыце, у падлеткаў сэкс? Намеры, размовы, мары, мроі, а па-сапраўднаму... Зірніце на сочынскага мужчыну, які хоча выглядаць на мільянэра. А ўсіх ягоных заробкаў ледзь хопіць на добры спартовы гарнітур. І вось яны сядзяць у барах, п'юць таннае й кіслае віно, шкрабуць няголеныя шчокі й меньцяць языкамі пра жанчын. Яны выдумляюць свае перамогі над швэдкамі, фінкамі й рыжанкамі. Наіўныя, яны ня бачаць мутнымі ад цёплае гарэлкі вачыма, што паўночны багаты мужчына даўно скарыў прагнае да раскошы жаночае сэрца. Жанчыне патрэбны мужчына, а не п'янаваты жабрак-падлетак. А што да сочынскіх дзяўчатак, дык калі гляджу на іх, згадваю банальнасьць — сэкс з падлеткамі шкодны для здароўя: перажываньні, нэрвы, нары й неба за кратамі. Ну, і які можа быць сэкс, калі ўсё адкрытае, усё навідавоку, усяго колькі заўгодна й нават больш. Пляж у Сочы — гэта агульны ложак на сто тысяч чалавек.

У Сочы й бяз сэксу хапае задавальненьняў. Ну, хоць бы той жа кегельбан. А можна пакатацца на водных лыжах ці на яхце, ці на параходзе, ці на каруззлях у парку «Рывіера». Можна выпіць кока-колы, пагуляць у зарасьцях зялёна-блакітнага лістакалосьніку, які прыйшоў у Сочы з Кітаю й завецца проста бамбук. У дзяцінстве я думаў, што бамбук заўсёды жоўта-касьцяны, як вудзільны ў краме «Рыбак-паляўнічы», а ён і сапраўды блакітна-зялёны, як і сам горад Сочы.

І можаце цынічна ўсьміхнуцца, толькі спачатку здыміце чорныя акуляры, і вы нічога ня ўбачыце акрамя асьляпляльнай блакітнай зеляніны.

Сочы, красавік 1992.

КАНЕЦ СЬВЕТУ

Варажбіты й прадказальнікі не надавалі яму адмысловае ўвагі. І ў самім ім не было ані магічных сямёрак, ані якіх іншых дзіўных уласьцівасьцяў, якія бываюць у лічбаў. Тым ня менш, 1989 год прынес Эўропе й сьвету такія зьмены, якія нікому й ня сьніліся. Год 1992 — таксама складаецца драматычным і выключным. Канец другога тысячагодзьдзя пагражае людзтву агульнай і незваротнай катастрофай.

У 989 годзе, калі да канца тысячагодзьдзя не ставала ўсяго 11 гадоў, Эўропу агарнула паніка. Аўтары даўніх кронік апісалі вусьцішныя падзеі ў Бургундыі, дзе рытуальны канібалізм меў невытлумачальны трыумф. У часе, калі адныя сьцякаліся да вялікай саборнай малітвы, якая мелася прынесьці людзтву адпушчэньне грахоў і ласку, іншыя пагразалі ў распусьце й галасілі пра хуткі надыход царства сатаны. Пазьяўляліся практыкі сатанізму, у многіх краінах цягнуліся войны, раз-пораз пашыралася зараза, за якой ішлі сьледам галодныя паморкі. Мінула тысяча гадоў, і вось, усе гэтыя бедзтвы, здаецца, вяртаюцца з падвойнай сілай. Сьвет так і ня вызваліўся з палону голаду й войнаў, а сталае пашырэньне AIDS дапоўніла гэты жахлівы абраз. Няўжо мяжа тысячагодзьдзяў зноў, як і колісь, зьвястуе канец. людзкой цывілізацыі, ад якога толькі пакута альбо цуд здолелі б нас выратаваць?

Піко дэля Мірандоля прарочыў колісь, што канец сьвету наступіць дакладна ў 1994 годзе. Тое самае прадказвала ў 1917-м Фаціма. Абое чэрпалі свае веды з натхненьня, але былі таксама й такія варажбіты, якія спрабавалі падмацоўвацца навуковымі высновамі.

Удзячным аб'ектам для такіх досьледаў спрадвеку была й ёсьць піраміда Хеопса. Незвычайныя формы, памеры й прапорцыі гэтай, мусіць, самай славутай на сьвеце магілы, здаўна падахвочвалі шукаць у іх нейкага пасланьня да нашчадкаў. Напрыклад, ангельскі інжынэр-будаўнік з гораду Лідз Дэвід Дэвідсан кажа, што ключом да зразуменьня загадкі будучыні ёсьць лічба 286,1, а дакладней, яе наступныя кратнасьці. Таму што кола, накрэсьленае вакол споду піраміды, роўнае дакладна сто разы па столькі, колькі дзён у годзе. Гэткія ж дзіўныя прапорцыі паміж гранямі бакоў, вышынёй і дыяганалямі споду дазволілі Дэвідсану прыйсьці да высновы, што вялікі "Хеопс" — гэта ня што іншае, а своеасаблівы каляндар. У ім занатаваныя даты вялікіх падзеяў гісторыі Эгіпту, а таксама даты вялікіх зьменаў, якія яшчэ настануць. Карыстаючыся, напрыклад, кратнасьцю залатой лічбы 286,1, лёгка патрапіць на лічбу 2002, якая й можа азначаць дату канца сьвету. Зрэшты, на думку некаторых больш дакладных інтэрпрэтатараў таямніцаў старажытнасьці, такое здарэньне можна датаваць на 17 верасьня 2001 году.

Уся гісторыя сьвету поўная катаклізмаў. І паколькі ніколі не ўдавалася да канца авалодаць патопамі, паводкамі, землятрусамі, эпідэміямі голаду й войнамі, трэба было спазнаць, навучыцца хоць бы прадбачыць найгоршае. Веды павялічваюць шанцы паратунку, дазваляюць утаймаваць страх, робяць сьвет больш зразумелым і лягчэйшым для ўспрыняцьця. Спачатку веды чэрпаліся з боскіх знаменьняў, прарочых сноў і наркатычных мрояў. Канец сьвету абуджаў уяўленьне наймацней. Ўікліф, вялікі перакладчык Бібліі, прызначыў яго на 1400 год. Леанітыюс, вялікі хрысьціянскі тэоляг казаў, што адбудзецца гэта ў 1584-м. Ўінстан у сваю чаргу датаваў канец зямнога быцьця чалавека 1715 годам, а Ірвінг прадбачыў, што станецца тое ў 1835. Крытычнымі датамі ў іншых прадказаньнях меліся таксама быць гады 1874 і 1914. Хоць ніводная з гэтых варожбаў ня спраўдзілася, сьвету не бракавала кожнага разу ўструсаў, якія мелі памер сусьветнае катастрофы. Асабліва пачатак І сусьветнай вайны быў у гэтым шэрагу знаменным і сумным прыкладам.

Прывід канца сьвету аднак не перастаў паралізаваць страхам мноства людзей. Калі ўлетку 1945 году стала ясна, што чалавек вынайшаў штось настолькі магутнае й злавеснае, як атамная бомба, адразу стала зразумела, чым гэта можа пагражаць людзтву. Сёньня ядзерныя арсэналы ў сьвеце настолькі магутныя і маюць дастатковую сілу, каб разарваць Зямлю на кавалкі 8 разоў запар, і гэта нягледзячы на раззбраеньні, частковыя ліквідацыі гэтай зброі і сталыя захады дзяржаваў, каб было яе як найменш.

Джойс і Гаўдзі

Эсэ пра мадэрн


Адам Глёбус

Параўноўваць літаратара
й архітэктара — справа
марная, але прывабная.
Тым больш, калі
першапачатковым
штуршком было
азарэньне.

Чытаў я Джойсаву рэч
"Джакома Джойс",
і на пэўным абзацы
думкі адлучыліся ад тэксту,
і ўбачыліся пабудовы
Гаўдзі.
У Гішпаніі,
на радзіме вялікіх
сюррэалістаў
і яшчэ больш вялікіх
прыдворных жывапіśцаў,
я ніколі ня быў.
Дойлідствам Гаўдзі
не захапляўся, але
як даволі сумленны
студэнт, які наведваў
лекцыі па гісторыі
архітэктурнай кампазыцыі,
я гартаў дарагія
замежныя
альбомы
ў каштоўным фоньдзе
інстытуцкай бібліятэкі.
Была там і кніга пра Гаўдзі
зь вялікімі
добра здрукаванымі
фотаздымкамі.
А захапленьне
італійскім кіно дало
магчымасьць паглядзець
у фільме
Мікелянджэла Антаніёні
"Прафэсія рэпартэр"
будынак таго ж самага
Антоніо Гаўдзі.
Так што пэўнае ўяўленьне
пра гішпанскага дойліда
я ўсё ж меў.

А вось і фрагмэнт
з Джэймса Джойса:

"... я трымаю лёгкія,
што павуцінка,
краі сукенкі
й зашпільваю яе,
і бачу скрозь прорадзь
чорных карункаў
гнуткае цела
ў памаранчыкавай кашулі.
Брэтэлькі сьлізгацяць
паплячах,
кашуля павольна
падае: гнуткае, гладкае,
голае цела йскрыцца
срабрыстай лускою.
(Вось у гэты самы момант,
пасьля кропкі,
убачыўся мне будынак
Гаўдзі.
Луска эмалёвых
кафляных аскепкаў.
Бронза. Тынк.
Рознакаляровае шкло
ў фантастычных вітражох.
Неверагодныя спалучэньні
формаў і матэрыялаў.
Казачнасьць
замест яснасьці.)



Кашуля сасьлізгвае
па вытачаных з гладкага,
адшліфаванага срэбра
клубах,
і па барозьдцы —
цьмяна-срэбны цень...
Пальцы прахалодныя,
лёгкія, ласкавыя...
Дотык,
дотык.

Вар'яцкае,
бездапаможнае,
слабое дыханьне.
А ты схіліся й слухай:
голас. Верабей
пад калясьніцаю
Джагернаўта
зьвяртаецца
да ўласнага сусьвету.
Прашу цябе,
спадар Бог,
добры спадар Бог!
Бывай,
вялікі сьвет!..
Aber das ist eine
Schweinerei!"*

Чаму менавіта
ў гэтым фрагмэньце
прымроіўся
архітэктурны матыў,
а не парнаграфічная
фатакартка?
Ня ведаю.
Але я паверыў
у існасьць
сваёй імпрэсыяністычнай
рэакцыі.
Цалкам прыняў
за пастулят
тое, што творчасьць
Джойса й Гаўдзі
знаходзіцца ў рэчышчы
аднаго й таго ж стылю —
мадэрн,
сэцэсія,
югендштыль.

Пазьней я выкрыў
і агульны
кампазіцыйны ход
для Джойса й Гаўдзі,
я назваў яго...
цытаваньне.
Як Джойс
у адным абзацы
спалучае
асаблівую форму
Вішну-Крышны —
Джагернаўта зь
нямецкай лаянкаю,
так і Гаўдзі
ў вадным інтэр'еры
можа выкарыстаць вазу
эпохі клясіцызму
й гатычна-яркія вітражы.
А наогул,
я
не люблю
мадэрн.

* Дык гэта ж сьвінства! *Па-нямецку.*

Хто выгнаў Адама з раю?

Генэтыкі й лінгвісты знаходзяць усё больш доказаў таго, што прарадзіма сучаснага чалавека — зялёныя ўзгоркі Ўсходняй Афрыкі. Хто ж аднак прымусіў яго пакінуць гэты райскі закуток, дзе так шмат пракорму, сонца й зямлі?

Заоляг Юзаф Рэйнхольф зь Мюнхену адказаў так — цэ-цэ, гэтая малая мушка, якая на працягу тысячагодзьдзя трымала ў страху жыхароў Афрыкі.

Выкарыстоўваючы найноўшыя генэтычныя мэтады, навукоўцы падрыхтавалі «генэтычны пратакол» эвалюцыі чалавека, у якім мы знойдзем на дзіва цікавыя рэчы: біблійныя Адам і Ева былі цёмнаскурымі пігмэямі з племя Ака, якое жыло ў гарыстых ваколіцах сучаснай Кеніі й Танзаніі.

5 гадоў таму амэрыканскі навуковец Ален Ўілсан распачаў пошукі «прамаці Евы», выкарыстоўваючы ўвесь арсэнал сучаснай генэтыкі. Разам зь іншымі спэцыялістамі малекулярнай біялёгіі ён параўнаў гены людзей розных народаў з мэтай рэканструяваць этапы міграцыі прагістарычнага чалавека.

Генэтыкам дапамагаюць таксама лінгвісты. Па вывучэньні 5000 моваў яны ўстанавілі, што ўсе мовы маюць супольнае карэньне й супольную айчыну Афрыку. Гэтак лінгвісты пацьвердзілі тэорыю Ўілсана. Ўілсан разьлічыў, што ад малой калёніі пігмэяў Ака ў райскім закутку старой Афрыкі нас аддзяляе 12000 пакаленьняў.

Пігмэі племя Ака жылі ў саванах, харчаваліся дзікімі пладамі, елі таксама мяса, ня маючы недахопу дзічыны. Іх наскальныя малюнкі, якім 30.000 гадоў, прадстаўляюць той ідылічны час гісторыі чалавека, яго гармонію з атачэньнем.

І раптам — страшнае няшчасьце: захварэў адзін чалавек з племея, потым другі, трэці... Смутак, страта прытомнасьці, нарэшце сьмерць. Усё гэта пасткі "злых духаў", кажуць мудрацы племя. Што рабіць? Трэба ўцякаць з праклятае зямлі!

Сказана — зроблена. І распаўсюдзіўся род людзкі па ўсёй зямлі ў пошуках месцаў, куды не дастаюць чары злых духаў. Вельмі няхутка ўсьвядоміў чалавек сувязь паміж той страшнай хваробай і яе разносчыцай — мухай цэ-цэ.

Па прыбыцьці на новыя месцы людзі адаптаваліся да іншых умоваў, наступіла зьмена колеру скуры й рысаў твару. Так паступова зьявіліся расы й народы.

Тэорыю Ўілсана прымае шмат навукоўцаў. Уплыў мушкі цэ-цэ на жыцьцё тубыльцаў Афрыкі не выклікае сумліву. Цэ-цэ нашмат старэйшая за чалавека. Яна заўсёды жыла побач с парнакапытнымі сысунамі, зь якіх толькі зебра не баіцца яе. Навукоўцы доўга думалі, чаму? Аказалася, што гэта — ад палосаў на скуры жывёлы. Бо вока мушкі ня здольнае арыентавацца ў гэткім спалучэньні колераў і мушка не дасягае ахвяры. Пазбаўленая ахоўнага колеру, зебра бачная здалёк для усіх драпежнікаў, аднак недаступная для страшнае жамяры.

Такім чынам, зебра выйграла двубой з цэ-цэ, а чалавек прайграў і вымушаны быў уцякаць з сваёй прарадзімы. Магчыма, з карысьцю для сябе — цяжэйшыя ўмовы й зьмена асяродзьдзя прымусілі яго змабілізаваць свае здольнасьці й стаць тым, кім ён ёсьць сёньня.

(DPA)

Але хіба сьвету ня можа пагражаць вынішчэньне й безь якогась людзкога згубнага ўмяшаньня? Ці ж Зямля ня выстаўленая пад удары камэтаў і мэтэарытаў, якія маглі б неспадзявана зьнішчыць на ёй усё, што йснуе? Ці ж ня выстаўленыя мы на волю таямнічых і магутных касьмічных сілаў, перад якімі нам ня дадзена абараніцца? Ужо даказана, што 65 мільёнаў гадоў таму на нашай плянэце мела месца вялізная катастрофа, калі ў выніку сутыкненьня Зямлі з магутным мэтэарытам распачалося вялікае выміраньне дыназаўраў...

Апроч раптоўных, непрадказальных і зусім выпадковых зьяваў маюць месца здарэньні цыклічныя, паўтаральныя, якія нейкім чынам уплываюць на наша жыцьцё. Кожныя 11 гадоў, напрыклад, Сонца праходзіць максымум сваёй магнэтычнай актыўнасьці. Кожныя 76 гадоў зьяўляецца на небе найвялікшая зь вядомых нам камэтаў — камэта Галея. Кожныя 179 гадоў усе плянэты ў сваім руху вакол Сонца выстройваюцца як бы на адной лініі. Ці сілы ўзаемнага прыцягненьня, тыя, што выклікаюць з боку Месяца прылівы й адлівы, ня могуць якімсь няведамым яшчэ чынам паўплываць на наша зямное йснаваньне?

Пытаньняў такога кшталту вельмі шмат. Навука намагаецца на многія зь іх знайсьці адказы, але адназначных высноваў трэба часам чакаць вельмі доўга. Тыя, хто хацеў бы ведаць ужо цяпер, зьвяртаюцца да гіпотэзаў і прыблізных разьлікаў. Ніхто ня можа ручацца за іх адпаведнасьць рэчаіснасьці, але ніхто таксама не запярэчыць, што яны складаюць дасканалы пажытак для нашае цікаўнасьці і ўяўленьня.

Апошнім часам адна з такіх тэорый уваходзіць у "моду" ў некаторых краінах. Яна кажа , што ў гісторыі людзтва, незалежна ад прычыны таямнічае зьявы, можна адрозьніць тры цыклі актыўнасьці грамадзтваў, выкліканыя ўзьдзеяньнем космасу на Зямлю. Згодна з гэтым сьцьверджаньнем, мы мусілі б, напрыклад, падлягаць 12, 36 і 144-гадоваму рытму актыўнасьці сусьвету, вынікам чаго былі б на нашай плянэце чарговыя ўздымы й спады ўсеагульных катастрофаў, войнаў, рэвалюцый, грамадзкіх беспарадкаў, эпідэмій і г.д. Да асабліва цяжкіх наступстваў даходзіла б у часе найбольшага зблізкэньня названых трох цыкляў паміж сабою. Апошняя такая трыяда мела месца ў гісторыі ў 1570-1713, 1714-1857 і 1858-2001. Год 2001 выглядае ў гэтых разьліках найгорш, і факт яго неадваротнай блізкасьці пазначаюць назіраныя па ўсім сьвеце здарэньні: вайна ў Пэрсыдзкім заліве, распад СССР, зьмена палітычных сыстэм у краінах Усходняй і Цэнтральнай Эўропы, вайна ў Югаславіі, аб'яднаньне Нямеччыны, узьнікненьне новых глябальных сілаў і напяцьцяў, пагроза распаўсюджваньня атамнае зброі разам са стратай кантролю над ёй.

Ці трэба баяцца 2001 году? На тое кожны мусіць адказаць сабе сам. І перш, чым ён гэта зробіць, варта каб памятаў, што сярэднявечны маг і прарок Бэнгель датаваў час Апакаліпсісу на год 7777.

Express Wieczorny



ХТО МАЕ ПРАВА ВЫНОСІЦЬ СЬМЯРОТНЫ ПРЫСУД?

апытаньне Нашае Нівы

...Я меркаваў, што тое грамадзтва, у якім я жыву, грунтуецца на сьмяротных прысудах і, калі я змагаюся супраць яго, я змагаюся такім чынам з забойствам.

... Я, зразумела, ведаў, што час ад часу й мы таксама выносілі сьмяротныя прысуды. Але мяне запэўнівалі, што гэтыя некалькі сьмерцяў неабходныя, каб пабудаваць сьвет, дзе нікога ня будуць забіваць.

... Вы ніколі ня бачылі, як расстрэльваюць чалавека?

... Ведаеце, што калі асуджаны зробіць хоць крок, ён натыкнецца на рулі вінтовак? Ведаеце, што з гэтай максымальна кароткай адлегласьці страляюць у сэрца, а паколькі кулі вялікія, атрымліваецца дзірка, у якую можна прасунуць кулак? Не, нічога вы ня ведаеце, бо пра такія дэталі не прынята гаварыць.

... Ня варта псаваць сон сумленным людзям.

... Але з тых часоў я стаў дрэнна спаць.

Гэтак пісаў Альбэр Камю, які падсумаваў і акрэсьліў аргументы праціўнікаў сьмяротнае кары. Прыхільнікі скрайняе меры такога дасканалага тэарэтычнага забесьпячэньня не атрымалі. Праўда, нельга сьцьвярджаць, што гэта зьменшыла іхнюю колькасьць. Шматлікія апытаньні на тэму сьмяротнае кары ператварыліся ў своеасаблівую індыкацыю аўтарытэтаў і народу — ня так з мэтай высьветліць ісьціну, як дзеля выразных характарыстык грамадзкае думкі ды дзеячоў нацыі. Караць ці не караць — гэта ўсё адно вырашыць улада, людзі могуць толькі выказаць сваё асабістае стаўленьне, засьведчыць сваю лёгіку й свае маральныя прынцыпы.

АЛЕСЬ БЕЛАКОЗ, настаўнік, заснавальнік Гудзевіцкага Музэю:
— Сам бы не прысудзіў. А так — ня ведаю, бо жахлівыя злачынцы бываюць. Пажыцьцёвае зьняволеньне? Дык зьбягаюць, а потым зноў людзей рэжуць. Але сам бы не прысудзіў...

ЛЕРА СОМ з Полацку:
— Паколькі заўсёды йснуе пагроза памылкі (бо ісьціна вядомая толькі Богу), трэба адмяніць. Бо тады застанецца шанец выправіць тую памылку.

ВІНЦУК ВЯЧОРКА, сакратар Управы БНФ:
— Жыцьцё даецца Богам, і ня нам яго забіраць. Дый увогуле, трэба ж быць цывілізаванымі людзьмі й адмяніць гэты сьмяротны прысуд.

МІХАЛ АНЕМПАДЗІСТАЎ, мастак:
— Лічу, што экстраардынарныя пакараньні павінны йснаваць. А наконт пасьмяротнага зьняволеньня? Цяпер, у нашых умовах, я ня бачу асаблівае розьніцы, і яшчэ не вядома, што больш гуманнае.

АЛЕСЬ РАЗАНАЎ, паэт:
— Гэта філязофская праблема, і яна вырашаецца кожным чыста суб'ектыўна, у залежнасьці ад таго, як кожны вызначае для сябе: ёсьць Бог ці не, так — так, і — і, альбо — альбо. Карацей, адказы на гэтае пытаньне йснуюць даўно. А да якога я далучаюся? Вы лепш пазваніце мне на сьвітаньні, ведаеце, калі чалавек толькі прачнуўся й адразу выносіць свой прысуд: так альбо не.

ЯЎГЕН КУЛІК, мастак, адзін з аўтараў праекту герба Рэспублікі Беларусі:
— Я супраць сьмяротнага пакараньня, бо забіраць жыцьцё ў чалавека нікому ня дадзена.

АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ, сакратар Беларускае Каталіцкае Грамады:
— Я за тое, каб зьмяніць сьмяротную кару пажыцьцёвым зьняволеньнем. Мабыць, эканамічна гэта й даражэй, але псыхалягічна для самога грамадзтва лягчэй дыхаць будзе.

ЗЯНОН ПАЗЬНЯК:
— Я лічу, што цяпер у нашым грамадзтве немагчыма дасягнуць умоваў для адмены сьмяротнага пакараньня. Мы ня маем магчымасьці трымаць злачынцу ўсё жыцьцё, карміць яго, забясьпечваць яму ахову. Дый паглядзеце, нават царква ў свой час ня здолела гэтага пазьбегнуць. Проста бываюць такія людзі, якія сталі ўжо нелюдзямі, проста бесамі. Але вырашаць такое пытаньне трэба адмысловым судом прысяжных.

МІХАСЬ ТАЛОЧКА, журналіст:
— Выносіць сьмяротны прысуд — прывілей Бога, хаця...

ВІКТАР ЖУК, рэдактар беларуска-амэрыканскага часопіса «Дело»:
— Можна прывесьці прыклад ЗША, дзе ў адных штатах існуе сьмяротнае пакараньне, а ў іншых — адмененае. Дык вось статыстыка сьведчыць, што там, дзе такое пакараньне йснуе, злачыннасьць зусім ня меншая, а ў некаторых выпадках нават і большая. Бо калі забойца ведае, што яго могуць пасадзіць на электрычнае крэсла, ён забівае больш людзей, каб пазбавіцца сьведкаў. Таму я супраць такога пакараньня. Акрамя таго йснуюць і маральныя прычыны, што жыцьцё — ад Бога, і ня людзям яго забіраць. Тут можна прыгадаць прыпавесьць "Адкуль пайшло зло" Льва Талстога, калі адзін чалавек даў другому аплявуху, а той, замест таго, каб падставіць другую шчаку, адказаў тым самым. А потым знайшліся абаронцы і ў тога, і ў тога, ды і ў іх таксама. Так і пачалася першая вайна. Можа мы й не дарасьлі да таго, каб падставіць другую шчаку, але да гэтага трэба імкнуцца.

АЛЕНА КІСЯЛЕВІЧ, супрацоўніца Музэя Максіма Багдановіча:
— Жаўнер на вайне забівае, каб яго не забілі першага. Ён не злачынца, бо гэта самаабарона. А калі ўжо гаварыць пра Бога, дык ня трэба забывацца й на Д'ябла, бо ў жыцьці йдзе пастаянная барацьба паміж імі, паміж дабром і злом. І калі жыцьцё чалавеку дае Бог, дык забраць яго можа і Д'ябал. А таму трэба вельмі добра падумаць, на чый бок становімся мы, не пакараўшы сьмерцю якога жахлівага маньяка-забойцу.


ВІТАЛЬ СЯМАШКА, журналіст:
— Разумееш, я толькі што вярнуўся з камандыроўкі, літаральна дзесяць хвілінаў таму зайшоў у рэдакцыю. За апошні тыдзень я праехаў 1600 кілямэтраў па Гомельскай і Магілёўскай абласьцях. Паўсюль сустракаўся зь людзьмі, якія жывуць на забруджаных тэрыторыях, зь людзьмі, на якіх апошнім часам усе забыліся. Я бачыў тую злосьць, якая кіпіць у іх, тую касмаганічную нянавісьць людзей да бальшавіцкае ўлады. Так што, Алесь, прабач, я цяпер ня здолею адказаць на тваё пытаньне.

ТАМАРА БЕЛАВОКАЯ, старшыня Беларускага Камітэту «Дзеці Чарнобыля»:
— Я вельмі адмоўна стаўлюся да сьмяротных пакараньняў, бо калі чалавек стаў злачынцам, гэта яшчэ не дае падставы станавіцца злачынцамі нам. Няхай ён застанецца сам-насам і паспрабуе прааналізаваць сваё жыцьцё...

А яшчэ адзін вядомы на Беларусі чалавек — Х.Л.Борхес — раіць не абяцаць нікому нічога, бо гэта прывілей несьмяротнага Бога. Праўда, тут жа Борхес і абвяргае сам сябе, маўляў, можна й абяцаць, таму што праз гэта мы далучаемся да несьмяротнасьці. Так і тут. Адна справа разважаць пра скрайнюю меру, папіваючы каву, і зусім іншая — спытацца ў чалавека, у якога блізкі сваяк загінуў ад рукі пачварнага забойцы. Што мы пачуем у вадказ?

Давайце скажам так: усё залежыць ад пункту гледжаньня.

Алесь Ас.



Здымак Алены Адамчык.

Пачынаючы з гэтага паўгодзьдзя ў Рэспубліцы Беларусі Нашу Ніву можна выпісаць у кожным аддзяленьні сувязі.

Індэкс 63125

Гэты нумар Нашае Нівы выдадзены дзякуючы фундацыі БАДППР

Паштовая скрынка

Пакуль НН выходзіць непэрыядычна, зьмяшчаць апэратыўную інфармацыю мы ня можам. Спэцыфіка выданьня не дазваляе нам таксама друкаваць неарыгінальныя матэрыялы (копіі, другія асобнікі) без адмысловае дамоўленасьці з аўтарам.

Аляксею Ш. зь Менску. Уніяцкі каляндар (як і каталіцкі ці праваслаўны) шукайце ў спэцыялізаваных выданьнях, напрыклад, у часопісе "Унія"... Калі Вашага прадзеда ймя было Тамаш, дык Тумашом ці Хамашом яго ня зробіць ніхто, нават цэлая Акадэмія Навук... Мы ніколі ня пішам "Бярэсьце" ці "Гародня", бо гэта ўсё адно спольшчаныя варыянты назваў. А вось "у Слуцаку-Полацаку" мы пісаць і ня будзем. Пры зьбегу зычных у беларускай мове гучыць беглы галосны, які ва ўскосных склонах зьнікае (парадак — парадку, Мікіта Зносак — Мікіту Зноску, замак — замку і г.д.). Бясплатна камэрцыйныя аб'явы й рэкляму *НН* друкавала толькі ў першых нумарох.

Віталю К. зь Менску. Наконт Вашых правапісных ідэяў — наш праўшчык узяўся адказаць Вам лістоўна. Што да "размовы ў чарзе", дык яна даўнавата ўжо адбылася, і замест тых фактаў і прозьвішчаў цяпер іншыя на слыху. Верш, наадварот, прывабіў датай, калі ён напісаны. Бадай, цікава было б узнавіць тую сытуацыю зімы 1967 году, тагачаснае пачуваньне аўтара. Толькі тады верш можа быць зразуметы, як твор сынкрэтычны, як спалучэньне слова зь візуальнымі выяўленчымі сродкамі — адмысловай готыкай і г.д.

Падпіска

У межах Рэспублікі Беларусі *Нашу Ніву* можна выпісаць у любым аддзяленьні сувязі. Падпісны індэкс: **63125**.

Каб выпісаць *НН* ў якую іншую краіну, перашліце адвольную суму грошай на адрас: **2051, Вільня, а/с 2425, Кардзіс Людвіка.**

У Польшчы грошы можна пералічыць на конта **5526-80725-136 II PKO Białystok, Czasopis — dla Našaj Nivy.**

У Амэрыцы падпіску зьбіраюць на адрас: **Mr. S.Karniłovič. Belarusian-American Community Center "Połacak", 11022 Webster Road, Strongsville, OH 44130, U.S.A.**

НАША НІВА. NAŠA NIVA. *Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991.* **Рэдакцыйная Рада. Заснавальнік Павал Жук. Выдавец: Беларускі гуманітарны адукацыйна культурны цэнтар.** *Адрас для допісаў:* **2041, Вільня, а/с 2082, НашаНіва.** *Адрас для грашовых пераказаў:* **2051, Вільня, а/с 2425, Кардзіс Людвіка.** *Фін. адрас:* UAB «Naša Niva». Афсэтны друк. Менская паліграфічная фабрыка «Чырвоная Зорка». Замова 2757. Наклад 5000.